СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА III КВАРТАЛ І II ПАЎГОДДЗЕ 2010 г.

Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	месяц	III квартал	паўгоддзе
63850 (індывідуальны)	12400	37200	74400
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	11600	34800	69600
63858 (ведамасны)	19900	59700	119400
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	18000	54000	108000

Заставайцеся з намі!

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

10 ЧЭРВЕНЯ 2010 г.
ЧАЦВЕР
№ 111
(26719)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Грошы

СКВ ЗДАЕ ПАЗІЦЫІ Ў ДЭПАЗІТАХ

Сезон адпачынкаў і высокая прыбытковасць рублёвых укладаў «выкошвае» са зберажэнняў беларусаў замежную валюту...

Паступовае зніжэнне даходнасці як па валютных, так і па дэпазітах у беларускіх рублях, зразумела, не вельмі надае аптымізму людзям, што трымаюць свае зберажэнні ў банках. Разам з тым, найбольшы прыбытак, як і раней, даюць дэпазіты ў беларускіх рублях. Гэта, паводле слоў намесніка начальніка Упраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі Міхаіла ЖУРАВОВІЧА, і вызначае цяперашнія тэндэнцыі на дэпазітным рынку: уклады ў замежнай валюце змяншаюцца, таму што часткова «перацякаюць» у дэпазіты ў нацыянальнай валюце, а па рублёвых ідзе стабільны прырост.

Акрамя таго, істотны адток сродкаў з валютных дэпазітаў супаў з адкрыццём сезона адпачынкаў. Паводле звестак нашага суразмоўцы, менавіта ў маі назіралася найбольшае «вымыванне» ўкладаў у замежнай валюце: за згаданы месяц яны зменшыліся на 74,8 мільёна долараў, ці на 2,1 працэнта. Між іншым, з пачатку года іх змяншэнне склала 81,5 мільёна долараў, ці 2,3 працэнта. Тым не менш пакуль на валютных дэпазітах насельніцтва трымае крыху больш за палову сваіх зберажэнняў — 3,46 мільярда долараў ЗША. Аднак нельга не заўважыць таго, што за апошнія тры месяцы доля рублёвых дэпазітаў у агульным аб'ёме ўкладаў павялічылася амаль на працэнт. Прычыны гэтага навідавоку: дастаткова супаставіць працэнтныя стаўкі, што прапануюцца банкамі. Нягледзячы на тое, што даходнасць сродкаў, размешчаных на дэпазітах як на кароткі, так і на доўгі тэрмін, зніжаецца, па рублёвых можна знайсці прапановы вышэй за 20 працэнтаў гадавых — аж да 23 працэнтаў. Нашмат больш сціплыя стаўкі па валютных зберажэннях, найвышэйшы паказчык для якіх — у выключных выпадках 10, а ў большасці — ад 7 да 8 працэнтаў гадавых. Такая прывабнасць рублёвых «гуляе» злы жарт з валютнымі ўкладамі.

> **Людзі лічыць умеюць і бачаць, што да канца года дэвальвацыі не будзе, значыць, да канца года грошы можна трымаць у беларускіх рублях.**

Нельга не згадаць і пра тое, што на прыярытэтах беларусаў адбіваюцца і сёлетнія падзеі на валютным рынку, дзе назіраецца істотнае зніжэнне курсу еўра. Назапашаныя людзьмі сродкі ў, падавалася б, перспектыўнай валюце летась, таннеюць на вачах. І не ва ўсіх хапае нерваў цярпліва сачыць за цяперашнімі праблемамі еўрапейскай валюты: нехта мяняе яе ў сваіх зберажэннях на мацнеючы долар, а іншыя — на рублі, прычым, як беларускія, так і расійскія, якія па прыбытковасці ў зберажэннях пакуль знаходзяцца ў лідарах. Як зазначае эксперт «Звязды», **дэкан эканамічнага факультэта БДУ, прафесар Міхаіл КАВАЛЁЎ**, людзі лічыць умеюць і бачаць, што да канца года дэвальвацыі рубля не будзе, значыць, да канца года грошы можна трымаць ва ўкладах у нацыянальнай валюце. Тым больш, дадае ён, што народ не ведае, што лепш цяпер трымаць у зберажэннях — еўра ці долар.

> **Крызіс навучыў наша насельніцтва больш зберагаць і менш браць у доўг.**

Магчыма, што таннеючы еўра мае таксама дачыненне і да кардынальнай змены ў гэтым годзе сітуацыі па куплі-продажы насельніцтвам цвёрдаканверсоўнай у пунктах абмену валюты. Тэндэнцыі ж тут пануюць наступныя — насельніцтва прадае больш валюты, чым купляе. І гэта, дарэчы, істотнае адрозненне ад леташняй сітуацыі, калі з боку беларусаў ішоў значны ціск на нацыянальную валюту. Зараз жа, калі прыходзіцца выбіраць паміж беларускім рублём (ён адчувае сябе стабільна, а па выніках года можа, паводле запэўніванняў кіраўніцтва Нацбанка, нават умацавацца да кошыка валют, і які прыносіць большы даход на ўкладах) і непрадказальнымі хістаннямі курсаў долара і еўра, — перавага на баку першага. **У выніку, паводле апошніх звестак галоўнага банка краіны, толькі на пачатку гэтага месяца, а менавіта за 6 дзён, беларусы прадалі ў эквіваленце на 3,2 мільёна долараў больш, чым купілі.** У мінулым месяцы чысты продаж наяўнай валюты фізічнымі асобамі дасягнуў амаль 30 мільёнаў долараў, а за пяць месяцаў гэтага года лічба склала 177,5 мільёна долараў.

> **У цэлым Нацыянальнаму банку неабходна распрацаваць праграму па змяненні мадэлі паводзінаў насельніцтва: у рынкавых умовах яно павінна зберагаць больш, людзі хочуць не толькі несці грошы ў дэпазіты, але і купляць акцыі, яшчэ ў што-небудзь укладваць.**

Цяперашні выбар на карысць укладаў у нацыянальнай валюце за мінулыя пяць месяцаў дадаў у банкаўскія рублёвыя зберажэнні насельніцтва 1,65 трыльёна рублёў, ці 20,6 працэнта. Такім чынам, на пачатак чэрвеня людзі трымалі ў рублях на ўкладах ужо больш як 9,6 трыльёна рублёў. Дарэчы, за мінулы месяц рублёвыя дэпазіты павялічыліся больш як на 383 мільярды рублёў, ці на 4,1 працэнта. Згодна з апошняй статыстыкай Нацбанка, за студзень-май дэпазіты ў замежнай валюце і рублях павялічыліся амаль на 1,9 трыльёна рублёў, ці на 10,4 працэнта, і ў мінулым месяцы ўклады грамадзян упершыню перавысілі мяжу ў 20 трыльёнаў рублёў.

Мы пацікавіліся ў галоўным банку, колькі ў разліку на аднаго жыхара краіны прыпадае зберажэнняў, якія размешчаныя ў дэпазітах і сертыфікатах. Высветлілася, што на 1 чэрвеня гэтая лічба складала 2 мільёны 214 тысяч 700 рублёў (у эквіваленце 738,7 долара ЗША). На пачатак года яна раўнялася 1 мільёну 939 тысячам 500 рублям (677,4 долара), гэта значыць, за пяць месяцаў зберажэнні ў разліку на аднаго жыхара папоўніліся 275 200 рублямі.

— Сярэдняя зарплата цяпер складае прыкладна 1 мільён 100 тысяч рублёў, і атрымліваецца, што беларусы сталі трымаць у банкаўскіх зберажэннях каля дзвюх месячных зарплат, — каментуе апошнія лічбы Міхаіл Кавалёў. — Па сусветных мерках гэта ўсё адно крайне мала. Кітайцы зберагаюць амаль гадавую зарплату, расіяне цяпер зберагаюць крыху больш за тры месячныя зарплаты. Але з пункту гледжання эканамічнай тэорыі, больш важна — чыстыя зберажэнні, гэта значыць, трэба параўноўваць тэмп прыросту ўкладаў і тэмп прыросту крэдытаў насельніцтва. Важна, каб так званыя чыстыя зберажэнні, гэта значыць, зберажэнні насельніцтва мінус крэдыты насельніцтву, каб гэтая велічыня была станоўчай. Тады гэтыя грошы можна выкарыстоўваць фірмам для інвестыцый. Пасля 2008 года, калі ў нас была адмоўная норма зберажэнняў, ёсць станоўчыя тэндэнцыі: усё ж такі крызіс навучыў наша насельніцтва крыху больш зберагаць і менш браць у доўг. І таму норма зберажэнняў хоць і застаецца па-ранейшаму вельмі маленькай, але пакрысе расце. **Мне падаецца, што ў цэлым Нацыянальнаму банку неабходна распрацаваць праграму па змяненні мадэлі паводзінаў насельніцтва: у рынкавых умовах яно павінна зберагаць больш, людзі хочуць не толькі несці грошы ў дэпазіты, але і купляць акцыі, яшчэ ў што-небудзь укладваць. Гэтых інструментаў мы пакуль беларусам не даём, таму людзі так мала адкладваюць сродкаў, таму ўвечары у рэстаран цяжка трапіць.**

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.06.2010 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	3 018,00
▲ 1 еўра	3 613,15
1 латвійскі лат	5 094,53
1 літоўскі літ	1 044,65
1 чэшская крона	139,09
1 польскі злоты	875,51
▼ 1 расійскі рубель	95,11
1 украінская грыўня	381,06

Агенцтва Уладзіміра Грачова

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	31,7302
10 UAH	40,0659
1000 BYR	10,5206
EUR	37,9430

ISSN 1990 - 763X

МІНСКІЯ РУСАЛКІ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У ПЯТНІЦУ І СУБОТУ — ДА ПЛЮС 35!

Мінулы май для большасці краін Заходняй Еўропы быў самы халодны за апошнія 50 гадоў. У Беларусі сярэднясутачная тэмпература гэтага месяца была больш за сінаптычную норму прыкладна на 1—4 градусы. Потым на Еўропу рынулася «хваля» магутных дажджоў, а цяпер да нас пачынае рухацца гарачыня з боку Афрыкі...

Паводле інфармацыі **начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Дзмітрыя РАБАВА**, ужо сёння да нас завітала даволі цёплае паветра з поўдня Еўропы. Тэмпература паветра ўдзень чакаецца ў межах 24—27 градусаў, на поўдні краіны — да 30—32. У Мінску будзе 27—29, а на поўначы Віцебскай вобласці — толькі 18—23. На паўночным захадзе краіны невялікія дажджы, месцамі навальніцы.

Выпрабаванне спёкай пачнецца ў пятніцу-суботу, калі на тэрыторыю Беларусі пачне паступаць гарачае трапічнае паветра з боку поўначы Афрыкі. Умовы надвор'я будуць нагадваць сапраўдную парылку, бо нават уначы будзе 16—23 градусы, удзень 27—32, а на паўднёвым усходзе — ажно да плюс 35! У пятніцу невялікія кароткачасовыя дажджы чакаюцца на поўначы, а ў суботу — на паўночным захадзе краіны.

Сіноптыкі прагназуюць, што ў нядзелю да нас з боку Заходняй Еўропы падыдзе атмасферны фронт, услед за якім у Беларусь завітае больш свежае паветра. Удзень чакаецца ўжо ў межах 19—26. Уначы яшчэ будзе даволі цёпла — да 17—24. Атмасферны фронт у нядзелю прыняпсе дажджы і навальніцы на ўсю тэрыторыю краіны. У асобных раёнах будуць моцныя ліўні, пры навальніцах парывісты вецер.

У пачатку наступнага тыдня свежае надвор'е распаўсюдзіцца ўжо на ўсю тэрыторыю краіны. Днём — 16—23. Дзмітрый Рабаў адзначыў, што асобныя сусветныя эксперты прагназуюць сёлета Еўропе самае спякотнае лета за апошнія 150 гадоў.

Беларускі прагноз на чэрвень запланаваў сярэднямесячную тэмпературу, на адзін градус вышэйшую за норму. Звычайна самым спякотным у нас бывае ліпень. Згодна з папярэднімі прагнозамі, тэмпературны фон другога месяца лета стане на 1—2 градусы вышэйшым за норму, якая складае 17—19 градусаў. Што датычыцца трапічнай спякоты ў пятніцу і суботу, то ў гэтыя дні сіноптыкі чакаюць абнаўлення тэмпературных рэкордаў, бо прагназаваная тэмпература будзе прыкладна на 8—13 градусаў вышэйшай за норму.

Анамальныя сінаптычныя з'явы гэтымі днямі «нарадзілі» моцную паводку ў асобных краінах Еўропы. Беларусь падобная «навала» пакуль абыходзіць бокам. На рэках склалася спакойнае гідралагічнае становішча. Не прагназуецца ў гэты час і засухі. Пасля 3 дзён спякоты — абавязкова некалькі дзён дажджоў. Падобныя чаргаванні розных умоў надвор'я будуць у чэрвені не рэдкасцю, лічаць у Белгідраметцэнтры.

Сяргей КУРКАЧ.

Агонь толькі ў мангале!

У гарадскіх і прыгарадных лясах нельга раскладваць вогнішчы, але можна карыстацца мангаламі.

Як паведаміў **начальнік службы аховы дзяржлясфонду УП «Мінская лесапаркавая гаспадарка» Канстанцін ПУЗЫНА**, распальваць вогнішчы ў месцах, не прызначаных для гэтага, забаронена.

Згодна з артыкулам 15.29 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, парушэнне патрабаванняў пажарнай бяспекі ў лясах або на тарфяніках альбо забароны на іх наведванне, якое не пацягнула нанясенне ўрону, цягне папярэджанне або накладанне штрафу ў памеры да дваццаці пяці базавых велічыняў. А калі гэта выпадкова прывяло да пажару (у дзеяннях вінаватых не было складу злачынства) — прадугледжаны штраф у памеры ад 25 да 50 базавых велічыняў.

Разам з тым, скарыстацца мангалам або жароўняй для прыгатавання шашлыку можна ў любым месцы пры ўмове, што агонь не будзе дакранацца да жывога надглебавага покрыва і лясной падсцілкі, адзначыў спецыяліст.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Аляксандр ФІЛІПОВІЧ,
«Мінск—Навіны».

Прамая лінія

ДАПАМОГА: КАМУ ШТО?

Падтрымка ветэранаў і інвалідаў, адрасная сацыяльная дапамога, сацыяльнае абслугоўванне на даму і магчымасць атрымання іншых сацыяльных паслуг — усё гэта стане тэмай «прамой лініі» нашай газеты з удзелам **начальніка ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Івана Пятровіча НАГІБІНА**.

Такім чынам, увага! Паводле папярэдняй дамоўленасці, наша «прамая лінія» пройдзе 15 чэрвеня з 11 да 12 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах (8-017) 292 38 21 ці 292 38 92. Нумар для папярэдніх пытанняў — 287 17 57.

Прамая лінія

ЭНДАКРЫННАЯ СІСТЭМА

Дыягностыка і лячэнне цукровага дыябету 1-га і 2-га тыпаў, захворванняў шчытападобнай залозы, прафілактыка эндакрыннай паталогіі будуць у цэнтры ўвагі «прамой лініі» з удзелам **загадчыцы эндакрыналагічнага аддзялення Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Алены Іванаўны КУЗЬМЯНКОВАЙ**. Задаць пытанні спецыялісту можна **18 чэрвеня, у пятніцу, з 14.00** да 15.30 па рэдакцыйных нумарах: 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумарах: 8 (017) 287 18 36 і 287 18 29.

Завочная «прамая лінія»

ХІРУРГІЯ ТВАРУ

На пытанні, звязаныя з пашкоджаннем мяккіх тканак і касцей твару, рэканструктыўна-пластычнай хірургіяй твару, паталогіямі сківічна-тварнай вобласці (прыдатачных пазух носа (гаймарыты), слінных залоз, нерваў, скроневага ніжнесківічнага сустава, дабраякасных пухлін і пухлінападобных захворванняў) гатовы адказаць **дэкан стаматалагічнага факультэта, прафесар кафедры сківічна-тварнай хірургіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, доктар медыцынскіх навук Аляксандр Сяргеевіч ЛАСТАЎКА**.

Пакідайце, калі ласка, пытанні **да 25 чэрвеня** па рэдакцыйным нумары: 8 (017) 287 18 29. Адказы будуць надрукаваныя на старонках нашага выдання.

Анатоль РУБІНАЎ:

Прыёмная кампанія-2010

«ПРАЦЭС ПРЫЁМУ Ў ВНУ ЦАЛКАМ АБАРОНЕНЫ АД КАРУПЦЫЙНЫХ З'ЯЎ...»

14 чэрвеня ў краіне распачнецца цэнтралізаванае тэсціраванне. А ўчора ў Камітэце дзяржаўнага кантролю адбылося пасяджэнне Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзенням уступных іспытаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах. У склад камісіі ўваходзяць чыноўнікі самага высокага рангу: прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, памочнікі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутаты, адказныя работнікі Адміністрацыі Прэзідэнта, Савета Міністраў, Камітэта дзяржаўнага кантролю, намеснікі старшыняў абласных і Мінскага гарадскога выканкамаў. Узначальвае камісію старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Анатоль Рубінаў. Пра тое, якое значэнне надаецца рабоце дзяржаўнай камісіі, сведчыць той факт, што склад і паўнамоцтвы членаў дзяржаўнай камісіі зацвярджаюцца штогод указам кіраўніка нашай дзяржавы. Дарэчы, усе прапановы дзяржаўнай камісіі па ўдасканаленні парадку прыёму ў ВНУ і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, сфармуляваныя па выніках яе работы ў 2009 годзе, былі ўхвалены Прэзідэнтам і знайшлі адлюстраванне ў нарматыўных актах, што карэктуюць парадак прыёму.

— Прыёмная кампанія — гэта заўсёды адказная падзея для ўсёй краіны, паколькі яна закранае інтарэсы вельмі многіх: абітурыентаў, іх бацькоў, сваякоў, школьных настаўнікаў і тых падлеткаў, якія яшчэ толькі рыхтуюцца да паступлення ў найбліжэйшыя гады. Таму наша задача — зрабіць усё для таго, каб яна прайшла на высокім арганізацыйным узроўні, — падкрэсліў ў сваім выступленні **старшыня дзяржаўнай камісіі Анатоль РУБІНАЎ**. — З аднаго боку, мы павінны забяспечыць якасны набор, каб ва ўсе навучальныя ўстановы прыйшлі самыя здольныя і добра падрыхтаваныя маладыя людзі, а з іншага — захаваць прынцып сацыяльнай справядлівасці: у абітурыентаў, якія не прайшлі па конкурсе, не павінна быць і цені сумнення ў тым, што канкурэнцыя была сумленная і аб'ектыўная. Механізм фарміравання студэнцкай аўдыторыі ўжо можна лічыць канчаткова завершаным, ён можа толькі нязначна карэктавацца ўнутры навучальных устаноў з улікам спецыфікі іх профілю. Хачу запэўніць, што працэс прыёму ў ВНУ і ССНУ, дзякуючы ўкараненню цэнтралізаванага тэсціравання, сёння цалкам абаронены ад карупцыйных з'яў і суб'ектывізму, што аздаравіла становішча і ў школах, і ў ВНУ, і ўвогуле ў грамадстве. У працэс адбору прэтэндэнтаў на студэнцкі білет нават пры вялікім жаданні ніхто не можа ўмяшацца: ні старшыня дзяржаўнай камісіі, ні міністр, ні рэктар і ніхто іншы.

— Вынікі ўступных кампаній папярэдніх чатырох гадоў пацвердзілі поўную абгрунтаванасць дзейных правілаў прыёму, зацверджаных кіраўніком дзяржавы, — дадаў **міністр адукацыі нашай краіны Аляксандр РАДЗЬКОЎ**. — Новы падыход да арганізацыі ўступнай кампаніі стварыў умовы для канкурэнцыі паміж сталічнымі і рэгіянальнымі, дзяржаўнымі і прыватнымі ўстановамі адукацыі. За кошт шматэтапнага характару ўступнай кампаніі былі пашыраны магчымасці паступлення на бюджэтную і платную форму навучання ў ВНУ. Тэрміны прыёму на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі дазваляюць абітурыентам, якія не прайшлі па конкурсе ў ВНУ, удзельнічаць ва ўступных іспытах і конкурсным адборы ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Шырокае ўкараненне цэнтралізаванага тэсціравання, адкрытасць і даступнасць інфармацыі аб конкурснай сітуацыі і прахадным балле, стварылі ўмовы для свабоднага ўсвядомленага выбару абітурыентамі будучай спецыяльнасці і формы атрымання адукацыі.

СТАР. 2

Блізкая ўлада

ДА ВАС ПРЫЕХАЎ МІНІСТР

ПАРВАЦЦА на прыём да міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь Віктара Галаванава — зусім няпростая задача. Нават калі ты прыйшоў не са скаргай, а толькі каб напісаць пра папярэднія вынікі работы міжведамаснай рабочай групы, якая завяршыла першы этап дзейнасці на Гомельшчыне. Людзі кідаюцца са сваімі скаргамі да кожнага, хто, на іх погляд, здольны выслухаць тыя праблемы, якія іх хвалююць. Гэта з пункту гледжання справаздачнасці большая частка скаргаў датычыцца ЖКГ і добраўпарадкавання. З пункту гледжання асобнага чалавека — ЯГО скарга самая важная і патрабуе неадкладнага вырашэння ЯГО праблемы. Тут і тыя, хто мае па некалькі кілаграмаў (гэта не мастацкае перабольшванне) папер, і тыя, хто прыйшоў без іх увогуле — проста таму, што выпадкова даведаўся: прымае кіраўнік міжведамаснай рабочай групы па Гомельскай вобласці.

Спецыялісты Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Беларусі правяралі работу са зваротамі грамадзян у Гомельскім аблвыканкаме. Іншыя члены гэтай жа групы адначасова працавалі са скаргамі ў асобных галінах — ЖКГ, архітэктуры і будаўніцтве. Асобна былі праверены гарады Мазыр, Светлагорск і Гомельскі райвыканкам. Гамяльчанка, 82-гадовая Марыя Ільінічна Журкова, разам з мужам, ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, прыйшлі на прыём са стосам паперак — адказаў на скаргу пра тое, чаму другі год вада з Іпуці залівае іх агароды па вуліцы Пугачова:

— І зараз залітыя агароды. Нельга нічога пасадзіць, ураджай гіне. Гінуць нават дрэвы — такое пераўзвітатненне глебы.

Разабрацца са справамі ЖКГ дапамагаюць спецыялісты мясцовых уладаў, якія прысутнічаюць на прыёме разам з міністрам. Віктар Галаванаў падымае іх, як школьнікаў на ўроку — трымаць адказ. Ён жа адзначае, што на прыёме прысутнічаюць прадстаўнікі ўсіх галін, не толькі ЖКГ, але і праваахоўных органаў, юстыцыі, іншыя адказныя асобы.

— Гэта дапамагае адразу вырашаць многія пытанні, — кажа міністр. — У людзей, якія прыходзяць са скаргамі, няма антаганізму да мясцовых уладаў — яны разумеюць, што многае робіцца, але патрабуецца час, каб іх пытанне вырашыць. Разам з тым, хачу адзначыць, што ёсць непаваротлівасць у дзеяннях асобных дзяржаўных органаў і арганізацый. Так, напрыклад, у Светлагорску сістэма рэгістрацыі зямельных участкаў працуе, на наш погляд, дрэнна. Спецыялісты недакладна кансультавалі людзей. У выніку яны вымушаныя былі па другім-трэцім разе прыходзіць у тую ж арганізацыю. Але ж многія пытанні не вырашаюцца ў сістэме жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў асноўным таму, што недастатковае фінансаванне. Напрыклад, у Мазыры больш за 250 дамам патрабуецца капітальны рамонт, а зрабілі толькі 13. Таму, што нехапае фінансавання.

На прыёме Анатоль Сусла. Ён расказвае, што яго брат загінуў на будоўлі:

— Мой брат атрымаў траўмы, несумяшчальныя з жыццём. У яго былі знойдзены цяжкія цялесныя пашкоджанні: разрыў ныркі, паламаныя рабрыны і гэтак далей. Мы напісалі скаргі ў дэпартамент па працы і ў пракуратуру Цэнтральнага раёна. Нам адказалі: «Упаў на роўным месцы, таму што яму стала дрэнна». Як такое можа быць? А ў яго два сыны засталіся без дапамогі.

Адказ міністра катэгарычны: «Мы прапануем Генеральнай пракуратуры ўзяць на кантроль расследаванне гэтага выпадку — гібелі вашага брата на вытворчасці». Але ж звычайна скаргі можна вырашаць і без дапамогі міністра. Віктар Рыгоравіч расказвае, што ў Светлагорску на прыём прыходзілі грамадзяне, у якіх мясцовыя службы ЖКГ не могуць замазаць стыкі паміж плітамі ў шматкватэрным доме:

— Спачатку спецыялісты ЖКГ ім адказалі, што зробім, калі высахнуць сцены. Праз паўгода паабяцалі, што зробяць да 1 красавіка. Зноў ставіцца пытанне на кантроль — і не вырашаецца. Чалавек гадамі ходзіць з-за дробязнага пытання. Ці яшчэ прыклад: дрэва старое трэба спілаваць, бо яно стварае небяспеку — побач дзіцячая пляцоўка. Жанчына неаднаразова прасіла мясцовыя органы ўлады гэта зрабіць. Дрэва стаіць да гэтага часу. Калі спілуюць, пытаю. Адказваюць: заўтра. Атрымліваецца, трэба было прадстаўнікам з Мінска прыехаць, каб гэтае пытанне вырашыць?

Віктар Галаванаў падкрэслівае, што сёння патрабуе ўдасканалення работа па растлумачванні дзейнага заканадаўства ўсімі адказнымі асобамі:

— Дадуць адказ занадта лаканічны — а чалавеку не заўсёды зразумела, што рабіць далей. Адкрылі мы для сябе і шэраг пытанняў па ўдасканаленні прававых нормаў у асобных галінах.

Трэба сказаць, што мясцовыя ўлады чакае другі этап праверак міжведамаснымі рабочымі групамі з Мінска. Ён пройдзе з 6 па 9 ліпеня. У якіх раёнах Гомельшчыны адбудуцца наступныя праверкі — пакуль трымаецца ў тайне.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.

ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУП «ТОРГОВЫЙ КОМПЛЕКС «АЭРОДРОМНЫЙ»

Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-25519 (назначение — здание специализированное иного назначения, наименование — павильон по продаже продовольственных товаров), общей площадью 7 691 кв. м, 2004 года постройки, стоимостью — 38 627 377 200 (тридцать восемь миллиардов шестьсот двадцать семь миллионов триста семьдесят семь тысяч) белорусских рублей, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 38, к. 3. Стоимость указана с учетом НДС.

Торги состоятся 30.06.2010 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201.

За дополнительной информацией обращаться: судебный исполнитель Тарашкевич А.С., тел./факс: 294 93 56, 80291773252
ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел. 294 93 67.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет хозяйственного суда города Минска № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код 795, УНП 101541763 не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

Минимальная величина первого шага составляет 5 % стоимости имущества в размере 1 931 368 860 белорусских рублей.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

НІ ВЫПІЦЬ, НІ ПАМАЛІЦЦА

66-гадовы брастаўчанін запрасіў да сябе выпіць чалавека нявызначанага месцажыхарства, што, як вядома, не забараняецца. А пасля таго, як госць сышоў, гаспадар убачыў, што прапала яго сямейная каштоўнасць — абраз XVIII стагоддзя. Ён адразу звярнуўся ў міліцыю. Грамадзяніна свету затрымалі, а дзе абраз, ацэнены ў 6 млн рублёў, пакуль невядома.

НЕ РУШ ЧУЖЫХ ГРУШ

У траіх непрацуючых грамадзян Расіі, якія адпачываюць у санаторыі «Буг», што размешчаны ў маляўнічай мясціне Жабінкаўскага раёна, з балкона нумара прапалі кашуля, майка і ніжняя бялізна. Жабінкаўскія аператыўнікі спрацавалі хутка і прапажу знайшлі. Знайшлі і зладзюжак: імі аказаліся 17-гадовыя вучні, адзін жыхар вёскі Панцюхі, другі — брастаўчанін. Паквапіліся на чужыя адзежыны і зарабілі як мінімум пастаноўку на ўлік, а можа, і судзімасць. Заведзена крымінальная справа.

Яна СВЕТАВА.

Віншаванне Прэзідэнта

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з 80-годдзем народнага мастака СССР Ілью Глазунова.

«Вы зрабілі вялікі ўнёсак у сусветную культуру як адзін з найвялікшых мастакоў сучаснасці, які адыграў значную ролю ў захаванні, абагачэнні і творчым развіцці традыцый рэалістычнага мастацтва. Вашы творы скараюць заключанай у іх маральнай сілай, любоўю да Айчыны, гуманістычным патэнцыялам і майстэрствам. Яны абагацілі скарбніцу славянскай духоўнасці», — гаворыцца ў прэзідэнцкім віншаванні.

Кіраўнік дзяржавы пажадаў юбіляру, каб яго шматгранная дзейнасць і надалей служыла справе ўмацавання сяброўства і супрацоўніцтва паміж народамі Беларусі і Расіі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ЖУРНАЛІСТЫКА — ГЭТА МАЙСТЭРСТВА КАМПРАМІСУ

Такую думку выказаў у гутарцы з журналістамі прэзідэнт Міжнароднай акадэміі тэлебачання і радыё Анатоль Лысенка пасля адкрыцця «Летняй школы журналістыкі» ў рамках Беларускага міжнароднага медыяфоруму, перадае БЕЛТА.

«Цалкам незалежных СМІ няма. Галоўнае ў гэтай залежнасці не страціць сваё «я», а таксама не забыць пра прыстойнасць», — лічыць знакаміты журналіст.

«Журналістыка ў сучасным свеце — майстэрства кампрамісу, і юныя журналісты павінны вучыцца не толькі прыгожа і якасна пісаць, здымаць, запісваць, але, і гэта самае галоўнае, яны павінны ўмець разумець тэму, суразмоўцу», — адзначыў Анатоль Лысенка. Якасная журналістыка — гэта калі інфармацыю правяраюць некалькі разоў, перш чым яе агучваць.

Анатоль Лысенка таксама адзначыў, што работа ў «Летняй школе журналістыкі» будзе цікавая не толькі будучым журналістам, але і тым, хто працуе ўжо ў СМІ. Пры гэтым ён адзначыў, што вучыцца журналістыцы — задача вельмі складаная, бо гэту прафесію можна спасцігнуць толькі ў працэсе работы і жыцця. «Толькі падчас правядзення інтэрв'ю можна навучыцца прыёмам і атрымаць журналісцкі вопыт, можна пераняць прыёмы калег і нават, калі хочаце, штампы», — падкрэсліў суразмоўца.

ДВА ТАНКЕРЫ З НАФТАЙ БУДУЦЬ АДПРАЎЛЕНЫ Ў БЕЛАРУСЬ З ВЕНЕСУЭЛЫ ДА КАНЦА ЧЭРВЕНЯ

Пра гэта паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў ЗАТ «Беларуская нафтавая кампанія».

Умяшчальнасць кожнага танкера складзе каля 80 тыс. тон. У БНК нагадалі, што 31 мая з Венесуэлы адправіўся другі танкер з нафтай для Беларусі таксама ўмяшчальнасцю каля 80 тыс. тон. Яго прыбыццё ў порт Адэсы чакаецца прыкладна 20 чэрвеня. На Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод нафта паступіць да 15 ліпеня.

Нішто сабе падрыхтаваліся

На вадаёме Падгорнае Стаўбцоўскага раёна дзяржінспектары затрымалі двух грамадзян, якія падчас забароны на лоўлю вузкапалых ракаў вялі іх здабычу з дапамогай ластаў і масак для падводнага плавання.

Пры затрыманні парушальнікі спрабавалі з'ехаць на аўтамабілі, аднак былі перахопленыя рэйдавай групай Стаўбцоўскай міжрайінспекцыі. У браканьераў канфіскавана 69 асобін вузкапалага рака, а таксама чатыры касцюмы для падводнага плавання і адзін аквалангі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«ПРАЦЭС ПРЫЁМУ Ў ВНУ ЦАЛКАМ АБАРОНЕНЫ АД КАРУПЦЫЙНЫХ З'ЯЎ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аляксандр Радзькоў паведаміў, што сёлета была падоўжана работа па павышэнні якасці тэставых заданняў, што выкарыстоўваюцца пры правядзенні ўступных іспытаў. У аўтарскія калектывы былі ўключаны высокакваліфікаваныя настаўнікі школ з вышэйшай і першай катэгорыяй, педагогі-практыкі і аўтары вучэбных дапаможнікаў. Экспертныя групы забяспечылі экспертызу тэставых заданняў на прадмет адпаведнасці зместу тэстаў патрабаванням адукацыйных стандартаў і вучэбных праграм.

— Мы афіцыйна заяўляем, што ўсе тэставыя заданні не выходзяць за рамкі вучэбных праграм, — падкрэсліў Аляксандр Радзькоў. — Тэсціраванне выверана, прадумана, выдатна арганізавана, добра абаронена ад вонкавага ўмяшання і дае аб'ектыўныя паказчыкі. Я хачу паведаміць таксама, што сёлета ўпершыню правядзенне пісьмовых уступных іспытаў у ССНУ для абітурыентаў, якія паступаюць на аснове базавай адукацыі, будзе праводзіцца па цэнтралізаваных заданнях, распрацаваных спецыялістамі Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў. Заданні распрацоўваліся па 8 прадметах: беларускай і рускай мовах, матэматыцы, хіміі, біялогіі, замежных мовах, гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі. Міністэрствам адукацыі ўстаноўлены адзіныя тэрміны правядзення пісьмовых уступных іспытаў па цэнтралізаваных заданнях і вызначаны парадак іх правядзення. Праверка і ацэньванне пісьмовых работ абітурыентаў, выкананых па цэнтралізаваных заданнях, будзе ажыццяўляцца ва ўстановах адукацыі ў адпаведнасці з распрацаванымі ў інстытуце кантролю ведаў «ключамі» і зацверджанымі Міністэрствам адукацыі нормамі ацэнкі ведаў абітурыентаў.

Міністр адукацыі паведаміў, што сёлета на цэнтралізаванае тэсціраванне зарэгістраваліся 173 468 абітурыентаў. З іх толькі 28,7 % плануюць прайсці тэсціраванне ў Мінску, дзе сканцэнтраваныя палова ВНУ. Астатнія 71,3 % абітурыентаў будуць тэсціравацца ў рэгіёнах, бліжэй да месца жыхарства. У якасці экзамену па дзяржаўнай мове 105 985 абітурыентаў (61 %) абралі рускую мову і 67 483 абітурыенты (39 %) — беларускую. З профільных прадметаў самым запатрабаваным з'яўляецца матэматыка — на яе зарэгістраваліся 118 927 абітурыентаў.


Фота Анатоля КЛЕШУКА.

Характэрна, што пры скарачэнні колькасці выпускнікоў сярэдніх агульнаадукацыйных устаноў на 12 тысяч чалавек у параўнанні з папярэднім годам, сёлета назіраецца нязначнае павелічэнне колькасці тэстаў, якія будуць здаваць абітурыенты — прыкладна на 1,5 тысячы. Значыць, канкурэнцыя абяцае быць не менш вострай, чым летась. Зразумела, што не ўсім пашчасціць трапіць у кола студэнтаў, аднак несправядліва пакрыўджаных быць не павінна.

— Абітурыенты павінны ў асобе членаў дзяржаўнай камісіі знаходзіць падтрымку і абарону. І ў спрэчных сітуацыях пытанне трэба вырашаць на карысць абітурыента, — упэўнены Анатоль Рубінаў. — Кожны член дзяржаўнай камісіі — гэта фактычна прадстаўнік Прэзідэнта, таму дзейнічаць трэба адукавана, карэктна і добразычліва. Дапамога павінна быць рэальнай і аператыўнай. Будзьце вельмі ўважлівыя, спрабуйце аналізаваць, з чым вы маеце справу — з прыватным выпадкам ці ў механізме прыёму засталося яшчэ нейкія недапрацоўкі.

У 2010 годзе на ўсе ўзроўні адукацыі запланавана прыняць больш як 200 тысяч чалавек:

на ўзровень вышэйшай адукацыі — 102,7 тыс.;

на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі — 56,3 тыс.;

на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі — 44,9 тыс. чалавек.

Усё арганізацыйна-тэхнічнае суправаджэнне прыёмнай кампаніі ўскладзена на Камітэт дзяржаўнага кантролю. У адпаведнасці з распараджэннем старшыні камісіі Анатоля Рубінава на базе Камітэта дзяржаўнага кантролю была створана міжведамасная рабочая група, у склад якой увайшлі прадстаўнікі Дзяржаўнага кантролю, Адміністрацыі Прэзідэнта, Міністэрства адукацыі і Міністэрства ўнутраных спраў. Адна з задача, якія ставяцца перад рабочай групай — аператыўны разгляд зваротаў грамадзян. Як і ў папярэднія гады, дзяржаўная камісія будзе працаваць адкрыта, а з яе прадстаўнікамі можна будзе звязацца па тэлефонах «гарачай лініі» Камітэта дзяржаўнага кантролю і яго тэрытарыяльных органаў:

Рабочая група дзяржаўнай камісіі ў Мінску (017) 227 66 80.

Брэсцкая абласная камісія (0162) 21 00 33, 23 16 90.

Віцебская абласная камісія (0212) 37 33 90, 36 44 95.

Гомельская абласная камісія (0232) 70 16 38, 70 18 00.

Гродзенская абласная камісія (0152) 74 52 72, 77 04 47.

Мінская абласная камісія (017) 284 06 96, 284 07 06.

Магілёўская абласная камісія (0222) 22 11 84, 22 18 97, 31 07 75.

«Гарачая» лінія ў Міністэрстве адукацыі (017) 222 43 12.

Надзея НІКАЛАЕВА.

П'ЯНЫ МУЖЧЫНА ВЫПАЎ З БАЛКОНА

8 чэрвеня позна ўвечары ў Цэнтр аператыўнага ўпраўлення пры Магілёўскім УМНС паступіла паведамленне з вуліцы Будаўнікоў абласнога цэнтра: з 4-га паверха выпаў чалавек і нейкім цудам упаў на балкон унізе.

Як высветлілі выратавальнікі і медыкі, на балконе 3-га паверха знаходзіўся 28-гадовы мужчына ў стане моцнага алкагольнага ап'янення. Яго не ўдалося эвакуяваць звычайным чынам, таму што гаспадароў кватэры не было дома. Таму па высоўнай лесвіцы выратавальнікі падняліся на балкон, з дапамогай выратавальнай вяроўкі спусцілі пацярпелага на зямлю і перадалі медыкам, паведамілі ў прэс-службе Магілёўскага абласнога УМНС.

Мужчыну шпіталізавалі з пераломам нагі і ранай рукі. Ён расказаў, што выпіваў разам з братам, пасля чаго выйшаў на балкон асвяжыцца, нахіліўся праз парэнчы і не ўтрымаўся. Яму пашанцавала ўпасці не на зямлю, а на балкон ніжняга паверха.

Ілона ІВАНОВА. Фота Магілёўскага УМНС.

АГАРОДЖЫ МОГІЛАК: КРАЛІ І... КУПЛЯЛІ

На два гады пазбаўлення волі асуджаны жыхар Оршы, які займаўся крадзяжом металічнай агароджы з могілак: ён скраў агароджу з дзевяці месцаў пахаванняў на могілках у прыгарадзе райцэнтра.

Як паведаміў «Звяздзе» **памочнік пракурора Аршанскага раёна Мікалай ЛУЧЫНА**, цяпер ужо асуджаны здаваў агароджу на нелегальны пункт прыёму металалому, які арганізавала ва ўласным гаражы жыхарка Оршы. За кожны кілаграм металу яна плаціла ажно 150 рублёў. Безумоўна, у Расіі магла зарабіць больш пры адпраўцы туды металалому. Дарэчы, падчас наведвання гэтага пункта міліцыянеры знайшлі вялікую колькасць агароджы могілак.

У раённай пракуратуры заклікаюць узмацніць кантроль за парадкам на могілках і інфармаваць праваахоўныя органы пра падпольныя пункты закупкі металу. Няўжо сумленне ў той скупшчыцы спала, і не сорамна ёй было нажывацца на горы людзей, здзекавацца з іх памяці?

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПАЦЯПЛЕЛА: НА МЯЖЫ — ЧЭРГІ ФУР

— Чарга фур з кіламетр — гэта яшчэ нармальна, — кажа вадзіцель фуры беларускай фірмы Руслан Ануфрыеў, які чакае дазволу ўехаць у Расію на беларуска-расійскай мяжы. Бывае, прыходзіцца стаяць у чарзе на «празрыстай» мяжы суткамі. І ўсё, як я лічу, з-за лішняй бюракратыі з расійскага боку. Вось копіі толькі рэкамендаваных для запаўнення дэкларацый папрасілі. І за афармленне гэтых папер-бланкаў трэба заплаціць 1000 расійскіх рублёў...

Як высветлілася, кошт на розных пунктах пропуску розны: да 1800 расійскіх рублёў. І чарга розная: два і тры кіламетры бывае.

Другі кіроўца-транзітнік канстатуе, што на беларускім баку мяжы ўсе неабходныя працэдуры для пропуску займаюць хвіліны. Сістэма дзейнасці беларускай мытні наладжана добра. Чаго не скажаш пра суседзяў.

Як растлумачыў «Звяздзе» **намеснік начальніка Віцебскай мытні па арганізацыі мытнага афармлення і кантролю Дзмітрый ГОЛІКАЎ**, чэргі на беларуска-расійскай мяжы — рэч сезонная. У прыватнасці, цяпер, калі тэмпература паветра перавышае больш плюс 20 градусаў, рух вялікагрузнага транспарту забараняецца, каб не псавалася дарожнае палатно. Таму і ствараюцца чэргі.

Паводле слоў намесніка начальніка мытні, расіяне патрабуюць запоўніць электронныя копіі дакумента мытнага транзіту. Гэта трэба зрабіць, калі тавары маюць еўрапейскае паходжанне (вязуць з Еўропы). І насамрэч працэдура займае шмат часу. Трэба спачатку звярнуцца на мытню, адкуль добраахвотна-прымусова адпраўляюць да мытнага брокера. Афармленне каштуе 1500—1800 расійскіх рублёў. А вось на беларуска-польскай мяжы ўжо даўно паспяхова дзейнічае электроннае дэклараванне: копія адпаведнага дакумента адразу з мяжы адпраўляецца ў тую ж Расію, калі груз дастаўляецца туды. Маглі б адпаведнае зрабіць і на беларуска-расійскай мяжы. Нашы мытнікі даўно да гэтага гатовыя.

Даведка «Звязды»: *агульная працягласць беларуска-расійскай мяжы больш за 1200 кіламетраў. 17 пунктаў пропуску дзейнічаюць на мяжы з Бранскай, Пскоўскай, Смаленскай абласцямі.*

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Абзац

◢ У Беларусі з пачатку года затрымана больш за 19,8 тыс. п'яных кіроўцаў. У мінулыя выхадныя за гэта было затрымана 470 чалавек.

◢ Жыхарка Пружанаў звалілася на зямлю з 4-га паверха ў выніку абвалу балкона. Увечары 8 чэрвеня яна выйшла на балкон уласнай кватэры, але жалезабетонная канструкцыя нечакана абвалілася. Брыгадамі хуткай дапамогі жанчына была дастаўленая ў рэанімацыю, дзе ўрачы канстатавалі чэрапна-мазгавую і іншыя траўмы, пераломы ног. Выратавальнікі, якія прыбылі на месца здарэння, устанавілі, што абвалілася мацаванне пліты балкона, частка элементаў канструкцыі ўпала на балкон кватэры паверхам ніжэй. Магчымая прычына — фізічны знос арматуры. Дом быў пабудаваны ў 1970 годзе, хоць апошні капрамонт тут праводзіўся ў 2003 г.

◢ У выніку ўспышкі газапаветранай сумесі ў адным з прыватных дамоў Рэчыцы 33-гадовы мужчына атрымаў апёкі 2-3-й ступені. Высветлілася, што падчас уключэння бытавой газавай пліты яму пазванілі, і чалавек, адцягнуўшы ўвагу, забыўся запаліць фаерку. Пасля размовы па тэлефоне ён, так і не выключыўшы пліту, лёг адпачываць, а калі прачнуўся — закурыў. У выніку ўспышкі газу мужчына атрымаў апёкі галавы, шыі, рук — 25 % цела. Ён шпіталізаваны.

◢ Мінчанін на легкавой машыне ўрэзаўся ў цягнік і спрабаваў знікнуць з месца здарэння. Інцыдэнт адбыўся 8 чэрвеня на 646-м км перагону Вілейка—Маладзечна. Мінчанін на машыне «Масквіч-412» выехаў на забаронны сігнал на неахоўны чыгуначны пераезд, абсталяваны спраўнай гукавой і светлавой сігналізацыяй. У выніку аўтамабіль сутыкнуўся з пасажырскім цягніком Полацк — Мінск. Цеплавоз і машына атрымалі механічныя пашкоджанні. Вадзіцель спрабаваў уцячы, але быў затрыманы

Поўны абзац

◢ Студэнты маскоўскага цыркавога вучылішча трапілі ў Кнігу рэкордаў, выкарыстоўваючы свае прафесійныя навыкі — больш за тры дзясяткі юнакоў і дзяўчат умясціліся ў пазадарожніку вытворчасці Ульянаўскага аўтазавода, які разлічаны на 5 пасажыраў. Агульная вага 32 пасажыраў разам з вадзіцелем склала 1,9 тоны, што адпавядае вазе афрыканскага слана. УАЗ-469 з поўнай загрузкай праехаў 10 метраў, як гэтага патрабуюць умовы ўстанаўлення сусветнага рэкорду.

◢ Амерыканец павёў сяброўку ў горы, збіраючыся ў рамантычных абставінах прапанаваць ёй руку і сэрца. Прапанову малады чалавек зрабіць не паспеў: пакуль ён шукаў словы, дзяўчыну забіла маланка. У той дзень усю раніцу ішоў дождж. Калі Рычард Батлер са сваёй дзяўчынай Бетані Лот дабраліся да вяршыні, надвор'е рэзка пагоршылася, заблішчэлі маланкі. Тры з іх ударылі адна за адной, і апошняя трапіла ў Бетані. Малады чалавек рабіў ёй штучнае дыханне, спрабаваў пазваніць па мабільным тэлефоне, але нічога не атрымлівалася. Самога Батлера ад аднаго з удараў маланкі развярнула на 180 градусаў, адкінула на некалькі метраў. Калі ён ачомаўся, то ўбачыў, што чаравікі яго дымяцца, а скура на нагах абпаленая. У Рычарда адмовілі ногі. Ён змог дапаўзці да аўтамабіля і даехаў да бліжэйшага населенага пункта, дзе звярнуўся па дапамогу. Але дзяўчыне ўжо нічога не магло дапамагчы.

◢ У Львове адбыўся кур'ёзны крадзеж. У адным з завулкаў амаль у цэнтры сярод белага дня львавяне ўбачылі маладога мужчыну, што збягаў. Ён быў аголены ніжэй пояса. Аказалася, што гэта быў сладзюжка, які хацеў пажывіцца прадуктамі на 400 грыўняў з бара. Прадавачка націснула трывожную кнопку, выклікала службу аховы. Другая засланіла дзверы. Злодзей разбіў акно і паспрабаваў збегчы. Работніца кавярні схапіла яго за штаны і сарвала іх разам са споднім. Злодзея гэта не спыніла. 32-гадовага мужчыну злавілі праз пару кварталаў. Ён двойчы судзімы за дробныя крадзяжы.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПАЎНОЧНАЯ КАРЭЯ ПАЛОХАЕ ААН «ЖОРСТКІМІ МЕРАМІ»

Паўночная Карэя заявіла Савету Бяспекі ААН пра свой намер прыняць «самыя жорсткія меры» ў тым выпадку, калі міжнародная супольнасць прызнае версію Паўднёвай Карэі пра прычыну затаплення паўднёвакарэйскага карвета Cheonan у Жоўтым моры 26 сакавіка.

Пасланне было накіравана ў Савет Бяспекі ў сувязі з нядаўняй заяўкай на абмеркаванне абвінавачванняў у адрас КНДР, высунутых Паўднёвай Карэяй пры непасрэднай падтрымцы ЗША і Японіі. У паўночнакарэйскім дакуменце, у прыватнасці, выказваецца нязгода з высновамі камісіі Паўднёвай Карэі, ЗША, Вялікабрытаніі, Аўстраліі і Швецыі, якая расследавала прычыны затаплення судна. Тым часам у сераду Паўднёвая Карэя запатрабавала ад КНДР афіцыйных выбачэнняў за напад на Cheonan.

САЛДАТЫ ТЭРМІНОВАЙ СЛУЖБЫ ВЫКРАЛІ ГРОШЫ З КРЭДЫТАК ЗАГІНУЛАГА ГРАМАДЗЯНІНА ПОЛЬШЧЫ

Пасля доўгага маўчання Расія афіцыйна пацвердзіла факт затрымання вайскоўцаў, якіх падазравалі ў крадзяжы крэдытных картак з месца крушэння польскага ТУ-154. На фоне міжнароднага скандалу, які разгараўся, Следчы камітэт пры пракуратуры (СКП) РФ паведаміў аб завядзенні крымінальнай справы супраць чатырох салдатаў тэрміновай службы па факце незаконнага выкарыстання банкаўскіх картак грамадзяніна Польшчы.

Да гэтага СКП Расіі ад афіцыйных каментараў адмаўляўся, не пацвярджаючы і не аспрэчваючы факт марадзёрства на месцы авіякатастрофы прэзідэнцкага лайнера. Імя чалавека, карткі якога прысвоілі расійскія салдаты, не называецца. Чатыром вайскоўцам — Сяргею Сырову, Ігару Пуставару, Артуру Панкратаву і Юрыю Санькову — прад'яўлена абвінавачванне ў крадзяжы чужой маёмасці, здзейсненага групай асобаў па папярэдняй змове, паведаміў СКП РФ на сваім сайце. Ім пагражае да 5 гадоў пазбаўлення волі. «Усе чацвёра абвінавачаных прызналіся ў зробленым і актыўна супрацоўнічаюць са следствам», — адзначаецца ў паведамленні.

У ПАР ФАНАТЫ СКУРЫЛІ ЎСЕ МАЗГІ ГРЫФАЎ

Арганізацыі па абароне дзікіх жывёл у ПАР б'юць трывогу з нагоды таго, што рэдкія грыфы ў краіне знаходзяцца на мяжы знікнення, бо іх мозг кураць афрыканцы, каб прадказаць зыход матчу на чэмпіянаце свету па футболе.

Традыцыя курэння мазгоў грыфа мае старажытныя карані ў супольнасцях Паўднёвай Афрыкі. Лічыцца, што птушка валодае здольнасцю празорлівасці, а чалавек, які з'есць часцінку грыфа, гэтак жа зможа прадказваць будучыню. Але не толькі людзі ўяўляюць пагрозу для дзікіх жывёл, але і непаўторныя насельнікі фаўны Паўднёвай Афрыкі нясуць небяспеку для шматлікіх журналістаў і футбольных балельшчыкаў. Надоечы на паўночным захадзе ПАР брытанскі журналіст Мэт Лотан падвергся нападу дзіка, які накінуўся на госця прама ў кафэ. Англійскім футбалістам не пашанцавала больш за іншых, побач з іх базай размясціўся цэлы статак бабуінаў. Гэтыя «наймілейшыя» малпы крадуць ежу прама са сталоў родапачынальнікаў футбола, прымушаючы гульцоў скардзіцца кіраўніцтву зборнай і журналістам.

А ўрад Гандураса абвясціў непрацоўным час матчаў футбольнай зборнай краіны на чэмпіянаце свету. Пастанова з'яўляецца абавязковай для ўсіх дзяржаўных установ, але прыватным кампаніям таксама рэкамендавана адпусціць супрацоўнікаў на час матчаў зборнай. Свой першы матч на ЧС-2010 каманда Гандураса правядзе ў сераду, 16 чэрвеня. Па мясцовым часе гульня пачнецца раніцай, і жыхарам краіны дазволілі не з'яўляцца на працы да 10:00. Па заканчэнні гэтай сустрэчы і ўсіх астатніх яны павінны вярнуцца на працоўныя месцы.

Падрабязнасці

ПАСЛЯ ВЫКАНАННЯ ДЗЯРЖЗАКАЗУ...

Заведзена чарговая крымінальная справа ў дачыненні да службовых асобаў ААТ «Лідахлебапрадукт» па ч. 3 арт. 426 Крымінальнага кодэкса Беларусі («перавышэнне ўлады альбо службовых паўнамоцтваў»), паведамляе прэс-служба УКДБ па Гродзенскай вобласці.

Летась Камітэтам дзяржаўнай бяспекі сумесна з Гродзенскім упраўленнем па барацьбе з арганізаванай значыннасцю і карупцыяй МУС былі выяўлены факты перавышэння службовых паўнамоцтваў кіраўніцтвам гэтага прадпрыемства. Пасля чаго гаспадарчую дзейнасць ААТ праверылі Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці і КРУ Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, зрабіўшы высновы аб нямэтавым выкарыстанні прадпрыемствам сродкаў рэспубліканскага бюджэту, неэфектыўным выкарыстанні ўласных сродкаў і банкаўскіх крэдытаў. У выніку незаконных дзеянняў пры закупцы збожжа ў перыяд са жніўня 2008-га па красавік мінулага года ААТ «Лідахлебапрадукт» прычыненыя страты каля 800 мільёнаў рублёў.

У ходзе расследавання высветлілася, што пасля выканання дзяржаўнага заказу па нарыхтоўцы збожжа кіраўніцтва ААТ адмаўлялася купляць лішкі ўраджаю ў сельгаспрадпрыемстваў сваёй сыравіннай зоны са спасылкай на адсутнасць свабодных складскіх памяшканняў. Гаспадаркам нічога не заставалася, як, нягледзячы на забарону Мінсельгасхарча, прадаваць збожжа камерцыйным структурам, якія, як потым стала вядома, па папярэдняй дамоўленасці з кіраўніцтвам «Лідахлебапрадукта», ім жа і рэалізоўвалі набытае збожжа, але ўжо па больш высокай цане. Такім чынам, аптовая надбаўка, якая па законе не павінна перавышаць 5 працэнтаў, завышалася імі да 50 працэнтаў. Згодна з умовамі заключаных дагавораў, перапрацоўшчыкі таксама павінны былі кампенсаваць камерсантам расходы па транспарціроўцы — больш за 318 мільёнаў рублёў. Насамрэч жа пастаўкі ажыццяўляліся на ўмовах транзіту, без затратаў на транспарціроўку і захоўванне тавараў. На падставе выкладзенага сёлета ў студзені ўпраўленнем КДБ па Гродзенскай вобласці заведзена крымінальная справа ў дачыненні да кіраўнікоў ААТ «Лідахлебапрадукт».

Нягледзячы на заключэнні рэвізораў, асобныя службовыя асобы ААТ працягнулі выкарыстоўваць так званыя шэрыя схемы. Праз некаторы час пасля праверкі гаспадарчай дзейнасці з прадпрыемства праводзіцца адгрузка ўласнай прадукцыі — камбікорму ў адрас той жа камерцыйнай структуры з наступным залікам у лік аплаты за пастаўленае збожжа па завышаных цэнах. Усе дзеянні афармляюцца дакументальна, аднак выяўленыя ў ходзе праверкі парушэнні па фарміраванні закупачных цэнаў на збожжа не ўлічваюцца. Гэта здзелка дадаткова прычыняе прадпрыемству матэрыяльныя страты на суму каля 44 мільёнаў рублёў. Следства высветліць, што за гэтым стаіць — прага нажывы альбо элементарнае няведанне нарматыўна-прававых дакументаў, зазначае прэс-служба УКДБ па Гродзенскай вобласці.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ЗНІЗІЛІ КОШТ ПАСЛУГ — І ПРЫЦЯГНУЛІ КЛІЕНТАЎ

Зніжкі папулярныя сёння не толькі ў працаўнікоў рознічнага гандлю, свайго роду зніжкі прапануюць кліентам і ў банкаўскай сферы, у прыватнасці — у Банку ВТБ (Беларусь). «Здолелі знізіць кошт сваіх паслуг — і прыцягнулі дадатковых кліентаў», — так зазначылі прадстаўнікі банка падчас прэс-брыфінгу, на якім паведамілі пра вынікі сваёй дзейнасці ў першым квартале.

На што тут пры гэтым звяртаюць першачарговую ўвагу? На скарачэнне адміністрацыйна-кіраўнічых расходаў, на якасць крэдытнага партфеля. Банк належным чынам дыверсіфікаваў свае рэсурсы і ў выніку змог знізіць для сваіх кліентаў працэнтную стаўку пры іх крэдытаванні; у рабоце з кліентамі, як адзначаюць тут, ён «ажыццявіў пераход ад мадэлі продажу асобных прадуктаў — да кліентаарыентаванага падыходу, заснаванага на патрэбах розных катэгорый кліентаў».

Банк ВТБ (Беларусь) адносна нядаўна прыйшоў на наш рынак, яго асноўны акцыянер — ААТ ВТБ з Расіі. Адным з прыярытэтных кірункаў банка з'яўляецца абслугоўванне суб'ектаў малога бізнэсу. Яго стратэгічная задача — у бліжэйшы час увайсці ў пяцёрку мацнейшых банкаў Беларусі.

Іван АЛЯКСАНДРАЎ.

«ДОН КІХОТ» З ВІЛЬНЮСА

Купалаўская сцэна на два дні стане літоўскай

Літоўскі нацыянальны тэатр драмы пакажа ў Мінску толькі два спектаклі — але тым больш каштоўная сустрэча з тэатрам суседняй краіны.

Для знаёмства абраны мюзікл «Чалавек з Ламанчы», які быў пастаўлены на Брадвеі, але і пастаноўка літоўскага тэатра скарыла жыхароў Вільнюса. 12 чэрвеня пастараецца скарыць беларускую публіку. І калі ўлічыць, што ў нашых тэатрах няшмат музычных спектакляў, то вялікая частка поспеху ўжо забяспечаная. Але проста так разняволіцца пад музыку наўрад ці атрымаецца, бо праз гісторыю вядомага літаратурнага персанажа ўзнімаюцца сур'ёзныя пытанні. І тут ён — не дзіўнаваты барацьбіт з ветракамі. Тут ён — сам Сервантэс, які... прыдумаў героя і яго вуснамі імкнецца выказаць свае ўласныя думкі. Адносіны Сервантэса і Дон Кіхота і ёсць самая загадкавая лінія спектакля, пастаўленага Адольфасам Вячэрскісам. Што ж тут дзіўнага? З жаданнем зрабіць свет больш прыгожым ў спектаклі памірае сам Сервантэс, а яго герой застаецца жыць...

Аднак калі вы чакаеце чагосьці зусім нерэальнага, то гісторыя, якая распавядаецца ў другім спектаклі, можа падацца больш псіхалагічна-заблытанай. З «Чорнай удавой» літоўскі тэатр паznаёміць 13 чэрвеня. Аднак вось гэтая гісторыя насамрэч абсалютна рэальная: славуты нямецкі кінарэжысёр Райнер Вернер Фасбіндэр напісаў п'есу, паводле якой пастаўлены спектакль, узяўшы за аснову рэальны факт з жыцця. Атрутніца Гейша Готфрыд, каб утрымаць каханага, забівае сваіх дзяцей. Кожнае з забойстваў падобнае на нейкі рытуал, і забойца не адчувае віны... Але праз гэтую гісторыю аўтар п'есы імкнуўся вывесці прычыны выбуху зла ў людзях, якое можа нарадзіць тэрор.

Ларыса ЦІМОШЫК.

ПАРАЛІМПІЙСКІ СПАКОЙ — АД АХОВЫ

Учора ў Дэпартаменце аховы МУС прайшло ўшанаванне беларускіх паралімпійцаў на X Гульнях у канадскім Ванкуверы, дзе дзевяць спартсменаў заваявалі 9 узнагародаў: 2 залатыя і 7 бронзавых.

Дэпартамент аховы са свайго боку зрабіў шмат, каб жыццё айчынных прадстаўнікоў інваспорту было не шэрым, а багатым на добрыя ўчынкі. Кожны з паралімпійцаў атрымаў падарунак у выглядзе бясплатнай установкі ахоўна-пажарнай сігналізацыі ў свае кватэры.

З гэтай нагоды начальнік Дэпартамента аховы МУС Сяргей Буйноўскі сказаў, што іх удзел у дабрачыннай акцыі — гэта не даніна модзе, а жыццёвая неабходнасць. І рэаліі сённяшняга дня паказваюць, што такія акцыі патрэбныя. А ў якасці асабістых узнагародаў, якія можна з гонарам паказваць сябрам і знаёмым, кожны з беларускіх паралімпійцаў атрымаў ганаровы знак Дэпартамента аховы, зацверджаны Указам Прэзідэнта краіны, — «За адзнаку». У завяршэнне гэтай сустрэчы прагучалі цёплыя словы з вуснаў намесніка старшыні спартыўнага камітэта Узброеных Сілаў Уладзіслава Рашчупкіна. Крыху пазней яны былі пацверджаны каштоўнымі падарункамі — DVD-прайгравальнікамі.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ

1. Полное наименование, место нахождения и контактный телефон покупателя акций:

Открытое акционерное общество «Красный Октябрь»;

юридический адрес: Республика Беларусь, г. Витебск, пр. Ген. Людникова, 10, тел. 8 (0212) 24 73 18, 24 75 00;

почтовый адрес: 210026, г. Витебск, пр. Ген. Людникова, 10.

2. Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются:

210026, г. Витебск, пр. Ген. Людникова, 10.

3. Цель приобретения акций:

аннулирование и уменьшение уставного фонда на размер номинальной стоимости приобретенных Обществом акций.

4. Количество акций эмитента, предложенного к скупке:

577 714 (пятьсот семьдесят семь тысяч семьсот четырнадцать) штук, в отношении которых не распространяются ограничения по распоряжению этими акциями, в соответствии с подпунктом 1.12 пункта 1 Декрета Президента Республики Беларусь от 20 марта 1998 г. № 3 «О разгосударствлении и приватизации государственной собственности в Республике Беларусь».

5. Цена приобретения:

250 (двести пятьдесят) белорусских рублей.

6. Срок, форма и порядок оплаты акций:

в течение пяти рабочих дней со дня регистрации договора купли-продажи, денежными средствами путем перечисления на реквизиты, указанные акционером в договоре купли-продажи.

7. Цена приобретения:

250 (двести пятьдесят) белорусских рублей.

8. Адрес, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций:

210026, г. Витебск, пр. Ген. Людникова, 10.

9. Даты начала и окончания срока представления предложений акционеров на продажу акций и покупку акций (заключение договоров купли-продажи акций) с 14.06.2010 по 31.12.2010 г.

УНП 300003144

ИП Альшенецкий С.В. (св-во о госрегистрации № 790491500 выд. Кличевским РИК от 26.08.08 г. № 196) **прекращает свою деятельность в связи с ликвидацией**. Претензии принимаются в течение 2-х месяцев со дня публикации.

БАЛЕТНЫЯ НАМЕРЫ

Ліепа адкрые ў Мінску «Рускія сезоны XXI стагоддзя»

ПРА магчымасць прыезду да нас гэтага праекта яго заснавальнік і ідэйны натхняльнік, народны артыст Расіі Андрыс Ліепа дамаўляўся з кіраўніцтвам Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, дзеля чаго спецыяльна прыязджаў у Мінск. Дамовы перайшлі ў намеры і былі падмацаваныя пратаколам, згодна з якім у кастрычніку ў нас будзе магчымасць паглядзець два легендарныя балетныя спектаклі — «Жар-птушка» і «Шэхеразада».

Рыхтавацца да сустрэчы з прыгожым і вытанчаным мастацтвам можна пачынаць, ашчаджаючы грошы на квіткі, хоць пакуль невядома, колькі яны будуць каштаваць. Цану будзе вызначаць беларускі тэатр, аднак Андрыс Ліепа засведчыў, што на спектаклі ў Парыжы квіткі разыходзяцца вельмі хутка — за 1,5 месяца. Натуральна, яны там нятанныя. Бо «Рускія сезоны XXI стагоддзя» — па сутнасці прыватная антрэпрыза. Аднак на балеце шмат грошай не заробіш, прызнаўся Ліепа-прадзюсар. Сам праект задуманы з размахам, у ім удзельнічаюць больш за 80 артыстаў, ды і сама назва выдае амбітнасць яго аўтараў.

Напачатку XX стагоддзя імпрэсарыа і мецэнат Сяргей Дзягілеў заснаваў трупу «Рускія сезоны» — адну

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

10 чэрвеня 2010 г. № 22 (216)

НЕ «ПРАСПАЦЬ» ГОД ЯКАСЦІ

Пры Савецкім Саюзе наша рэспубліка была «зборачным цэхам» вялікай дзяржавы. Тут размяшчаліся буйныя прадпрыемствы, якія выпускалі значныя аб'ёмы прадукцыі на патрэбы ўсяго СССР. Пасля яго распаду Беларусь апынулася ў вельмі складанай сітуацыі: такія маштабныя вытворчасці не былі патрэбныя маленькай краіне, а традыцыйныя сувязі з астатнімі былымі саюзнымі рэспублікамі парушыліся.

З такога своеасаблівага экскурсу ў недалёкую гісторыю нашай краіны пачаў сваё выступленне перад слухачамі курсаў павышэння кваліфікацыі Інстытута дзяржслужбы (старшынямі сельскіх і пасяловых Саветаў дэпутатаў) старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Вадзім ПАПОЎ.

— Паўстала пытанне: што рабіць, якім шляхам ісці? Прапановы былі радыкальныя: пайсці па расійскім шляху, раздаць усе прадпрыемствы. Дайшлі да таго, што прапаноўвалі прадаць наш Мінскі трактарны завод за адзін долар ЗША, а Жодзінскі завод, які выпускаў кар'ерныя самазвалы, аддаць у нагрузку. Дзяржаўны аграрны сектар — пахаваць, замест яго стварыць фермерства, якое б карміла краіну і забяспечвала харчовую бяспеку. Пры тым, што мы на той час у аграрным сектары ўжо мелі буйную таварную вытворчасць. У нас тады існавала больш за сто жывёлагадоўчых комплексаў па вытворчасці свініны, столькі ж — па вытворчасці ялавічыны, 80 буйных птушкафабрык рознага кірунку і г.д.

Пасля абрання першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь нарадзілася ідэя пабудовы сацыяльна арыентаванай эканомікі ў нашай дзяржаве. Упершыню яна была акрэслена на I Усебеларускім сходзе. Напачатку ідэя выклікала шмат спрэчак і дыскусій, пацвердзіў выступоўца, многія не верылі тады ў магчымасць яе рэалізацыі.

— Тым не менш, рашэнні I, II і III Усебеларускіх сходаў рэалізуюцца, і сёння наша эканоміка знаходзіцца зусім у іншым стане. МТЗ вырабляе тры чвэрці ўсіх трактароў, якія выпускаюцца на тэрыторыі былога СССР, а па выніках першага квартала гэтага года — 96 працэнтаў. Жодзінскія кар'ерныя самазвалы сёння займаюць трэць сусветнага рынку, а па цяжкіх самазвалах грузапад'ёмнасцю звыш 130 тон — 40 працэнтаў.

Што тычыцца аграрнага сектара, мы не толькі захавалі буйныя жывёлагадоўчыя комплексы, але і здолелі іх развіць. Сёння цалкам забяспечана харчовая бяспека краіны і на 2,5-3 мільярды долараў прадуктаў харчавання пастаўляецца на экспарт.

Раней мы завозілі звыш 0,5 мільёна тон пшаніцы — і для харчовых мэтаў, і на корм жывёле. Столькі ж — зерня кукурузы для патрэбаў жывёлагадоўлі. І ўсё гэта патрабавала валюты. Сёння мы самі дастаткова вырабляем пшаніцы — штогод больш за 2 мільёны тон. Цалкам забяспечваем патрэбы цэха жывёлагадоўлі і вытворчасці прадуктаў харчавання. Акрамя таго, навучыліся вырошчваць гібрыды, такія як трыцікале (сумесь пшаніцы і жыта) для фуражных мэтаў, навучыліся самі вырошчваць кукурузу на зерне (атрымліваем 0,5 мільёна тон у сухой амбарнай вазе) і практычна цалкам адмовіліся ад імпарту кукурузы для кармавых мэтаў.

На пэўным этапе наша дзяржава сутыкнулася з праблемай недахопу алею, бо Расія і Украіна на той час ужо развалілі свае адпаведныя вытворчасці. Давялося імпартаваць алей з Еўропы. Паступова Беларусь навучылася вырошчваць рапс і атрымліваць з яго алей. Сёння мы вырабляем звыш 600 тысяч тон насення рапсу і плануем выйсці на 1 мільён тон. Па зерню кукурузы мяркуем дасягнуць 2,5-3 мільёнаў тон.

Як патлумачыў Вадзім Папоў, у нашай краіны ёсць рэальная магчымасць выйсці на паказчык 1,5 тоны збожжа на аднаго жыхара, атрымліваць ураджаі па 15 мільёнаў тон. Але для гэтага трэба вярнуць у севазварот кінутыя землі.

— Мы сёння збожжавымі культурамі засяваем 2,5 мільёна гектараў зямлі, але каб рэалізаваць задачу 1,5 тоны на чалавека, трэба выйсці на 3 мільёны гектараў. Ці магчыма гэта? За часы самастойнасці было выкінута з севазвароту звыш 900 тысяч гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў. Большая частка з іх — гэта пашы. Без войнаў і канфліктаў мы страцілі 7 раёнаў рэспублікі, раздалі зямлю як «малапрадуктыўную», «малаконтурную». Гэта занадта вялікая раскоша.

Вадзім Папоў падкрэсліў, што работа па вяртанні ўчасткаў у севазварот вядзецца яшчэ не так, як хацелася б. На многіх тэрыторыях мінулы год навядзення парадку на зямлі проста праспалі. Аднак ёсць і станоўчыя прыклады.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ДЗЕ ЎЗЯЦЬ І КАМУ АДДАЦЬ?

Спрэчкі вакол участкаў у Каладзішчанскім сельсавеце не затухаюць...

Прысталічны Каладзішчанскі сельсавет — з катэгорыі складаных, калі не сказаць скандальных. Ён «праславіўся» сваімі судовымі справамі, якія датычыліся выдзялення зямельных участкаў. За пяць апошніх гадоў тут змянілася пяць старшынь сельскага Савета. Шосты — Сяргей Жолуд — быў зацверджаны на гэтую пасаду менш за месяц таму, пасля апошніх выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў.

«Спадчына» яму засталася, мякка кажучы, беспакойная. За прыёмны дзень праз кабінет старшыні Савета і іншых спецыялістаў праходзіць ад 100 да 200 чалавек. Найбольш распаўсюджаныя (і разам з тым балючыя) пытанні маюць самае непасрэднае дачыненне да зямельных участкаў: іх асваення і забудовы.

Спецыфіка

Не магу стрымацца і не пацікавіцца ў Сяргея Васільевіча, як ён адчувае сябе на такой «нервовай» пасадзе? Не страшна?

— Не страшна, — адказвае. — Я дарослы чалавек і гляджу на многія рэчы рэальна. Таму, напэўна, доўга не пагаджаўся заняць гэта месца, адмаўляўся катэгарычна. І не таму, што баяўся цяжкасцяў. Проста ёсць праца перспектыўная, а ёсць — наадварот. У старшыні сельскага Савета яна неперспектыўная, тым больш калі мець на ўвазе Каладзішчанскі сельскі Савет... Але паколькі я ўжо займаю гэтую пасаду, дык вызначыў для сябе прыкладны тэрмін працы — скажам, год. Больш наўрад ці атрымаецца, я ж не Гасподзь Бог. Можна зрабіць тое, што ад цябе залежыць. Але ў тым і рэч, што вырашэнне многіх праблем тэрыторыі ад кіраўніка мясцовай улады не залежыць.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Сяргей ЖОЛУД, старшыня Каладзішчанскага сельскага Савета Мінскага раёна.

Апошнія пяць гадоў Сяргей Жолуд нязменна ўзначальваў камунальнае ўнітарнае прадпрыемства «Экскампаслугі», арганізаванае пры Каладзішчанскім сельвыканкаме. Жартуе, што не яго змянялі кіраўнікі сельскага Савета, а ён іх. А калі сур'ёзна, мясцовыя праблемы вядомыя Сяргею Жолуду не па чутках. Гэтак жа, як і спецыфіка прысталічнай тэрыторыі, якая юрыдычна лічыцца сельсаветам, а фактычна насельніцтва даўно прад'яўляе ўладзе «гарадскія» прэтэнзіі.

На сённяшні дзень у сельсавеце прапісана каля 18 тысяч чалавек. Але ёсць яшчэ і «падводная плынь» — непрапісаныя грамадзяне. Інакш кажучы, ёсць вялікая колькасць пабудаваных катэджаў, але людзі, якія там жывуць, не збіраюцца афармляць прапіску. І такіх, калі паставіць мэтай іх «вылічыць», назбіраецца ад 2 да 4 тысяч. Даказаць «наяўнасць» грамадзяніна на канкрэтнай жылплошчы не ўяўляе вялікай цяжкасці, гэта робіцца метадам элементарных матэматычных падлікаў — падлічваецца спажыванне вады, газу, а таксама смеццевы «вал».

Некаторыя, наадварот, прыязджаюць у Каладзішчанскі сельсавет, каб тэрмінова прапісацца, стаць у «жыллёвую» чаргу, праз паўгода атрымаць участак і... цяпер жа выпісацца. Гэта яшчэ каля тысячы грамадзян. А ўвогуле... Пакуль прысталічная зямля будзе ў цане, людзі не перастануць шукаць «лазейкі» для яе набыцця і перапродажу.

Нават з-за маленькага кавалачка зямлі, з-за палоскі ў 30 сантыметраў, выпадкова «захопленай» суседам, чалавек здольны перавярнуць горы, узняць на ногі міністэрствы, дайсці нават да прэзідэнта... Што ўжо гаварыць пра ўчасткі, кошт якіх складае некалькі дзясяткаў мільёнаў рублёў?

«Кошт» пытання

Пачынаючы з 1993 года, у Каладзішчанскім сельсавеце пад будаўніцтва жылых дамоў была выдзелена велізарная колькасць участкаў — прыкладна 6,5 тысячы. З іх за гэты час асвоена (забяспечана інфраструктурай — дарогамі, асвятленнем, газаправодам) каля 3 тысяч, і тое ў асноўным дзякуючы ўласным сродкам людзей. Гаспадары астатніх 3-4 тысяч участкаў пра інфраструктуру па-ранейшаму толькі мараць. Гэта найцяжэйшая праблема, якую сам сельсавет вырашыць не ў стане. «Кошт» пытання — некалькі мільярдаў рублёў, у той час як на добраўпарадкаванне ў бюджэце сельсавета закладзена ўсяго 260 мільёнаў, з якіх непасрэдна дарогам «належыць» 20 мільёнаў. Гэта мізэр, якога хопіць хіба што на падсыпку і падлатванне ўжо існуючых дарог.

Сяргей Васільевіч раскладвае на стале план забудовы пасёлка Калодзішчы.

— Мы з вамі знаходзімся тут, — паказвае ён на невялікі «пятачок». — Гэта старыя Калодзішчы, якім у наступным годзе спаўняецца 140 гадоў. А ўсё астатняе «прырасло» за апошнія дзесяць гадоў. Вось гэта — так званы «палігон», раён жылой забудовы, а насамрэч абсалютна неасвоены ў сэнсе інфраструктуры кавалак зямлі працягласцю 7 кіламетраў. Рэальна праехаць па ім можна толькі да паловы, прычым нікуды не збочваючы — машыны буксуюць. Уяўляеце? Чалавек атрымаў участак, і не можа да яго дабрацца. Што ў выніку? У выніку ён прыходзіць да мяне з прэтэнзіяй: вы мне далі зямлю, а дзе ж усё астатняе? Дзе святло, газ, асфальт? І ён мае рацыю — зямлю неабходна асвойваць, але за якія сродкі?

На сёння асваенне зямлі пад будаўніцтва — галоўная праблема сельсавета. Ільвіная доля зваротаў і скаргаў грамадзян «вырастае» менавіта адсюль. Раз ёсць улада, думаюць людзі, значыць, яна павінна вырашаць усе мясцовыя праблемы, у тым ліку і з інфраструктурай. Калі ж праблема не вырашаецца, значыць, улада «нічога не робіць».

— Насамрэч, гэта, безумоўна, не так. Усе мае папярэднікі — старшыні сельскага Савета — біліся над праблемай пастаянна, дасылаючы ва ўсемагчымыя інстанцыі лісты з просьбай дапамагчы вырашыць пытанне. Што атрымаецца цяпер, час пакажа.

Аўкцыёны

Праблему інфраструктуры можна часткова вырашыць за кошт правядзення аўкцыёнаў. Тым больш у прысталічным раёне, дзе, як той казаў, сам Бог загадаў... І старшыня Каладзішчанскага сельскага Савета збіраецца ў поўнай меры скарыстацца такой магчымасцю — у бліжэйшай будучыні выставіць на аўкцыён лепшыя ўчасткі зямлі. Ён загадзя ведае, што часткі насельніцтва — тыя, хто стаіць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў — будзе пакрыўджаная такім рашэннем. Але іншага выйсця ў Жолуда проста няма. Каб зарабіць 4-5 мільярдаў на асфальтаванне дарог, неабходна прадаць як мінімум 100 участкаў.

— У адпаведнасці з заканадаўствам, мы маем права і зямельныя ўчасткі даваць людзям, і аўкцыёны праводзіць. Але прапорцыі — колькі ўчасткаў выдзеліць для грамадзян, а колькі прадаць на аўкцыёне — вызначае кіраўнік мясцовай улады, зыходзячы з інтарэсаў сельсавета, — тлумачыць Сяргей Васільевіч. — На мой погляд, трэба было б нават арыентавацца на прапорцыі «50 на 50», павялічыўшы долю аўкцыёнаў. Але ў любым выпадку, пастараемся нешта змяніць у лепшы бок — будзе зроблена хаця б цэнтральная дарога ў мікрараёне Калодзішчы-2. Яшчэ адзін магчымы варыянт — патраціць «аўкцыённыя» грошы на падрыхтоўку праектнай дакументацыі, каб таму, хто прыйдзе пасля мяне, было з чым працаваць. Але на само будаўніцтва іх, зразумела, ужо не хопіць.

Сёлета сельвыканкам зарабіў за кошт аўкцыёнаў каля 160 мільёнаў рублёў, выканаўшы такім чынам план па абавязковым унёску ў раённую казну. Усе далейшыя заробкі, незалежна ад іх велічыні, застануцца ў бюджэце сельсавета.

— Нават калі гэта будзе мільярд, ён цалкам «асядзе» ў нас, і мы зможам патраціць яго на добраўпарадкаванне праблемных тэрыторый.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

УЛАСНАЯ ГАСПАДАРКА

Вялікае малако ў «камерцыйны век»

Усю прадукцыю асабістых падсобных гаспадарак трэба набыць — такую задачу ставіць дзяржава перад мясцовымі органамі ўлады. Як арганізаваны актуальны цяпер збор малака ў насельніцтва, ці ёсць у людзей нараканні і прапановы, расказваюць старшыні сельскіх Саветаў з глыбінкі Магілёўскай вобласці.

Леанід ФРАНЦУЗАЎ, старшыня Свіслацкага сельскага Савета дэпутатаў Асіповіцкага раёна:

— Малако мы збіраем, але яго становіцца ўсё меней. Вясковае насельніцтва старэе, а маладыя людзі не хочуць трымаць жывёлу. Моладзь лічыць, што больш выгадна набыць у краме, чым мець клопат — падымацца раней і класціся пазней. У нашых вёсках практычна няма маладых гаспадароў, якія трымаюць кароў. Угаворваем, але век цяпер такі... камерцыйны, і новае пакаленне імкнецца яму адпавядаць.

А так зборшчыкі малака працуюць, аб'язджаюць ды збіраюць, і нараканняў на іх працу няма. Сельскія гаспадаркі нашых людзей забяспечваюць гатовымі кармамі, у адпаведнасці са здадзеным малаком. Па тлустасці малака здараюцца праблемы, але тым, у каго яна ніжэй за базавыя 3,6 %, плацяць меней грошай. Тлустасць вызначаем у прадукцыі кожнага гаспадара персанальна.

Праблема ў арганізацыі збору малака ў насельніцтва — знайсці зборшчыка малака. Аплата гэтай працы невысокая, і калі мінае сезон «вялікага малака», узнікаюць праблемы.

Таццяна КАНАНЧУК, старшыня Слаўгарадскага раённага Савета дэпутатаў:

— Малако з усяго раёна адпраўляецца на Слаўгарадскі масласырзавод, які з'яўляецца філіялам «Быхаўмалака». У 9 раніцы, не пазней за палову на 10-ую, малако павінна быць на месцы, таму зборшчыкі пачынаюць працу а 5-й раніцы.

Добра, што ўжо месяц у нас няма масавага вяртання малака, як гэта здаралася з прычыны павышанай кіслотнасці. Справа ў тым, што цяпер у Слаўгарадзе ўсталяваны для малака ад насельніцтва асобны танкер, дзе ахалоджваецца прадукт. Таму цяпер малако дастаўляецца да вытворцы свежым. Людзям, калі што, могуць вярнуць некалькі асобных забракаваных бітонаў з малаком, але ж не ўсю партыю.

Наша праблемнае пытанне — тлустасць малака. Аналіз на тлустасць робіцца двойчы за 15 дзён, і агульны паказчык, здараецца, ніжэйшы за 3,6 %. Нам хацелася б, каб у кожнага зборшчыка быў прыбор і магчымасць штодня рабіць аналіз малака на месцы, каб кожны гаспадар ведаў адразу свой вынік і разлічваў на адпаведную аплату сваёй прадукцыі. Таму што пакуль яны атрымліваюць грошы не за сваё канкрэтнае малако, а па сярэдняму, падзеленаму на ўсіх, паказчыку. Будзем спадзявацца, што ў бліжэйшай будучыні нам удасца наладзіць індывідуальны кантроль тлустасці малака.

Зоя РЫЖКОВА, старшыня Язёрскага сельскага Савета дэпутатаў Чэрыкаўскага раёна:

— Штодня ў нашым сельсавеце здаюць каля 900 кілаграмаў малака. Як і ўсюды, колькасць кароў у грамадскім статку памяншаецца, таму што старыя не маюць сілаў. Маладыя не тое што лянуюцца: часта ў іх магчымасці такой няма, бо працуюць яны поўны дзень, а карова патрабуе догляду.

Але магчымасць набыць карову ў гаспадарцы ёсць ва ўсіх. Даюць пашы і сенажаці. Тыя, хто здае малако, атрымліваюць ад гаспадаркі гатовыя кармы у рулонах, якія прывозяць ім дадому.

У нас на Чэрыкаўшчыне ёсць магчымасць трымаць сваю падсобную гаспадарку. І зямлі дадуць, і тэхніку. Але яшчэ лепей, што цяпер вяртаецца сістэма, якая калісьці існавала. Вяскоўцы будуць замаўляць сабе ўчасткі ў агульным севазвароце гаспадаркі. Цяпер не будуць біць камбайны на дробных участках, а апрацуюць іх у агульным масіве. І людзям зручна.

Вера АГАРОДНІКАВА, старшыня Сапрынавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Мсціслаўскага раёна:

— Гэта з нашага сельсавета паступіла скарга ў КДК ад пенсіянеркі, якой давялося ў руках раніцай цягнуць вёдры з малаком да дарогі, дзе спыняўся аўтамабіль зборшчыка. Аднак гэтая праблема ўжо даўно вырашана. Па тым часе, наколькі я ведаю, гэта быў збег абставінаў: у зборшчыцы малака згарэла хата і яна пераехала, а аўтамабіль, які дала гаспадарка, не мог праехаць увесну па вясковай вуліцы. Цяпер дарогу падсыпалі. Усё зрабілі належным чынам, і аўтамабіль раніцай пад'язджае да кожнай хаты, дзе прадаюць малако дзяржаве.

Больш падобных праблем у нас не ўзнікае. Аналіз тлустасці малака робіцца на месцы, каб не было потым пытанняў і прэтэнзій. Штодзень гаспадары з нашага сельсавета здаюць болей за 700 літраў малака. Гэта нармальны аб'ём.

У мяне таксама да апошняга часу была карова, але яна захварэла. Цяпер я без каровы і, пакуль на новай пасадзе працую літаральна некалькі тыдняў, за клопатамі яшчэ не набыла новую. Але гэта абавязкова зраблю, таму што трэба дзяцей гадаваць і даглядаць старых бацькоў. Я займела кароў 19 гадоў таму, калі прыехала па размеркаванні на Мсціслаўшчыну. І ўсе людзі ў нас жывёлу трымаюць, масава ад яе не пазбаўляюцца. Вось толькі бабулі скардзяцца, што ўвосень, можа, адмовяцца, бо зусім сілаў нестае. А так сяляне не могуць без жывёлы, тым болей што пашу сёлета абнавілі, сенажаці выдзяляюць, ды яшчэ і гаспадарка гатова прывезці гатовыя рулоны сена, ва ўсякім разе — сваім працаўнікам.

Аляксей РЫБАКОЎ, старшыня Комсеніцкага сельскага Савета дэпутатаў Круглянскага раёна:

— Збор малака ў нас арганізаваны, але ёсць і прапановы. Людзі лічаць, што малако павінна каштаваць даражэй. Цяперашнія 710 рублёў за літр — гэта, паводле меркавання народу, недастаткова. Тым больш, калі паднялі да ўзроўню 3,6 % базавую тлустасць малака.

Акрамя таго, мы хацелі б прапанаваць прадпрыемству, якое забірае малако — а менавіта «Бабулінаму гладышу», правесці эксперымент у асобна ўзятым сельскім раёне: самастойна арганізаваць збор малака належным чынам і перапрацоўваць яго. Таму што цяпер мы часам маем вяртанне забракаванага малака. А разабрацца з прычынамі даволі цяжка, таму што ў вялізную ёмістасць зліваецца малако ад некалькіх соцень гаспадароў, якія жывуць на тэрыторыі некалькіх сельсаветаў. Толькі наш сельсавет штодня здае 850 літраў малака.

Цяжка растлумачыць людзям, чаму вяртаюць іх малако. У любым выпадку, асабістыя падсобныя гаспадаркі — гэта не фермы, дзе механізавана робяцца ахаладжэнне і ачыстка малака. Раней казалі, што малако ад насельніцтва будзе завозіцца ў асобны райцэнтр, дзе будзе перарабляцца. Але пакуль гэтага няма.

Уладзімір ПАГУЛЯЕЎ, старшыня Бярозкаўскага сельскага Савета дэпутатаў Хоцімскага раёна:

— У нас збор малака добра наладжаны. Праўленне СВК «Кастрычнік-Бярозкі» даю на гэтую справу трактар. Зборшчыкам малака ўжо амаль дзясятак гадоў працуе жанчына, якую ўсе ведаюць і паважаюць. Ніякіх нараканняў ад людзей тут няма.

Скажу вам, што ў год збіраем 2 тоны малака на адну карову. І хоць у параўнанні з фермамі гэтая лічба не ўражвае, але для падсобных гаспадарак — добра. Акрамя гэтага, ад мінулага года мы плюсуем у аб'ёмах малака, і такая тэндэнцыя захоўваецца і сёлета. Так, колькасць кароў скарачаецца, але мы сталі збіраць не толькі ранішняе, але і вячэрняе малако. Цяпер адзін наш сельсавет здае тону малака штодзень.

Зразумела, у жыцці без шурпатасці не бывае. Што датычыцца стасункаў з заводам, то хацелася б мець прыборы вызначэння тлустасці больш добрай якасці. Вядома, кожны гаспадар сцвярджае, што менавіта яго карова і малако — самыя лепшыя, але ўсё вызначаюць лабараторныя аналізы. Так што гэтыя пытанні — жыццёвыя, і яны вырашаюцца.

Запісала Ілона ІВАНОВА.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 2 ліпеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць электрапрас, кухонны камбайн, тэлевізар або печ ЗВЧ. Розыгрыш прызоў адбудзецца **6 ліпеня 2010 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 16 ліпеня 2010 г.**

Дастаўку тэлевізараў і печы ЗВЧ ажыццяўляе рэдакцыя. Астатнія прызы можна атрымаць у рэдакцыі **па 30 верасня 2010 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года і пашпарта. **Пасля 30 верасня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 22.05.10 г.

Тэрмін правядзення гульні — з 22.05.10 па 30.09.10.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1694 ад 13.05.10, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

3 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2010 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____

(аддзяленне сувязі)

_____ **на III кв. або 2-е паўг. 2010 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____

(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2010 год на месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(паштовы індэкс) (адрас) (горад, населены пункт)

ПВ | месца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:

(індэкс выдання)

«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт | падпіскі _____ руб. | пераадрасоўкі _____ руб. | Колькасць камплектаў

на 2010 год на месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(паштовы індэкс) (адрас) (горад, населены пункт)

І ПАПЛЫВЕ ПА ДЗВІНЕ ПАРАХОД...

У Віцебску ў гэтыя дні актыўна паглыбляюць фарватар Заходняй Дзвіны. Па ініцыятыве губернатара вобласці ў старажытным горадзе аднаўляецца суднаходства.

Работы і па выхадных днях вядуць спецыялісты са спецыялізаванага пінскага прадпрыемства. Дзякуючы іх напружанай працы ўжо зусім хутка можна будзе праводзіць захапляльныя экскурсіі па рацэ. Для гэтага запланавана запусціць два цеплаходы (іх будуюць таксама ў Пінску). Запланавана таксама зрабіць і некалькі прычалаў. Першыя тры павінны адкрыцца ўжо перад пачаткам міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». І жыхары горада, і госці «базару» змогуць ужо ў ліпені адправіцца ў воднае падарожжа.

А ў раёне, дзе цячэ Віцьба, будуецца лодачная станцыя для арганізацыі пракату малых суднаў. Віцьба таксама паглыбляецца, яе берагі добраўпарадкоўваюцца і «апранаюцца» ў камень.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ДЗЕ ЎЗЯЦЬ І КАМУ АДДАЦЬ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Падаткі

З падаткамі на зямлю і на нерухомасць, якія з'яўляюцца адной з асноўных крыніц папаўнення сельсавецкага бюджэту, таксама ўзніклі праблемы, прычым там, дзе іх ніхто не чакаў. З 1 сакавіка пачалі дзейнічаць папраўкі да новага Падатковага кодэкса. У адпаведнасці з імі, пакуль чалавек не пабудаваўся (а завяршэннем будаўніцтва лічыцца ўвод дома ў эксплуатацыю), ён вызваляецца ад усіх падаткаў, нават ад падатку на зямлю. Затое для тых, хто ўжо ўвёў дом у эксплуатацыю, велічыня зямельнага падатку павялічылася ў некалькі разоў (у залежнасці ад кадастравай ацэнкі зямлі). Калі дадаць да гэтага падатак на нерухомасць, ды яшчэ страхоўку, для чалавека атрымаецца дастаткова «кругленькая» сума — ад 800 тысяч да 1 мільёна.

Але нашы грамадзяне і тут праявілі зайздросную «кемлівасць». Зразумеўшы, чым пагражае ім увод дома ў эксплуатацыю, яны цяпер імкнуцца адцягнуць гэты момант па максімуму. Інакш кажучы, чалавек у доме даўно жыве, карыстаецца газам, вадой і электрычнасцю, а дом у эксплуатацыю не ўведзены.

— Атрымліваецца, што тэрмін уводу дома залежыць толькі ад сумленнасці гаспадара. Калі ён захоча гэта зрабіць, тады і зробіць. Без праблем дом «уводзіцца» толькі тады, калі гаспадару неабходна прапісацца ці кагосьці прапісаць. Астатнім — гэта пераважна мінчане — прапіска непатрэбная, і яны «цягнуць гуму» да апошняга, — гаворыць Сяргей Жолуд.

У выніку сельвыканкам губляе сотні тысяч рублёў, якія можна было б выкарыстаць у інтарэсах сваёй тэрыторыі. Пакараць такіх хітруноў немагчыма — законам гэта не прадугледжана. Застаецца хадзіць па дварах і ўгаворваць: будзь чалавекам, «увядзі» дом.

Зямля

За мінулы год у Каладзішчанскім сельсавеце выдзелілі пад будаўніцтва жылля аж 1.300 участкаў. (Больш за іншыя сельсаветы Мінскага раёна.) З іх 900 — адабраныя ў грамадзян, якія за доўгі час так і не аформілі ў кадастравым агенцтве дакументы на права ўласнасці.

Ёсць выпадкі, калі рашэнне аб выдзяленні зямлі было выдадзена на рукі... у 1995 годзе. Пятнаццаць гадоў чалавек гэты ўчастак не чапаў. Пазалетась па рашэнні райвыканкама зямлю адабралі і выдзелілі іншаму грамадзяніну, які меў патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Цяпер былы гаспадар «спахапіўся» і падаў заяву ў суд, каб вярнуць «уласнасць».

Але мясцовай уладзе да судовых разбіральніцтваў не прывыкаць. Яшчэ не так даўно падобных судовых спраў налічвалася 84, цяпер іх засталося толькі 12. Тым не менш выдзяленне зямельных участкаў пад будаўніцтва жылых дамоў у сельсавеце часова прыпыненае.

— Нам трэба крыху «разгрэбці» гэты паток, а потым пачнём выдзяляць участкі зноў, — уносіць яснасць у зямельнае пытанне Сяргей Васільевіч.

Размова ў гэтым выпадку ідзе менавіта пра адабраныя ўчасткі, паколькі іншай зямлі, новых масіваў у сельсавеце няма. І пакуль не будуць расстаўленыя ўсе кропкі над «і» ў спрэчках з былымі гаспадарамі, чаргавікам (якія не хочуць кватэру ў ЖБК, а хочуць менавіта катэдж) давядзецца пачакаць. Іншага варыянту ў іх няма.

— А навошта нам сёння шукаць новыя зямельныя плошчы пад будаўніцтва, калі невядома, праз які час будуць забяспечаныя інфраструктурай існуючыя забудовы? — задае рэзоннае пытанне Сяргей Жолуд.

І з гэтым нельга не пагадзіцца. Перш чым нешта выдзяляць, неабходна прывесці ў парадак тое, што ёсць: даць людзям дарогі, газ і святло. Каладзішчанскі сельвыканкам папрасіў вышэйшыя інстанцыі хутчэй вызначыцца хаця б з тэрмінам — праз год усё гэта з'явіцца ці праз дзесяць? Людзі не могуць чакаць вечна, і ім патрэбны канкрэтны адказ.

Наталля КАРПЕНКА.

Мінскі раён.

НАМ ГРОШЫ НЕ ТРЭБА — РАБОТУ ДАВАЙ?

Ва ўпраўленні па працы прапануюць вакансіі з зарплатай... ніжэй за бюджэт пражыткавага мінімуму

Іншы раз пошук работы ператвараецца ў вельмі складаны і даволі працяглы занятак. Чалавек проста не ведае, з чаго яму пачаць: з аб'яў у газетах, паходаў на гутаркі ці пошуку карысных знаёмых, якія могуць закінуць слоўца на патрэбным прадпрыемстве ці фірме... Здаецца, тут усе метады падыходзяць... Быў бы вынік! Аднак часта даводзіцца сутыкацца з цвёрдай упэўненасцю суразмоўцы: па аб'яве працаўладкоўвацца бессэнсоўна, бо нічога добрага няма там, дзе не знайшлося ахвотнікаў па пратэкцыі заняць свабодную вакансію. Ды і наймальніку нецікава купляць ката ў мяшку — куды выгодней прыняць работніка з надзейнай рэкамендацыяй. Але ж што сёння можа наогул прапанаваць брэсцкі рынак працы?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сеткавы маркетынг не прапаноўваць!

У першую чаргу ў вочы кідаецца цэлы шэраг аб'яў, дзе патрабуюцца рабочыя самых розных будаўнічых спецыяльнасцяў: муляры, плітачнікі, электрамантажнікі, маляры-тынкоўшчыкі, цесляры, машыністы кранаў, страхары... Хутчэй за ўсё, няма сёння праблем з працаўладкаваннем у прарабаў, інжынераў-будаўнікоў і шчасліваых уладальнікаў іншых падобных да гэтых спецыяльнасцяў. Пры запрашэнні на працу ім нярэдка адразу абяцаюць высокую аплату. Хоць наўрад ці яна можа параўноўвацца з даходамі тых, хто прапануе свае паслугі па рамонце кватэр. Вось дзе залатая жыла!

На другое месца па запатрабаванасці, напэўна, можна паставіць усялякіх прадаўцоў, касіраў, прадаўцоў-кансультантаў, менеджараў па продажах і гандлёвых агентаў. Безумоўна, прадавец прадаўцу — розніца, як і грашовыя прапановы за іх працу і вызначаныя наймальнікам патрабаванні. Між іншым, адна мая знаёмая, запаўшы на мудрагелістае слова «менеджар», сама таго не падазраючы, трапіла «ў сеткі» таго самага праслаўтага сеткавага маркетынгу, якога заўсёды панічна баялася. Ды й не толькі яна... Ледзьве не кожная дама, якая хоча атрымаць работу, лічыць сваім абавязкам указаць у аб'яве: сеткавы маркетынг і інтым не прапаноўваць. Нават цікава: яны гэта пішуць на ўсялякі выпадак ці гэта дыктуе іх горкі вопыт?

Але ж вернемся да «нашых баранаў»... Маёй знаёмай давялося займацца продажам касметыкі, вандруючы па розных прадпрыемствах і фірмах з сумкай, напоўненай таварам. Некалі такіх людзей называлі проста — карабейнікі. Жанчына не адразу зразумела, куды трапіла, і нават нейкі час мела надзею на атрыманне абяцанай зарплаты. Пакуль ёй усё папулярна не растлумачылі: значэнне мае толькі канчатковы вынік, які залежыць ад колькасці прададзенага тавару.

Не ідзіце ў «нелегалы»

Быў перыяд, калі аб'явы пра тое, што нейкай фірме патрабуюцца швачкі (закройшчыкі, мастакі-мадэльеры, канструктары і г.д.) на старонках газет амаль што не з'яўляліся. Хоць да крызісу швейны бізнэс у Брэсце працвітаў. Заработная плата на некаторых прадпрыемствах была даволі высокай. Зараз сітуацыя амаль што нармалізавалася, і на газетных старонках прапаноў дастаткова. Аднак ёсць тут адно «але»... У некаторых швейных фірмах працу прапануюць, а вось афарміць, як таго патрабуе працоўнае заканадаўства, «забываюць»... Цікава, што пры гэтым падаходны падатак з заработнай платы бяруць спраўна. Калі заікнешся пра запіс у працоўнай кніжцы, у адказ рызыкуеш пачуць: маўляў, нікога тут не трымаюць сілком.

Зыходзячы з таго, якая зарплата дадаецца сёння да існуючых у Брэсце вакансій інжынераў (паводле інфармацыі мясцовага ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне), нічога не мяняецца... Не думаю, што такія прапановы цікавыя добраму спецыялісту з вышэйшай адукацыяй — ад 171 (паўстаўкі) да 700 тысяч рублёў. А, напрыклад, прыбіральшчыку службовых і вытворчых памяшканняў прызначана аплата ў 250 тысяч. Не так даўно суседка ўладкоўвалася на гэтую «пасаду», дык ёй прапанавалі зарплату разы ў тры вышэйшую. Але ж канкурэнцыя, па яе словах, была настолькі жорсткая і вылучаліся такія патрабаванні, быццам выбіралі не кандыдата драіць падлогу і выціраць пыл, а прынамсі дырэктара.

Каму патрэбны такія вакансіі?!

А вось вакансіі ўрачоў рознай спецыялізацыі для працы ў абласным цэнтры абяцаюць зарплату ад 373 да 600 тысяч. Каментарыі, як гаворыцца, лішнія. У адной гаспадарцы ў суседнім ад Брэста раёне патрабаваліся два вадзіцелі і галоўны ветэрынарны ўрач. Дык вось, заработная плата тым, хто круціць баранку, адмерана ў 850 тыс. рублёў, а галоўнаму ўрачу прапаноўвалася ўсяго 589 тысяч. Можа, пасля гэтага беспрацоўным урачам, а заадно і ветэрынарам ёсць сэнс пераквалiфікавацца ў вадзіцелі, і такім чынам вырашыць свае матэрыяльныя праблемы?!

Сёння афіцыйна ўстаноўлены бюджэт пражыткавага мінімуму раўняецца 266 тыс. 230 рублёў, для працаздольнага насельніцтва — 284 тыс. 860 рублям. Але ў пераліку вакансій, якія мае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Брэсцкага гарвыканкама, нямала знойдзецца такіх, дзе заработная плата нават ніжэй за названыя лічбы. Напрыклад, памочніку выхавацеля дзіцячага садка прапаноўваюць 230 і 250 тысяч, повару — 222 тысячы, медыцынскай сястры — усяго 170 тыс. рублёў. Работадаўца, напэўна, лічыць, што матарысту-рулявому выратавальнага катара хопіць на жыццё 205 тыс. рублёў у месяц, а механіку-капітану з вышэйшай адукацыяй — 230 тысяч. Пасля гэтага рабочы па мыцці і рамонце спецадзення (без адукацыі, вядома) павінен лічыць зарплату ў 250 тыс. рублёў за вялікае шчасце.

Цікаўлюся ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Брэсцкага гарвыканкама, чаму людзям прапаноўваюць працу, дзе зарплата ніжэй за бюджэт пражыткавага мінімуму?

— Неаднойчы ўжо размаўляла на гэтую тэму з кадравікамі прадпрыемстваў, якія падаюць нам інфармацыю аб свабодных вакансіях, — тлумачыць загадчык сектара праблем занятасці і арганізацыі новых працоўных месцаў Ларыса Ліпская. — Кожны раз яны спасылаюцца на штатны расклад: маўляў, нічога змяніць нельга. Зразумела, вакансіі з такой заработнай платай «завісаюць» і попытам не карыстаюцца. Бывае, што праз нейкі час аплата працы злёгку карэкціруецца ў бок павелічэння, але гэта здараецца вельмі рэдка.

Калі ёсць пасады з такой зарплатай, то, вядома, і на іх нехта павінен працаваць? Дзеля чаго ж наогул устанаўліваюцца гэтыя самыя пражытковыя мінімумы, калі яны — усё роўна не мяжа? Па афіцыйных звестках, узровень зарэгістраванага беспрацоўя ў Брэсце звычайна 0,7-0,8 працэнта, а колькасць вакансій перавышае колькасць беспрацоўных... Каго спрабуем падмануць фальшывым дабрабытам?

Ала КАВАЛЁВА.

НЕ «ПРАСПАЦЬ» ГОД ЯКАСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Летась Магілёўскі аблвыканкам і аблсавет правялі паказальны семінар-вучобу на прыкладзе Чэрыкаўскага раёна, дзе паказалі, як трэба працаваць па навядзенні парадку на зямлі. Хацеў бы пакрытыкаваць — дык няма за што! Зрабілі ўсё, як належыць, усе кінутыя землі ўключылі ў севазварот. У гэтай рабоце былі задзейнічаны ўсе — і сельскія Саветы, і кіраўнікі ўсіх узроўняў, і грамадскасць. Гэтую работу трэба працягваць і ў бягучым годзе, аб'яўленым Годам якасці. У дачыненні да аграрнага сектара — гэта паляпшэнне работы на зямлі.

Мы выйшлі стабільна на ўраджайнасць 35 цэнтнераў з гектара амбарнай вагі. Можна выходзіць на 50 цэнтнераў з гектара сухога збожжа. Ва ўсіх раёнах навучыліся атрымліваць вельмі высокія ўраджаі. Сёння мы знаходзімся на якасна новым узроўні. Гэтаму паспрыяла і вырашэнне тэхнічнага забеспячэння аграрнага сектара, хоць напачатку тут было вельмі шмат складанасцяў.

З улікам далейшых перспектыў развіцця і экспартнай арыентацыі кіраўнік дзяржавы паставіў задачу павялічыць экспарт прадуктаў харчавання да 10 мільярдаў доларaў (у 4 разы адносна таго, што мы маем сёння). Гэта запатрабуе новых падыходаў і новых тэхналогій, і тое, што сёння напрацавана, можа служыць фундаментам.

Калі раней мы пастаўлялі прадукты харчавання толькі ў Расію, то цяпер — у 67 краін свету. З улікам росту народанасельніцтва планеты, прадукты харчавання — самы выгадны бізнэс.

Што датычыцца развіцця прамысловага патэнцыялу, галоўны ўпор трэба рабіць на мадэрнізацыю і рэканструкцыю прадпрыемстваў, выходзіць на канкурэнтаздольныя віды прадукцыі. У перспектыве неабходна выводзіць заробак усіх прамысловых прадпрыемстваў на еўрапейскі ўзровень. А для гэтага трэба арыентавацца на вытворчасць прадукцыі, запатрабаванай на рынку.

Вадзім Папоў спыніўся і на наступствах сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу. Ён патлумачыў, што крызіс вельмі балюча ўдарыў па нашай краіне. І прычына — у адкрытасці беларускай эканомікі. Тры чвэрці беларускага валавога ўнутранага прадукту штогод ідзе на экспарт. Беларусь сёння гандлюе са 180 краінамі планеты. Наша эканоміка з'яўляецца самай адкрытай у свеце, а значыць, у большай ступені залежыць ад эканомік іншых краін. Для выпраўлення сітуацыі частку прадукцыі наша дзяржава перавяла на ўнутраны рынак і перажыла крызіс з меншымі, чым магло б быць, стратамі.

— Паводле заключэнняў экспертаў міжнародных фінансавых структур, крызіс для Беларусі прайшоў, эканоміка развіваецца. За 4 месяцы гэтага года валавы ўнутраны прадукт вырас на 6 працэнтаў, па прамысловасці — на 6 працэнтаў, па аграрным сектары (без уліку асабістых падсобных гаспадарак) — на 7 працэнтаў.

Той факт, што эканоміка ажывае, пацвярджае і гандаль. Тэмп росту ўнутранага гандлю склаў 13-14 працэнтаў, экспарт — 30 працэнтаў. Даходы насельніцтва выраслі на 6,8 працэнта, рэальны заробак — на 3 працэнты, банкаўскія зберажэнні насельніцтва з пачатку года — на 7 працэнтаў і перавысілі 19 трыльёнаў рублёў. Гэта вельмі істотны рэзерв для фінансавання банкаўскай сістэмы. Месячная інфляцыя не перавышае 0,8 працэнтаў.

Усё гэта гаворыць пра тое, што эканоміка сапраўды прайшла дно крызісу і пачала рухацца наперад. Сёння ўжо ёсць упэўненасць у тым, што прагнозныя паказчыкі гэтага года будуць выкананы. Перад аграрным сектарам Прэзідэнт паставіў задачу — выйсці па ўсіх параметрах на еўрапейскі ўзровень. Прамысловасці — выйсці на вытворчасць прадукцыі з расходам умоўнага паліва на еўрапейскі ўзровень, а для гэтага трэба скараціць затраты ў 2-4 разы.

Напрыканцы сустрэчы Вадзім Папоў нагадаў прысутным, што неўзабаве ўступіць у дзеянне новы закон Рэспублікі Беларусь «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні», у якім неабходна будзе дасканала разабрацца.

— Памятайце галоўнае: мы працуем не самі на сябе, а на карысць людзей, якія жывуць на пэўнай тэрыторыі. І дзейнічаць павінны выключна ў межах існуючага заканадаўства.

Інга МІНДАЛЁВА.

З ПОЛЬШЧЫ — У ПАРАХОНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Дэлегацыя прадстаўнікоў польскіх гмін пабывала нядаўна ў Пінскім раёне. Напачатку адбылася сустрэча з кіраўніцтвам раёна, госці выказалі жаданне наведаць мясцовы аддзел па надзвычайных сітуацыях і азнаёміцца з вопытам арганізацыі захавання бяспекі людзей і дапамогі ў надзвычайных сітуацыях. А затым выехалі ў Парахонскі сельсавет, дзе падрабязна знаёміліся як з арганізацыяй сельскагаспадарчай вытворчасці, так і з работай аб'ектаў сацыяльнага і бытавога прызначэння. Дэлегацыя гасцей таксама наведала пасёлак Лагішын, дзе прайшла сустрэча з актывістамі і сябрамі вясковага аддзела грамадскага аб'яднання «Саюза палякаў на Беларусі».

Яна СВЕТАВА.

Без тапачак і аўтамашыны

Жыхар Брэста вяртаўся з Польшчы і вырашыў праехаць па «зялёным» калідоры.

Пры праверцы ж аўтамашыны знайшлі трыкатажныя вырабы. А калі пачалі аглядаць мікрааўтобус з прычэпам больш старанна, то ў колах было знойдзена больш за паўтары сотні тапачак і спартыўныя касцюмы. Кантрабандны тавар і аўтамашыну канфіскавалі — да суда.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ГАСПАДАРКА — НА ДЗВЕ ВОБЛАСЦІ

Абласныя Саветы дэпутатаў Брэсцкай і Гомельскай вобласці на сваіх сесіях прынялі сумеснае рашэнне аб перадачы часткі паляўнічых угоддзяў на тэрыторыі Столінскага раёна Брэсцкай вобласці, а таксама зямель Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці ў арэнду адкрытаму акцыянернаму таварыству «Тураўшчына».

Раней паляўнічыя ўгоддзі Столінскага раёна належалі Брэсцкаму лесагаспадарчаму аб'яднанню і знаходзіліся ў так званым фондзе запасу, гэта значыць, не здаваліся ў арэнду. А тамтэйшы лес уяўляе сабой гушчар з вялікай колькасцю забалочаных участкаў. Лес гэты працягваецца і на тэрыторыі Жыткавіцкага раёна і ўяўляе сабой адзіны біялагічны масіў. На Гомельшчыне лес таксама асабліва не выкарыстоўваўся. А для паляўнічай гаспадаркі прырода стварыла тут найлепшыя ўмовы. Апошняе і вырашыла скарыстаць ААТ «Тураўшчына». Акцыянернае таварыства створана летась на базе былой жыткавіцкай гаспадаркі «Агра-Прыпяць» з удзелам Белаграпрамбанка. У рамках праграмы развіцця Палесся тут плануецца стварыць сучасную інфраструктуру для заняткаў аграрным і экалагічным турызмам. А паслугі па арганізацыі паляванне і рыбалоўства, трэба разумець, дазволяць зарабіць сродкі на будаўніцтва названай інфраструктуры.

У планах новай гаспадаркі таксама развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці: развядзенне мясных парод жывёлы, укараненне перадавых тэхналогій раслінаводства, а таксама завод па перапрацоўцы малака, лінія па замарозцы агародніны і многае іншае. Ну і адпаведныя з гэтым рабочыя месцы.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

Аукцион состоится 27 июля 2010 г. в 11.00 в г. Минске по ул. Чкалова, 5.

Организатор аукциона: фонд «Минскоблгосимущество», 220039, г. Минск, ул. Чкалова, 5, тел. (8017) 500 47 10, (8017) 224 39 76
Арендодатель земельного участка: Борисовский районный исполнительный комитет, 222120, Минская обл., г. Борисов, ул. Чапаева, 6

Предмет аукциона, целевое назначение, адрес, кадастровый номер земельного участка	Площадь земельного участка, га	Срок аренды земельного участка, лет	Начальная цена продажи права аренды, руб.	Размер задатка, руб.
Право заключения договора аренды земельного участка для строительства транспортно-логистического центра, расположенного по адресу: Минская область, Борисовский район, Неманицкий с/с в районе д. Ланковщина на 449 км участка автомобильной дороги М-1/Е30 и 60 км участка автомобильной дороги Р-53. Кадастровый номер: 620800000001000698.	30,00	51	57 774 717	5 000 000

Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона линии электропередачи напряжением свыше 1000 вольт площадью – 0,4620 га и охранная зона линии связи и радиофикации площадью – 0,1648 га. Подъезд к земельному участку будет осуществляться по существующей дорожной сети. Для инженерного обеспечения возможно использование существующих сетей.

Условия для победителя аукциона, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона:

внести плату за право заключения договора аренды земельного участка;

возместить расходы, связанные с проведением аукциона (в сумме 900 тыс. рублей) и формированием земельного участка для размещения объекта строительства, в том числе государственной регистрацией изменения земельного участка республиканского унитарного сельскохозяйственного производственного предприятия «Свинокомплекс Борисовский» и в отношении создания земельного участка (в сумме 1 177,0 тыс. рублей);

возместить в установленном порядке убытки в сумме 73 659 820 рублей, причиненные республиканскому унитарному сельскохозяйственному производственному предприятию «Свинокомплекс Борисовский» изъятием земельного участка;

возместить потери сельскохозяйственного производства в сумме 1 193 455 200 рублей, вызванное изъятием 30,00 га сельскохозяйственных земель для использования в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства, перечислив их на транзитный счет инспекции Министерства по налогам и сборам по месту регистрации в качестве плательщика;

заключить с Борисовским райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить в установленном порядке государственную регистрацию права на этот участок; в течение шести месяцев со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации возникновения права на предоставленный земельный участок приступить к занятию данного участка; в месячный срок после государственной регистрации договора аренды земельного участка получить в Борисовском райисполкоме архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства и о разрешении проектирования этого объекта; разработать и утвердить в установленном порядке проектную документацию на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; приступить к строительству объекта после утверждения строительного проекта и получения разрешения на производство строительно-монтажных работ; снять перед началом строительства на занимаемом земельном участке плодородный слой почвы и использовать его согласно проекту рекультивации; осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией и согласованные с Минским облисполкомом.

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, а также заверенную копию платежного поручения о внесении задатка. Кроме того, организатору аукциона представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462. Условием проведения аукциона является наличие не менее двух участников. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявка (заявление) на участие в нем подана только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Возможность ознакомления с земельным участком обеспечивает арендодатель земельного участка в срок до 21 июля 2010 г.

Задаток для участия в аукционе перечисляется в срок по 21 июля 2010 года включительно на расчетный счет **№ 3642000000028** в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНП 100128686, получатель платежа – фонд «Минскоблгосимущество». Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. **Минск, ул. Чкалова, 5, к. 310, 312, тел. (8 017) 224 39 76, (8 017) 500 47 10. Начало приема заявлений 10 июня 2010 г. Окончание приема заявлений 21 июля 2010 г. до 17.00.**

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»
Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.
Адказная за выпуск Наталля КАРПЕНКА.
Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, дэпутат Смалявіцкага раённага Савета дэпутатаў Мінскай вобласці
АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 21 03;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.

РЫБАЛКА З КОЛАЎ



в. Таль Любанскага раёна. Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Аперацыю перанясе не кожны

ХІРУРГАМ 4-й гарадской клінічнай бальніцы даводзіцца адмаўляць у аперацыі кожнаму трэцяму хвораму, які пакутуе ад атлусцення, паведаміў загадчык аддзялення агульнай хірургіі 4-й гарадской клінічнай бальніцы Мікалай Дорах. Ён жа кіруе гарадскім цэнтрам герніялогіі і барыятрычнай хірургіі, што ў 4-й клініцы. Менавіта сюды звяртаюцца па медыцынскую дапамогу поўныя людзі.

Адмаўляюць урачы патэнцыйным пацыентам (некаторыя важаць больш за 200 кілаграмаў) з-за дрэннай работы сэрца, нырак, печані. «Аперацыі праходзяць пад агульным наркозам, і пацыент можа яе не перанесці», — удакладніў суразмоўца. Цікава, што якіх-небудзь абмежаванняў па вазе не існуе. Сталічныя хірургі здольныя пазбавіць ад лішкаў і 300-кілаграмовых людзей пры ўмове, што ў іх нармальна працуюць органы і сістэмы.

Вольга ГРЫГОР'ЕВА, «Мінск—Навіны».

Прыміце да ўвагі

НА ВУЛІЦЫ СПЯКОТА? РЫЗЫКУЕЦЕ ПРАСТУДЗІЦЦА!

Усе мы прывыклі, што ВРЗ — сезонная хвароба, якая падпільноўвае нас, як правіла, позняй восенню, зімой або ранняй вясной... Але любы ўрач ведае, што прастудзіцца летам, асабліва ў спякоту, значна лягчэй. Бо ў халодны перыяд года мы напагатове і ўсяляк стараемся засцерагчы арганізм ад пераахаладжэння. А летам расслабляемся — і вось вынік! Якім жа чынам засцерагчыся ад летняй прастуды?

З-за чаго мы часцей за ўсё прастуджваемся ў гарачыя дзянькі?

1. Скразнякі. У спякоту мы нярэдка трымаем адчыненымі дзверы і вокны: нам гэта здаецца бяспечным. А дарэмна. Нават калі на вуліцы 30 градусаў у цені, вас можа прадзьмуць так сама, як і ў халодны дзень. Дарэчы, прадзьмуць можа і падчас паездкі ў электрычцы або аўто, калі вы сядзіце ля адчыненага акна. Таму вазьміце за правіла не адчыняць адначасова дзверы і акно ў пакоі, зачыняць акно пры моцным ветры і не сядзець у месцах, якія прадзімаюцца.

2. Вентылятары і кандыцыянеры. Улічыце: знаходзячыся ў зоне магутнага патоку халоднага паветра, вы лёгка можаце схапіць не толькі прастуду, але і запаленне лёгкіх.

Калі збіраецеся ў супермаркет, вазьміце з сабой шарсцяную кофту: у спякоту ў гандлёвай зале, абсталяванай кандыцыянерамі, тэмпература можа быць градусаў на дзесяць ніжэйшай, чым на вуліцы. Здагадваецеся, што можа адбыцца з вамі ў выніку такога рэзкага перападу тэмператур? Таму, калі вы сабраліся размясціцца ў памяшканні, дзе працуе кандыцыянер, апранайцеся цяплей.

3. Марожанае і халодныя напоі. У спёку так хочацца халоднень кага... А між тым, калі вы ясце марожанае або п'яце ледзяное піва, сок або кактэйль, адбываецца рэзкае ахаладжэнне верхніх дыхальных шляхоў, і гэта правакуе ВРЗ. Безумоўна, ніхто не агітуе зусім адмовіцца ад «халоднага задавальнення». Але пастарайцеся хаця б есці марожанае не спяшаючыся, адкусваючы ад яго маленечкія кавалачкі. Напоі трэба піць дробнымі глыткамі, але не праз саломінку, каб вадкасць паспела сагрэцца ў поласці рота.

4. Купанне. Пераахаладжэнне падчас купання можа стаць прычынай не толькі ВРЗ, але і іншых хваробаў. Каб гэтага не здарылася, прытрымлівайцеся наступных правілаў.

Купайцеся толькі пры тэмпературы вады вышэй за 20—22 градусы. Знаходзіцца ў вадаёме без перапынку варта не больш як 15 хвілін. Пасля выхаду на сушу неабходна добра выцерціся і пераапрануцца.

Прыкметай пераахаладжэння з'яўляюцца дрыжыкі і «гусіная скура». У такім выпадку абавязкова што-небудзь з'ешце і па магчымасці выпіце гарачы напой — гарбату або каву. Гэта сагрэе вас знутры і дапаможа пазбегнуць прастуды.

Безумоўна, захварэць гарачым летам крыўдна. Але калі ўжо так атрымалася, пастарайцеся як мага хутчэй вылечыцца. Не чакайце, пакуль прастуда па-сапраўднаму заявіць пра сябе.

«Захапіць» прастуду ў самым пачатку можна пры дапамозе імунамадулятараў. Якія падыдуць менавіта вам, падкажа ўрач.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Калі ж з'явіўся насмарк, лепш за ўсё надзерці на тарцы буракі, выціснуць сок (можна ўзяць сок алоэ) і закапваць яго па 2—3 кроплі ў кожную ноздру рэгулярна на працягу дня. Альбо: падпаліце сухую сцяблінку ад галоўкі часнаку, нахіліцеся над ёй і, пакуль яна тлее, удыхайце дымок.

Пры болі ў горле карыстайцеся спрэямі для інгаляцыі, прымайце спецыяльныя пласцінкі і таблеткі для рассмоктвання, якія, дарэчы, вельмі зручна браць з сабой.

Не забывайце і пра паласканне для горла. Гэтую працэдуру варта праводзіць 5—7 разоў на дзень. Напрыклад, традыцыйны сродак — растварыць па 1 ч. лыжцы соды і солі ў шклянцы цёплай гатаванай вады і дадаць пару кропляў ёду. Эфектыўныя таксама раствор фурацыліну (адна таблетка на шклянку цёплай гатаванай вады), адвары рамонку і шалфею.

Калі крыху паднялася тэмпература, то не варта спяшацца прымаць гарачкапаніжальныя. Гэта толькі зацягне працэс. Лепш скарыстацца народным сродкам: выпіць свежапрыгатаваную сумесь лімоннага соку з мёдам. Карыснае і частае цёплае піццё: яно прымусіць вас пацець, а гэта садзейнічае зніжэнню тэмпературы і выводу таксінаў.

Ну а яшчэ выпрабаваны сродак вылечыць летнюю прастуду, якая адолела вас так недарэчы, — пагрэцца на сонейку. Толькі прыміце меры, каб скура не згарэла і галаву не напякло. Аднак калі ў вас высокая тэмпература, «падстаўляцца» сонцу не варта.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Лечымся без лекаў

ЧЫМ КАРЫСНАЯ ПЯТРУШКА?

Часцей за ўсё яе выкарыстоўваюць як прыправу або ўпрыгажэнне для страў. Але гэта далёка не ўсе яе добрыя якасці. Ужываючы пятрушку, вы засцерагаеце сябе ад хваробаў нырак, прастаты, язвы страўніка і іншых захворванняў унутраных органаў.

ЗВОНКУ

У лісцях пятрушкі шмат флаваноідаў — магутных антыаксідантаў, таму яе экстракт шырока выкарыстоўваюць у анты-эйдж-касметыцы (сродак для амаладжэння). Калі рэгулярна праціраць скуру сокам пятрушкі, можна прыкметна асвятліць рабаціннe і пігментныя плямы. Маска з малатага геркулесу і здробненай пятрушкі дапамагае пазбавіцца ад тлустага бляску. Каб узмацніць эфект, пасля змывання можна працерці твар кубікам лёду з адвару гэтай расліны. Ласьён з пятрушкай дапамагае пазбавіцца ад вугроў і запаленняў на скуры. Вітамін С у экстракце пятрушкі актывізуе сінтэз калагену, прадухіляе сухасць скуры і папярэджвае з'яўленне дачасных маршчын. Здробненая пятрушка, змешаная з тварагом, — цудоўная маска для ўвільгатнення сухой і абязводжанай скуры. Пятрушка актыўна прымяняецца ў вадатэрапіі: яе пах супакойвае, паляпшае настрой. Дастаткова пажаваць некалькі галінак пятрушкі, каб асвяжыць дыханне і адбіць пах часнаку, цыбулі, алкаголю. Валасам нададуць бляск апалоскванні з адвару кораня пятрушкі. Кашку з расцёртага зяленіва пятрушкі прыкладваюць да месцаў укусаў камароў, пчол, да нарываў — каб зняць запаленне, сверб і боль. Зяленіва пятрушкі валодае бактэрыцыдным дзеяннем, таму яго карысна жаваць пры захворваннях дзёсен. Адвар пятрушкі здымае пачырваненне і ацёчнасць скуры, асвяжае і танізуе яе.

ЗНУТРЫ

У пятрушцы прысутнічаюць вітаміны А, С, B_1, B_2, B_6, К, РР. Таксама яна багатая на жалеза, калій, магній, кальцый, фосфар.

Лісце пятрушкі ўтрымлівае ў 5 разоў больш вітаміну С, чым лімон і апельсін. 50 г травы забяспечваюць сутачную патрэбнасць у гэтым вітаміне. Пры цеплавой апрацоўцы пятрушка, у адрозненне ад іншых траў, не страчвае сваіх карысных уласцівасцяў, а яе смак нават узмацняецца. Адвар з пятрушкі дапамагае суняць боль пры цыстыце, а настой здаўна лічыцца добрым сродкам для барацьбы з пахмеллем. Сок пятрушкі паляпшае работу шчытападобнай залозы і надныračнікаў. Сумесь з сокаў пятрушкі і лімона — добрае мачагоннае і хутка здымае ацёкі. Настой і адвар пятрушкі карысны кормячым мамам для паляпшэння лактацыі (па 1—2 глыткі кожную гадзіну). Кактэйль з сокаў пятрушкі і буракоў дапамагае пры балючых менструацыях, калі піць яго рэгулярна. Сумесь са здробненай пятрушкі, кефіру, імбіру і зубка часнаку — выдатны сродак для спальвання тлушчу. Фоліевая кіслата, якой шмат у пятрушцы, удзельнічае ў рэгуляванні дзялення клетак і важная для прафілактыкі раку. Пятрушка ўтрымлівае фермент інулін, які валодае здольнасцю зніжаць узровень цукру і халестэрыну ў крыві. Гэтая расліна таксама аказвае на арганізм чалавека крывятворнае ўздзеянне і рэгулюе ўтрыманне ў крыві эрытрацытаў і лейкацытаў. Яшчэ ў даўнину хворым на белакроўе рэкамендавалі есці пятрушку. Тым жа, хто хоча ачысціць свой арганізм ад шлакаў і шкодных рэчываў, варта штодзень на працягу месяца выпіваць па шклянцы настою лісця пятрушкі. Добра дзейнічае таксама адвар кораня і насення расліны, але доза прыёму павінна быць у гэтым выпадку зменшана ўдвая.

Увага! Пятрушку не рэкамендуецца ўжываць у вялікай колькасці падчас цяжарнасці, пры нефрыце, мочакаменнай хваробе.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Народныя рэцэпты

● *Пры ацёках: 150 г свежай пятрушкі нарэзаць, пакласці ў каструльку, заліць 0,5 л малака. Накрыць, паставіць у духоўку, каб тушылася. Трымаць да той пары пакуль аб'ём малака не зменшыцца ўдвая. Далей адвар працадзіць. Прымаць па 1 ст. лыжцы кожную гадзіну.*

● *Пры прастатыце: свежую зеляніну пятрушкі памыць, дробна парэзаць. Поўную сталовую лыжку заліць 1/2 шклянкі крутога кіпеню, пакінуць на ноч (прыкладна на 10 гадзін). Раніцай працадзіць. Піць па 1 ст. лыжцы 4 разы на дзень за паўгадзіны да яды.*

● *Пры цыстыце: здрабніць у парашок 4 ч. лыжкі насення пятрушкі, заліць 1 шклянкай кіпеню і кіпяціць на слабым агні 10—12 хвілін. Пасля астывання працадзіць. Прымаць па 1 ст. лыжцы 4—6 разоў на дзень.*

Дыскусійная трыбуна

З КІМ І ПРА ШТО СПРАЧАЕМСЯ?

У НУМАРЫ газеты за 2 чэрвеня звярнуў на сябе ўвагу артыкул Сымона Свістуновіча «Сусветная культура ці рэлігійная?». Звярнуў як бліскучы ўзор спрэчкі не пра тое. Каб зрабіць дыскусію больш празрыстай, сцісла сфармулюем зыходныя пазіцыі аўтара.

1. Бліжэйшыя суседзі выказваюцца за рэлігійную культуру ў школе, але гэта пенсіянеры, а таксама матальшчыцы-прадзільшчыцы. Іншая справа, меркаванне педагога і ананімнай дзяржслужачай — цяпер усё ясна. Рэлігійная культура замест сусветнай для таго, каб царкве было куды падзець тэолагаў.

2. Увядзенне выкладання рэлігіі ў школе (зверніце ўвагу на падмену паняццяў — не рэлігійнай культуры, а рэлігіі!) нанясе ўдар па сістэме адукацыі, бо яна з савецкіх часоў будуецца на матэрыялістычным падмурку. А прыродазнаўства (яно таксама матэрыялістычнае) з рэлігійным светапоглядам несумяшчальнае. Што будзе з псіхікай нашых дзяцей? І ўвогуле, «школа абавязаная даваць дзецям веды, развіваць іх кругагляд, а не займацца рэлігійным выхаваннем».

3. Да пасляваеннага адраджэння Германіі рэлігійная адукацыя дачынення не мае, паколькі ўсё вырашалі план Маршала і фінансавыя ўліванні Амерыкі. І ўвогуле, 80 % немцаў лічаць сябе няверуючымі.

4. Свабода сумлення (якога — толькі дыялектыка-матэрыялістычнага?) гарантаваная Канстытуцыяй. Я буду жыць сёння і зараз, і мяне не цікавяць вашы ўяўленні пра вечнае жыццё пасля смерці. Маім дзецям і ўнукам не трэба навязваць тое, што я пакуль не магу прыняць (г.зн. знаёмства з рэлігійнай культурай).

5. Няма чаго царкве рабіць у чужой парафіі (г.зн. у школе). Балазе, сярод вернікаў хапае людзей з анамальнымі паводзінамі (ці вынікае адсюль, што задача выхавання нармальных паводзінаў матэрыялістаў ужо паспяхова вырашаная?).

Усё гэта было б смешна, калі б не было так сумна і не дэманстравала логіку многіх апанентаў выкладання асноў рэлігійнай культуры ў школе.

Пачнём па парадку (прапусціўшы пра матальшчыц-прадзільшчыц — гэта ўжо на сумленні аўтара артыкула).

Даволі дзіўна, што аўтар, прэтэндуючы на паслядоўнасць, перажывае за сусветную мастацкую культуру ў школе. Калі трымацца логікі п.3 аргументацыі — дабрабыт краіны забяспечваюць не людзі, а чужыя фінансавыя ўліванні — то трэба сапраўды зрабіць выснову, што ў прагматычнай школе ні для якой культуры (ні сусветнай, ні рэлігійнай) месца быць не можа. Дарагі спадар С. Свістуновіч! Не трэба супрацьпастаўляць сусветную мастацкую і рэлігійную культуру. Ім абедзьвум, я глыбока перакананы, павінна быць месца ў школе.

Дарэчы, што застанецца ад сусветнай культуры, калі адняць з яе ўсё, так або інакш звязанае з рэлігіяй? Рэлігійныя вытокі шэрагу культурных шэдэўраў заслугоўваюць таго, каб кваліфікавана расказаць пра іх вучням. І гэтае пытанне — на вялікі жаль, зараз звернутае толькі да агульнай эрудыцыі і сумлення педагога — будзе стаяць датуль, пакуль школьнікаў на ўроках беларускай літаратуры будуць знаёміць з прадмовай Францыска Скарыны да старазаветнай Кнігі Юдыф, а на ўроках сусветнай — са «Злачынствам і пакараннем» Дастаеўскага, дзе Раскольнікаў патрабуе ад Соні прачытаць яму з Евангелля «аб уваскрашэнні Лазара».

Цяпер пра матэрыялістычны светапогляд. З якога замшэлага падручніка па марксісцка-ленінскай філасофіі аўтар выцягнуў аргумент пра тое, што навуковы светапогляд абавязаны быць матэрыялістычным і таму несумяшчальны з рэлігійным? Не ўдаючыся ў філасофскія тонкасці, хацелася б усё-такі, каб аўтар задумаўся над трыма акалічнасцямі.

Першая. Існаванне матэрыяльнага свету ніяк не пярэчыць рэлігійнаму светапогляду і роўна таксама яму не пярэчыць права вучоных гэты свет вывучаць.

Другая. Велізарная колькасць даследчыкаў нават у другой палове XX стагоддзя была людзьмі глыбока веруючымі (роўна гэтак жа, як і іх велізарная колькасць была людзьмі няверуючымі). І яны не хавалі гэтую акалічнасць. Нобелеўскі лаўрэат па фізіцы Ч. Таунс, акадэмік РАН і РАМН, доктар псіхалагічных навук і доктар медыцынскіх навук Н.П. Бехцерава, фізікі з сусветным імем М. Борн, У. Гейзенберг і (зусім жах!) сам Альберт Эйнштэйн (спіс выдатных даследчыкаў, якія падзяляюць рэлігійныя перакананні, можа працягвацца вельмі і вельмі доўга.) Дарэчы, хачу засмуціць спадара С. Свістуновіча: атэізм — гэта тая ж рэлігія, якая толькі прыняла за выходнае веру ў адсутнасць Бога. Так што ён таксама глыбока рэлігійны чалавек.

Трэцяя. Як мне здалося, знаёмства майго апанента з Бібліяй затрымалася на ўзроўні курса так званага навуковага атэізму, які выдзіраў з кантэксту Біблії асобныя фразы і эпізоды, даваў ім сваю атэістычную інтэрпрэтацыю, а потым яе (гэтую інтэрпрэтацыю) і высмейваў, выдаючы яе за факт рэлігійнага светапогляду. Але тады прыпомнім класіка: «Над кім смяяцеся? Над сабой смяяцеся!»

Ужо ўзгаданы лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіцы У. Гейзенберг заўважыў: «Калі рэлігіі ўсіх эпох гавораць вобразамі, сімваламі і парадоксамі, то гэта, мабыць, таму, што няма ніякіх іншых магчымасцяў ахапіць тую рэчаіснасць, якая тут маецца на ўвазе» («Фізіка і філасофія: Частка і цэлае»). Растлумачваць відавочнае — тое, што Біблія, як і большасць іншых літаратурных помнікаў, гаворыць на вобразна-метафарычнай мове — проста няёмка. І калі мой апанент лічыць, што гэтая мова несумяшчальная з мовай прыродазнаўчых навук, то яму варта б выступіць за тое, каб у школе было накладзенае табу на цытаванне абсурдных вершаў Лермантава пра «мятежный парус». Або так: вершы называць, але з абавязковай заўвагай, што ветразь — насамрэч прадмет неадухоўлены і не валодае ні псіхікай, ні тэмпераментам.

Вельмі сур'ёзна ўспрыняў я тэзіс педагога аб задачах школы. Задача школы ніколі, а цяпер тым больш, не зводзілася да ведаў і далягляду. Задачамі школы ва ўсе часы былі:

1) фарміраванне асобы вучня ў адпаведнасці з існуючымі агульнапрынятымі ідэаламі;

2) фарміраванне арыентацыйнай асновы паводзінаў чалавека ў акаляючым яго прыродным і сацыяльным свеце;

3) падрыхтоўка вучня да пераходу ў сферу прафесійнай адукацыі.

Веды ў значнай ступені (хоць далёка не ў поўным аб'ёме) прадвызначаюць поспех вырашэння другой і трэцяй задач. Што ж датычыцца першай задачы, то роля ведаў у яе вырашэнні вельмі і вельмі ўмоўная. Той, хто пакруціўся ў свеце навукі, ведае, наколькі бязлітаснымі і беспардоннымі могуць быць носьбіты велізарных масіваў прадметных ведаў.

Крыху спрашчаючы сітуацыю, хачу сказаць, што адпаведнасць чалавека грамадскім ідэалам вызначаецца яго паводзінамі ва ўсіх жыццёвых сітуацыях, а яны (гэтыя паводзіны) вызначаюцца сістэмай жыццёвых вартасцяў, сістэмай маральных забаронаў і стандартызаваных формаў паводзінаў. І яшчэ цэлым шэрагам якасцяў і ўласцівасцяў асобы, адно толькі веданне аб існаванні якіх, як правіла, нічога не дае чалавеку. Няўжо можна паверыць у тое, што злодзей не ведае пра амаральнасць і пакаральнасць крадзяжу? Тое самае і са справай стварэння арыентацыйнай асновы паводзінаў чалавека ў сацыяльным свеце. Усё гэта задачы таго працэсу, які завецца выхаваннем і які, на вялікі жаль многіх педагогаў, не зводзіцца да засваення прадметных і надпрадметных ведаў.

Ці можа рэлігійная культура служыць крыніцай фарміравання ўласцівасцяў і якасцяў асобы, якія нас цікавяць? Адказ відавочны — можа.

Цяпер пра трэці аргумент. Шкада, што немцы дагэтуль не азнаёміліся з аргументацыяй спадара С. Свістуновіча адносна ўрокаў рэлігійнай культуры ў школе і колькасці атэістаў у Германіі! Дагэтуль у Канстытуцыі ФРГ указаны адзіны абавязковы для ўсіх і ва ўсёй Германіі ўрок — урок рэлігіі. І нешта я не чуў пра масавыя пратэсты немцаў супраць такога становішча рэчаў. Увогуле, няўжо майго апанента не дзівіць тое, што 4/5 немцаў (па яго звестках, няверуючых) плаціць той самы «рэлігійны падатак»? Як і каму гэта ўдалося — прымусіць еўрапейцаў, з іх прававой свядомасцю, выконваць тое, у чым яны ніяк маральна не зацікаўленыя?

Дарэчы, урокі рэлігіі сёння ёсць ва ўсіх школах Фінляндыі, Польшчы, Прыбалтыкі, у 30 % школ Украіны. Уводзяцца яны на першым этапе ў эксперыментальным рэжыме і ў Расіі. Увогуле, амаль уся Еўропа ідзе не туды і не ў нагу, і толькі нашы атэісты гатовыя вызначыць чалавецтву адзіна дакладны шлях.

Далей. Калі ўжо свабода сумлення гарантаваная Канстытуцыяй нашай краіны, то хто Вам, сп. С. Свістуновіч, даў права навязваць камусьці Ваш атэістычны светапогляд? Можа, лепш так: Богу — Богава, а цэсару — цэсарава. Хто хоча сам (або яго бацькі), вывучае ў школе дыялектыка-матэрыялістычны светапогляд, а хто хоча — рэлігійную культуру?

Дарэчы, заўважу, што ўрокі рэлігійнай культуры ў тым выглядзе, у якім іх прадстаўляе бок царквы, маюць на ўвазе адсутнасць якіх-небудзь рытуалаў, малітваў, багаслужэнняў. Такая традыцыйная еўрапейская трактоўка свецкасці, супраць якой пярэчыць у Беларускім экзархаце не збіраюцца.

Цяпер самае галоўнае. Чаму многія людзі настойваюць на неабходнасці ўвядзення рэлігійнай культуры ў школах (механізм і формы такога ўвядзення могуць і павінны абмяркоўвацца асобна)?

Чыннікаў таму некалькі.

Першы я ўжо, па сутнасці, выказаў. Рэлігійная культура можа быць эфектыўным элементам фарміравання і сацыялізацыі асобы. Асобы, якая не ўступае ні ў які канфлікт з прыродным і сацыяльным атачэннем, бо ўсе нашы традыцыйныя рэлігіі разглядаюць такія канфлікты як грэх і асуджаюць іх.

Другі. Сёння ў грамадстве сфарміравалася вельмі сур'ёзная цікавасць да рэлігіі і рэлігійнай культуры. І ні дзяржаве, ні афіцыйным рэлігійным структурам не можа быць абыякавы адказ на пытанне: дзе, кім і ў якіх формах гэтая цікавасць будзе задаволеная. Але, на вялікі жаль, на гэтай цікавасці часцяком спекулююць носьбіты экстрэмісцкага і тэрарыстычнага светапогляду. Меней за ўсё я хацеў бы, каб наступная фраза была ўспрынятая як злараднасць, але факт наяўнасці і дзейнасці вахабізму ў Расіі ў значнай ступені абумоўлены тым, што цікавасць да мусульманства ў пачатку 90-х гадоў у гэтай краіне ў значнай ступені задавальнялася не дзяржавай і афіцыйнымі мусульманскімі рэлігійнымі арганізацыямі, а рознага кшталту экстрэмістамі, для якіх ісламбыў толькі шыльдай, а цікавасць да гэтай рэлігіі — толькі каналам, праз які яны маглі ўвайсці ў кантакт з людзьмі. Усё астатняе — справа тэхнікі і метадаў псіхалагічнай апрацоўкі.

Уседамленне гэтага факта, на мой погляд, было адной з прычын, якія падштурхнулі кіраўніцтва Расіі да ўвядзення курсу рэлігійнай культуры ў якасці абавязковага прадмета ў сяр эднюю школу. Дзяржава фактычна гаворыць: у вас ёсць цікавасць да рэлігійнай культуры, у вас ёсць цікавасць да пэўнай рэлігіі? Вось вам канал задавальнення гэтай цікавасці — вывучайце адпаведны прадмет у школе. Мы, г. зн. дзяржава, выступаем гарантам таго, што ў гэты прадмет не пранікнуць ні экстрэмізм, ні фанатызм, ні варожасць да носьбітаў іншых рэлігійных поглядаў.

Вы ўпэўнены, сп. С. Свістуновіч, што праблема фанатызму і экстрэмізму, у рознай ступені актуальная для краін усяго свету, не патрабуе прафілактыкі ў Беларусі?

І апошняе.

Наша прапанова аб увядзенні ўрокаў рэлігійнай культуры ў школе ўлічвае ўвесь спектр светапоглядаў. Вучань павінен быць вольны САМ выбіраць, з чым яму знаёміцца — з рэлігійнай культурай якой-небудзь з традыцыйных для рэспублікі канфесій або са свецкай дыялектычна-матэрыялістычнай этыкай. Мы не збіраемся навязваць свае погляды, але просім такіх жа адносінаў і да поглядаў нашых.

P.S. *Хачу паведаміць і сп. С. Свістуновічу, і інкогніта дзяржслужачай: у 2010 г. Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта размеркавала ўсе 100 % сваіх выпускнікоў.*

Хто мае вушы, хай пачуе!

Прарэктар Інстытута тэалогіі БДУ Г. ПЯТРОЎСКІ.

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО» (организатор аукциона) по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит повторные аукционы по продаже объектов, находящихся в республиканской собственности, и права заключения договоров аренды земельных участков для их обслуживания, которые составляют единые предметы аукциона

Сведения о предметах аукционов

Аукцион 12 июля 2010 года в 11.00

Лот № 1

Капитальное строение (инв. № 600/С-111773) и право заключения договора аренды земельного участка. Одноэтажное здание хранилища ГСМ Г2/36 с площадкой общей площадью – 163,8 кв.м, 1959 г/п (года постройки), фундамент бутобетонный ленточный, стены кирпичные. Объект расположен по адресу: Минская область, Минский район, Колодищанский с/с, военный городок № 2 «Городище», на земельном участке площадью 0,0380 га. Срок аренды земельного участка 10 лет. **Условия использования земельного участка:** для размещения объектов производственного и складского назначения.

Начальная цена предмета аукциона (Лот № 1): 38 941 264 рубля (в т.ч.: объект – 37 354 430 рублей, право заключения договора аренды земельного участка 1 586 834 рубля). **Размер задатка** для участия в аукционе 3 800 000 рублей.

Лот № 2

Капитальное строение (инв. № 600/С-116448) и право заключения договора аренды земельного участка. Одноэтажное здание ледника № Г-2/46 общей площадью – 15,5 кв.м, 1961 г/п, фундамент бетонный, стены кирпичные, перекрытие чердачное – железобетонные плиты. Объект расположен по адресу: Минская область, Минский район, Колодищанский с/с, военный городок № 2 «Городище», на земельном участке площадью 0,0351 га. Срок аренды земельного участка 10 лет. **Условия использования земельного участка:** для размещения объектов производственного и складского назначения.

Начальная цена предмета аукциона (Лот № 2): 4 363 924 рубля (в т.ч.: объект – 2 898 189 рублей, право заключения договора аренды земельного участка 1 465 735 рублей). **Размер задатка** для участия в аукционе 430 000 рублей.

Продавец: Государственное учреждение «Минское эксплуатационное управление Вооруженных Сил» (г. Минск, ул. Основателей, 24, тел. (8017) 266 84 55, 266 52 33). **Арендодатель земельных участков:** Минский районный исполнительный комитет (г. Минск, ул. Ольшевского, 8).

Подробное извещение о проведении аукциона по продаже Лотов №№ 1–2 опубликовано в газете «Звязда» от 12 марта 2010 г. № 45.

Задаток для участия в аукционе 12 июля 2010 г. **перечисляется в срок по 8 июля 2010 года включительно** на расчетный счет **№ 3642900000841** в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНП 100128686, получатель платежа – фонд «Минскоблгосимущество». **Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе. **Последний день подачи заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами – 8 июля 2010 г. до 17.00.**

Аукцион 14 июля 2010 года в 11.00
Стоимость объекта снижена на 20 %

Лот № 1

Капитальное строение (инв. № 610/С-44326) и право заключения договора аренды земельного участка. Одноэтажное здание водостанции 21/4 с двумя пристройками общей площадью 139,0 кв.м, 1934 г/п, стены и перегородки кирпичные. Подведены инженерные коммуникации. Объект расположен по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Чаловской, 90 (военный городок № 21) на земельном участке площадью 0,3207 га. Введено ограничение в использовании земельного участка в связи с нахождением в зоне санитарной охраны поверхностных и подземных источников водоснабжения хозяйственно-питьевого назначения. Срок аренды земельного участка 25 лет. **Условия использования земельного участка** для обслуживания здания с возможным изменением направления его использования в установленном порядке.

Начальная цена предмета аукциона: 63 361 763 рубля (в т.ч.: недвижимое имущество – 37 594 873, право заключения договора аренды земельного участка 25 766 890). **Размер задатка** для участия в аукционе – 6 000 000 рублей.

Продавец имущества: Государственное учреждение «Борисовское эксплуатационное управление Вооруженных Сил» (Минская область, г. Борисов, ул. Л.Чаловской, 26, тел. (80177) 73 33 49,75 76 59). **Арендодатель земельного участка:** Борисовский районный исполнительный комитет (Минская область, г. Борисов, ул. Чапаева, 6).

Подробное извещение о проведении аукциона по продаже Лота № 1 опубликовано в газете «Звязда» от 7 октября 2009 г. № 189

Аукцион 14 июля 2010 года в 15.00
Стоимость объектов снижена на 20 %

Лот № 1

Капитальное строение (инв. 640/С-22799) общей площадью 286,8 кв.м, 1984 г/п – одноэтажное здание санчасти инв. № 13/218, стены и перегородки кирпичные. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43323) – электрическая сеть к зданию, протяженностью 50,0 м. Капитальное строение (инв. № 640/С-43307) – водопроводная сеть от ВК-9 до здания, протяженностью 5,50 м. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43311) – тепловая сеть от ТК-6 до здания, протяженностью 8,75 м. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43325) – канализационная сеть от здания, протяженностью 48,90 м. Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Максима Богдановича, 13 в/г, на земельном участке площадью 0,1924 га, назначение – для содержания и обслуживания здания санчасти. Срок аренды земельного участка 34 года

Начальная цена предмета аукциона (Лот № 1): 78 343 562 рубля (в т.ч.: объекты – 54 988 732, право заключения договора аренды земельного участка – 23 354 830). **Размер задатка** для участия в аукционе – 7 000 000 рублей.

Лот № 2

Капитальное строение (инв. № 640/С-22839) общей площадью 1008,6 кв.м, 1938 г/п – одноэтажное здание кухни-столовой № 13/7 с террасой и складом, стены и перегородки кирпичные оштукатуренные. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43314) – электрическая сеть к зданию, протяженностью 65,0 м. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43303) – водонапорная сеть от ВК-16 до здания, протяженностью 27,9 м. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43310) – тепловая сеть от ТК-3 до здания, протяженностью 6,0 м. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43324) – канализационная сеть от здания, протяженностью 105,6 м. Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Максима Богдановича, 13 в/г, на земельном участке площадью 0,4973 га, назначение – для содержания и обслуживания здания кухни-столовой. Срок аренды земельного участка 13 лет.

Начальная цена предмета аукциона (Лот № 2): 86 471 138 рублей (в т.ч.: объекты – 56 575 718, право заключения договора аренды земельного участка – 29 841 420). **Размер задатка** для участия в аукционе – 8 000 000 рублей.

Лот № 3

Капитальное строение (инв. № 640/С-22802) общей площадью 3212 кв.м, 1936 г/п – трехэтажное здание казармы, стены и перегородки кирпичные. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43313) – электрическая сеть к зданию, протяженностью 60,0 м. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43305) – водопроводная сеть от ВК-15 до здания, протяженностью 65,70 м. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43312) – тепловая сеть от ТК-4 до здания, протяженностью 7,30 м. **Капитальное строение** (инв. № 640/С-43326) – канализационная сеть от здания, протяженностью 70,50 м. Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Максима Богдановича, 13 в/г, земельного участка площадью 0,3504 га, назначение – для содержания и обслуживания здания казармы. Срок аренды земельного участка 27 лет

Начальная цена предмета аукциона (Лот № 3): 165 290 098 рублей (в т.ч.: объекты – 129 814 178, право заключения договора аренды земельного участка – 35 475 920). **Размер задатка** для участия в аукционе – 16 000 000 рублей.

Продавец: Государственное учреждение «Бобруйское эксплуатационное управление Вооруженных Сил» Слуцкий филиал (Минская область, г. Слуцк, ул. Богдановича, 184, тел. (801795) 6 69 70). **Арендодатель земельных участков:** Слуцкий районный исполнительный комитет (Минская область, г. Слуцк, ул. Ленина, 189).

Подробное извещение о проведении аукциона по продаже Лотов №№ 1–3 опубликовано в газете «Звязда» от 7 октября 2009 г. № 189

Задатки для участия в аукционах 14 июля 2010 г. в 11.00 и 15.00 **перечисляются в срок по 12 июля 2010 года включительно** на расчетный счет **№ 3642900000841** в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНП 100128686, получатель платежа – фонд «Минскоблгосимущество». **Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе. **Последний день подачи заявлений на участие в аукционах (14 июля) с прилагаемыми к ним документами – 12 июля 2010 г. до 17.00.**

Участник аукциона, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой. **Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан:** Подписать протокол о результатах аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным районным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка победитель аукциона (претендент на покупку) обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (в случае предоставления рассрочки ее внесения соответствующими исполнительными комитетами – часть платы), возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона и расходы, связанные с формированием земельного участка, изменением и прекращением существования земельных участков в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении земельных участков; после совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, заключить в установленном порядке с Продавцом имущества договор купли-продажи недвижимого имущества, а с Арендодателем земельного участка – договор аренды земельного участка. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала проведения аукциона по каждому объекту, выставляемому на аукцион. Фотографии продаваемых объектов, а также информация об объявленном аукционе и предметах аукциона дополнительно размещается на сайте Минского облисполкома: **www.minsk-region.gov.by** на странице фонда «Минскоблгосимущество». **Заявления на участие в аукционах с прилагаемыми к ним документ

ПРЫЦЯГНЕННЕ ЗАКІНУТЫХ СЯДЗІБАЎ

Даволі часта можна ўбачыць аб'яву: «Куплю дом у вёсцы, недалёка ад горада, нядорага». А наколькі рэальна купіць танную хату побач з горадам сёння?

Танна — гэта дзесьці ў межах 1000 долараў, але за такую цану прадаваць хаты ўжо не хочуць.

Аднойчы спытаў у 80-гадовай бабулі, чаму яна не збывае бацькоўскую хату. За дваццаць гадоў будынак аброс наўкол хмызняком, плот згніў, шыферны дах пад пластом моху...

— За такія грошы я не аддам. Гэта ж столькі працы, нагаладаліся і нацярпеліся, пакуль будаваліся, — уздыхнула жанчына.

Цяжка давалася будаўніцтва некалі. З нашай вёскі ездзілі па лес у в. Буды, а гэта мяжа Ганцавіцкага раёна. Напачатку тралявалі, а затым на конях зімой везлі. Ехалі з начоўкай, некалькі чалавек: сваякі, суседзі, знаёмыя... А колькі бярвёнаў можна было прывезці за 35 км на санях — 2-3 стваліны? Камлі ляжалі на асноўных санях, а тонкія канцы — на маленькіх, якія ў нашым краі называліся «сучкай». Відаць, з-за таго, што на вяроўцы цягнуліся следам. А затым усё рабілася ўручную. Бярвёны падымалі на казлы і пілавалі іх на дошкі — двое мужчын цягнулі пілу знізу, а адзін зверху. Пры доме трэба было ўзвесці хлеў, а камусьці і гумно, выкапаць калодзеж, склеп...

І можна зразумець чалавека, які перанёс тыя цяжкасці. Аддаць хату па цане 25-гадовай аўтамашыны-развалiны не кожны здолее. І хоць хата тая таксама пахілілася, але ж расстацца з маёмасцю, нажытай гарбом, нялёгка.

Ды і сёння будавацца няпроста. Можа, ужо жылы чалавек рваць не будзе — будматэрыялаў хапае, але стаіць праблема фінансавання. Нават калі дадуць крэдыт, то дзесяцігоддзямі давядзецца жыць сціпла, і гэта адна з прычын таго, чаму скупляюцца закінутыя хаты па вёсках. А ў некага ўсё прасцей: ёсць грошы, не жыве ад зарплаты да зарплаты...

Апошнім часам сітуацыя пачала мяняцца ў бок падаражэння жылля ў бліжэйшых ад Баранавічаў вёсках.

Каўпеніцкі сельсавет лічыцца прыгарадным. І каб купіць закінутую хату на яго тэрыторыі, неабходна мець грошы. Сёння далёка не кожны можа набыць тут сядзібу. Колькі гадоў таму хату можна было купіць у некалькі разоў танней, але момант ужо ўпушчаны.

— Я не кажу пра будынак, нават участкі пад будоўлю мы з аўкцыёну прадаём па высокай цане. Вось у вёсцы Гірава ўчастак у 12 сотак пайшоў за 40 мільёнаў, а ў вёсцы Дубава два ўчасткі прадалі па 36 мільёнаў рублёў, — расказаў старшыня сельскага Савета Мікалай Грыбаў.

— А хто пакупнікі?

— Людзі, у якіх ёсць грошы. Дарэчы, на аўкцыёне ўдзельнічалі і жыхары Мінска, але перамаглі мясцовыя.

— Калі на зямлю такая цана, то і на хаты яна, напэўна, вырасла?

— У Антанове за драўляную хату просяць 25 тысяч долараў ці хочуць памяняць на двухпакаёвую кватэру. Вунь іншая хата валіцца, а цану трымаюць у 10 тыс. долараў.

— Напэўна, у хуткім часе на тэрыторыі сельсавета не застанецца ніводнай закінутай хаты?

— Некаторыя прадаваць не хочуць. Вунь у Новым Свеце які год пустуе хата. Наўкол далягляд выдатны і цану добрую людзі даюць, але многа нашчаднікаў і прадаваць не хочуць. «Як гэта бацькаўшчыну прадаваць», — кажуць. Мы тэлефануем, каб хоць аформілі дакументы.

— Правядзенне аўкцыёну для Савета істотная падтрымка?

— Наш сельсавет адзіны ў раёне, які не атрымлівае датацыі. Калі ёсць магчымасць зарабіць грошы, то трэба іх зарабляць.

Аказваецца, і зямля цану мае, толькі вось мы яшчэ не можам па-гаспадарску да гэтага падысці — азіраемся, бо жывём мінулым...

Што такая сітуацыя з хатамі пад Баранавічамі, нічога дзіўнага няма — горад, па нашых мерках, даволі буйны, а што робіцца ў глыбінцы?

Вёска Боркі не самая аддаленая ў Ганцавіцкім раёне — знаходзіцца за дзесяць кіламетраў ад райцэнтра. Сюды прыязджаюць па журавіны і некалькі гадоў таму даводзілася бачыць тут закінутыя хаты. Боркі знаходзяцца на тэрыторыі Любашаўскага сельсавета, а Любашава побач з Ганцавічамі.

— І ў нас цэны на хаты выраслі. У Любашаве за дом просяць 30 тысяч долараў, а хату, якой паўвека, прадаюць за 12 тысяч. У Борках гэтаксама цэны хістаюцца ў межах 6-12 тысяч долараў. Нехта купляе пад жыллё, а іншы стаміўся ад мітусні і выкарыстоўвае пад дачу, — расказалі ў Любашаўскім сельсавеце.

Рост цаны на хаты сведчыць пра попыт на іх. У г/п Гарадзея закінутых хатаў няма. Адсюль у Мінск людзі ездзяць на працу, студэнты на вучобу, а гэта дзве гадзіны дарогі туды, затым — назад, але многіх гэта не пужае.

Калі жыллё знаходзіцца за 5-10 км ад горада, то сёння пры наяўнасці аўтамашыны гэта не аддлегласць. Чалавек пачаў разумець, што жыццё ў прыгарадзе больш прывольнае і таннае. А хіба цывілізаваны свет не так жыве?

Пры ўзвядзенні дамоў на дзяржаўнай праграме неабходна было напачатку максімальна выкарыстоўваць перавагі пустога жылля. Калі пры доме ёсць сад ці нават некалькі дрэў, то гэта стварае своеасаблівае прыроднае асяроддзе — воку ёсць за што зачапіцца. А аднатыпныя, выстраеныя ў шарэнгу дамы, стамляюць — дужа ўсё аднастайнае. А можа гэта толькі мне здаецца?

Пры набыцці жылля ў вёсцы, многае залежыць ад канкрэтнага чалавека. Каб у закінутай хаце жыць, неабходна прывесці яе ў парадак, адрамантаваць, усё наўкол вычысціць... Трэба прыкласці рукі, а не ўсе здольныя роўна цвік забіць. Ды і на рамонт патрэбны грошы.

Сёння найперш запатрабаваныя пустыя хаты ў прыгарадных вёсках, у населеных пунктах пры чыгунцы ды аўтамагістралях, але з часам чарга дойдзе да больш аддаленых вёсак. Час не ведае кампрамісаў і ўсё раскладвае па паліцах, а чалавек прыстасоўваецца і выбірае найбольш прымальны варыянт.

Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.

Ахвяры вады

У меліярацыйным канале каля в. Чарнаўчыцы (Брэсцкі раён) баз прыкмет гвалту знайшлі мёртвага мясцовага жыхара. І ў р. Гарынь, непадалёк ад в. Манькавічы (Столінскі раён), знойдзены тапелец, які ўжо доўга прабыў у вадзе. Праводзіцца праверка.

Многа спірту не бывае?

У гаражы, які знаходзіцца ў в. Узноге пад Баранавічамі, супрацоўнікаў міліцыі чакаў сюрпрыз. Беспрацоўная з горада хавала там больш за 5 тыс. літраў спірту на суму звыш 51 млн рублёў. Спірт канфіскавалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Пытальнік

«ЗЯМЕЛЬНЫ ПАДАТАК ВЫЛІЧАНЫ ПА ГАДАХ ПРАВІЛЬНА.

А пераплата па падатку на нерухомасць вернутая праз казначэя садаводчага таварыства»

Паважаная рэдакцыя, наша сям'я мае садовы ўчастак. Садаводчае таварыства «Сяброўства ў Баярах» размешчана ў Маладзечанскім раёне, мы падпарадкоўваемся тамтэйшаму райвыканкаму. Участак 4 соткі, на ім — дашчаны домік і гаспадарчыя пабудовы. Дом неацеплены, жыць у ім можна толькі ў цёплы час года. Штогод, разам з членскімі ўзносамі, мы плацім падатак на зямлю і падатак на нерухомасць. Прывяду лічбы па гадах. Падатак на зямлю: 2004 год — 1 888 рублёў, 2005 год — 2 110, 2006 год — 2 690, 2007 год — 2 920, 2008 год — 3 160, 2009 год — 3 400, 2010 год — 13 610 рублёў. Падатак на нерухомасць: 2004 год — 3 230 рублёў, 2005 год — 3 850, 2006 год — 5 470, 2007 год — 10 860, 2008 год — 9 320, 2009 год — 17 000, 2010 год — 28 320 рублёў. Як бачна, падатак на зямлю з 2004 па 2009 год павялічваўся прыкладна на 200—300 рублёў штогод. Сёлета ён павялічыўся адразу ў 4 разы! Узнікае пытанне: чаму? Урадлівасць зямлі ў 2010 годзе ў 4 разы не палепшылася. Ды і заробак у працуючых, што плацяць падаткі, у 4 разы не павялічыўся.

Падатак на нерухомасць павялічыўся ў 2 разы і склаў 28 320 рублёў... Пры двухразовым павелічэнні апошняй лічбы падатку праз 5 гадоў гэта сума складзе каля 800 тысяч рублёў. Варта адзначыць, што за апошнія гады наша нерухомасць на дачы не змянялася.

Прыведзеныя падаткі зафіксаваныя ў кніжцы садавода, ёсць роспіс бухгалтара і пячатка садаводчага таварыства. Бухгалтар на нашы пытанні адказвае, што названыя памеры падаткаў паступілі ад Маладзечанскага райвыканкама. Паважаная рэдакцыя, калі можна, прашу патлумачыць, ці законна вызначаюцца агучаныя падаткі.

Пётр Андрэевіч НАВУМЕНКАЎ, *г. Мінск*

Па просьбе рэдакцыі праверкай выкладзеных нашым чытачом фактаў займалася **начальнік аддзела падаткаабкладання фізічных асобаў інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Маладзечанскім раёне Тамара ГЯРКО**. Пасля скрупулёзнага высвятлення ўсіх нюансаў Тамара Уладзіміраўна дала «Звяздзе» падрабязны адказ.

ПРА ЗЯМЕЛЬНЫ ПАДАТАК

У сувязі з уваходжаннем у сілу з 01.01.2010 г. Асаблівай часткі Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь, радыкальна змяніўся прынцып аплаты зямельнага падатку. Калі раней падатковыя органы вылічвалі яго ў фіксаваных сумах, адзіных для канкрэтнага горада, раёна, дык цяпер велічыня плацяжу за зямлю напрамую залежыць ад яе кошту (выдз. — **Рэд.**). У 2009 годзе Навукова-вытворчае дзяржаўнае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Нацыянальнае кадастравае агенцтва» правяло кадастравую ацэнку зямель сельскіх населеных пунктаў Маладзечанскага раёна і рашэннем Маладзечанскага райвыканкама ад 15.02.2010 г. № 93 зацверджаныя кадастравыя кошты зямель садаводчых таварыстваў, размешчаных на тэрыторыі Маладзечанскага раёна. Згодна з вышэй згаданым рашэннем, кадастравы кошт 1 кв.м зямель СТ «Сяброўства ў Баярах» складае 2,61 дол. ЗША (па курсе НБ РБ на 01.01.2010 г. — 7 462 бел. руб.), зямельнага ўчастка, што належыць сыну заяўніка, плошчай 405 кв.м (0, 0405 га) — 3 022 106 бел. руб. У адпаведнасці з п. 3 арт. 198 Кодэкса, падатак склаў 13 600 бел. руб. (3 022 106х0,45 %), ці за 1 сотку 3 357,90 бел. руб.

У папярэднія гады за 1 сотку фіксаваная стаўка падатку (з улікам павелічэння па рашэннях Маладзечанскага райвыканкама) складала: у 2004 годзе — 462,12 руб., у 2005 годзе — 520,36 руб., у 2006 годзе — 663,16 руб., у 2007 годзе — 716,93 руб., у 2008 годзе — 761,74 руб., у 2009 годзе — 837,91 руб. **Такім чынам, зямельны падатак вылічаны па гадах правільна і павелічэнне аплаты за зямлю адбылося ў сувязі са змяненнямі ў падатковым заканадаўстве з 1 студзеня 2010 года** (выдз. — **Рэд.**).

ПРА ПАДАТАК НА НЕРУХОМАСЦЬ

Падатак на нерухомасць фізічным асобам вылічваўся падатковым органам у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 23.12.1991 г. №1337-XII «Аб падатку на нерухомасць» да 01.01.2010 г. і ў адпаведнасці з артыкулам 17 «Падатак на нерухомасць» Асаблівай часткі Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь, што ўвайшоў у сілу з 01.01.2010 г. Прынцып налічэння і стаўка падатку не змяніліся. Аб'ектам абкладання падаткам на нерухомасць з'яўляецца ацэначны кошт будынкаў і збудаванняў, якія належаць людзям. Гадавая стаўка падатку на нерухомасць вызначаецца ў памеры 0,1 %. Акрамя таго, Законам аб бюджэце на чарговы фінансавы год да 1 студзеня 2010 года мясцовым Саветам дэпутатаў давалася права павялічваць, але не больш чым у два разы, стаўку падатку на нерухомасць. У 2010 годзе гэта права замацаванае Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 09.03.2010 г. № 143 «Аб асобных пытаннях падаткаабкладання». Такім чынам, стаўка падатку на нерухомасць па аб'ектах, што належаць фізічным асобам на тэрыторыі Маладзечанскага раёна, склала па гадах (з 2004 па 2007-ы) — 0,15 %. У 2008 годзе па шкале: да 30 000 тыс. руб. (кошт аб'екта) — 0,1 % (стаўка падатку), ад 30 001 да 50 000 — 0,12 %, ад 50 001 да 100 000 — 0,15 %, ад 100 001 і вышэй — 0,2 %. У 2009 годзе — 0,15 %. У 2010 годзе: студзень—сакавік — 0,1 %, красавік—снежань — 0,18 %.

Парадак ацэнкі належных фізічным асобам будынкаў і збудаванняў за перыяд з 01.01.2003 г. па 31.12.2007 г. быў вызначаны Палажэннем аб парадку ацэнкі будынкаў і збудаванняў, зацверджаным пастановай Савета Міністраў ад 31.01.2003 г. № 121. З 1 студзеня 2008 года парадак ацэнкі належных фізічным асобам будынкаў і збудаванняў вызначаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28.03.2008 г. № 187 (са зменамі і дапаўненнямі), згодна з якім ацэнка будынкаў і збудаванняў праводзіцца: тэрытарыяльнымі арганізацыямі па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёю згодна з ацэначным коштам будынкаў і збудаванняў на 1 студзеня бягучага года, улічваючы каэфіцыенты тыпу населенага пункта, каэфіцыенты якасці асяроддзя, агульныя індэксы змянення кошту будаўніча-мантажных работ з улікам кошту матэрыяльных рэсурсаў па абласцях і горадзе Мінску.

Пры адсутнасці вышэйназваных звестак падатковыя органы ў адпаведнасці з Палажэннем могуць самастойна вызначаць ацэначны кошт будынкаў і збудаванняў некалькімі спосабамі, у тым ліку:

— метадам індэксацыі кошту будынкаў і збудаванняў, зыходзячы з якога ў мінулым годзе фізічнай асобе праводзілася вылічэнне падатку. Для індэксацыі падатковыя органамі выкарыстоўваюцца каэфіцыенты пераацэнкі будынкаў і збудаванняў, што разлічваюцца штогод Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва , якія ўлічваюць інфляцыйныя працэсы, што адбываюцца ў эканоміцы;

— зыходзячы з разліковага кошту аднаго квадратнага метра тыпавога будынка ці збудавання на пачатак года, які вызначаецца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, і агульнай плошчы будынкаў і збудаванняў, якія ацэньваюцца, з улікам каэфіцыента якасці асяроддзя і тыпу населенага пункта.

Зыходзячы з вышэйвыкладзенага, падатковы орган пры вылічэнні падатку на нерухомасць (на садовы домік) выкарыстоўваў наступныя метады: да 2007 года — зыходзячы з разліковага кошту аднаго м кв. тыпавога будынка і збудавання, паколькі адсутнічала інфармацыя пра ацэначны кошт па тэхнічным пашпарце. У 2007 годзе праводзіліся выбаркі інвентарных спраў у Маладзечанскім філіяле РУП «Мінскае абласное агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры» і быў вызначаны ацэначны кошт садовага домка ў цэнах 1991 года, зыходзячы з якога ў наступныя гады вылічваўся падатак на нерухомасць. Змяншэнне падатку ў 2008 годзе адбылося ў сувязі з выкарыстаннем стаўкі падатку ў памеры 0,1 %, а ў 2007 і 2009 гадах выкарыстоўвалася стаўка 0,15 % (выдз. — **Рэд.**).

У выніку праведзенага аналізу правільнасці вылічэння зямельнага падатку і падатку на нерухомасць было ўстаноўлена, што падатак на нерухомасць прад'яўлены няправільна. Трэба да аплаты 18 870 руб., а садавадчым таварыствам прад'яўлена грамадзяніну Навуменкаву 28 320 руб. Пераплата ў суме 9 450 руб. вернутая праз казначэя садаводчага таварыства (выдз. — **Рэд.**).

Фота Наталлі АБЛАЖЭЙ, БЕЛТА.

У рамках выставы «Белагра-2010» прайшлі «парасячыя скачкі», якія сталі ўжо традыцыйнымі для выставы. У забегах узялі ўдзел парасяты 4 гаспадарак. Пераможцам стала тое парася, якое здолела абысці па хуткасці ўсіх супернікаў.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

ПРАПІСАНЫ НАЙМАЛЬНІК? ЗАПЛАЦІЦЕ ПА ТАРЫФАХ ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

НАША газета ў апошні час дастаткова ўвагі надавала тлумачэнню палажэнняў пастановы ўрада Беларусі №639, прысвечанай, у прыватнасці, тэме аплаты выдаткаў на тэхнічнае абслугоўванне і ацяпленне ўладальнікамі пустуючых кватэр. І тым не менш пытанні ў чытачоў засталіся. З імі ў рэдакцыю і звярнуўся кіраўнік аднаго са сталічных жыллёва-будаўнічых спажывецкіх кааператываў.

— Зразумела, што па эканамічна абгрунтаваных тарыфах будуць плаціць уладальнікі жылля, як запісана ў пастанове, з агульнай плошчай жылых памяшканняў больш за 200 квадратных метраў, а таксама ўладальнікі кватэр, дзе ніхто не прапісаны, — гаварыў наш чытач. — А як быць у сітуацыі, калі жыллё здаецца па дагаворы найму? Каб удакладніць гэта, звяртаўся ў Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Там папрасілі накіраваць на іх адрас пісьмовы запыт на якія будзе дадзены адказ на працягу некалькіх тыдняў. Аднак пакуль прыйдзе той адказ, гэта будзе ўжо ці не сярэдзіна чэрвеня. Значыць, выставіць аплату камунальных паслуг некаторым нашым жыльцам за гэты час трэба будзе ўжо двойчы. А зыходзячы з якіх крытэрыяў? Магчыма, у вас атрымаецца больш хутка атрымаць адказ на гэтае пытанне ў міністэрстве?

У Міністэрстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі крыху здзівіліся такой пастаноўцы пытання. Маўляў, трэба ўважліва чытаць дакументы, там ёсць адказ і на гэты запыт. Так, у кантэксце пастаўленага кіраўніком жыллёва-будаўнічага спажывецкага кааператыву пытання трэба вылучыць два моманты: пры здачы жылля па дагаворы найму ці прапісаны ў ім сам наймальнік або не? Калі наймальнік у кватэры прапісаны, за камунальныя паслугі давядзецца плаціць па тарыфах для насельніцтва. Калі ўмова не вытрымліваецца — наймальнік не прапісаны — выдаткі на тэхабслугоўванне жылля і яго ацяпленне трэба будзе весці па згаданых вышэй эканамічна абгрунтаваных тарыфах.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Верш з канверта

МЫ

МЫ
нарадзіліся на гэтай зямлі,
МЫ
яе ад Дзвіны і да Нёмна
тапталі,
МЫ
яе чэрствую ўвесну аралі.
МЫ
яе скарбы ў вяках бераглі.
МЫ
бралі зброю супраць
ворагаў клятых,
МЫ
здабывалі свабоду ад катаў.
МЫ
савецкую ўладу прайшлі,
МЫ
незалежнасць сваю набылі.
МЫ
будавалі Айчыну нанова.
МЫ
шчыра гасцей сустракаем.
МЫ
беларусамі сябе называем,
АЛЕ
адракаемся ад роднай мовы.

Мікола ГАЛАВАЧ.

Ягор МЕШЧАРАКОЎ:

Я НЕ КАЖУ ЗБОРНАЙ: «БЫВАЙ». Я КАЖУ: «ДА НОВАЙ СУСТРЭЧЫ»

Знакаміты баскетбаліст збіраецца нарэшце давучыцца ў аспірантуры, а пакуль дае майстар-класы для дзяцей

САМЫ вядомы беларускі баскетбаліст, лідар нашай мужчынскай зборнай Ягор Мешчаракоў вырашыў узяць паўзу ў спартыўнай кар'еры. Азначае гэта, што ў найбліжэйшы час мы не ўбачым Ягора ні ў клубе, ні ў нацыянальнай камандзе. Прычыну растлумачыў сам баскетбаліст. Ён мае намер нарэшце завяршыць навучанне ў аспірантуры ўніверсітэта Джорджа Вашынгтона ў ЗША, дзе і правядзе найбліжэйшы год. Ці вернецца Ягор у баскетбол і калі вернецца, то ў якой якасці, ён і сам пакуль не ведае.

— Рашэнне спыніць кар'еру было абдуманым, я год да яго псіхалагічна рыхтаваўся. Ужо адзінацаць гадоў у мяне маецца гэты «хвост»— я не давучыўся цэлы год. Прыйшоў час давесці пачатае да канца. «Спартыўнае кіраванне і турызм» — гэта мая спецыялізацыя, якую я на практыцы выдатна ведаю і бачу штодзень — як арганізоўваць працу каманды, каб гульцы больш адпачывалі, а не марнавалі час у аэрапортах. Я спакойна іду ў гэты адпачынак.

Мінулы сезон, які баскетбаліст правёў у піцерскім «Спартаку», быў не надта ўдалым. Ягор атрымаў траўму калена, пасля чаго прыйшлося перанесці аперацыю.

— У клубе нармальна паставіліся да майго рашэння ўзяць паўзу. Кантракт скончыўся: дзякуй, і да пабачэння.

Праўда, сувязь з баскетболам Ягор губляць не збіраецца:

— Ва ўніверсітэце Джорджа Вашынгтона я буду працаваць разам з мясцовай камандай і як мінімум пяць разоў на тыдзень апранаць форму, — паабяцаў баскетбаліст. — Я ж прафесіянал, і сабаку з'еў на фізічнай падрыхтоўцы.

Сувязь з баскетболам на радзіме таксама застанецца. Рэч у тым, што Мешчаракоў з'яўляецца бадай што адзіным дзейным беларускім спартсменам, які адкрыў сваю дзіцячую школу. Яна мае назву «Баскетбольны клуб Мешчаракова», і працуе пакуль крыху больш за два гады. Пачыналася школа з летніх лагераў «Мінскія драконы», якія ў 2007 годзе на свае сродкі арганізаваў Мешчаракоў. Цяпер на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі займаюцца тры ўзроставыя групы. Рэктар універсітэта Міхаіл Батура, дарэчы, прыхільна ставіцца як да Ягора, якога памятае па выступленнях за каманду БДУІР, так і да ідэі прытуліць ва ўніверсітэцкай спартыўнай зале юных баскетбалістаў.

Нягледзячы на тое, што школа носіць імя Мешчаракова, выхаванцы пакуль асабіста не былі знаёмыя са знакамітым баскетбалістам. Учора Ягор ліквідаваў гэты недахоп і арганізаваў майстар-класы. Пазнаёміцца са славутым спартсменам прыйшлі ледзь не ўсе выхаванцы клуба, некаторыя прыехалі спецыяльна з летніх лагераў. Многія прыйшлі нават з бацькамі. «Гэта і ёсць той самы Мешчаракоў? — пытае жанчына, калі Ягор на калідоры гутарыць з адным з юных баскетбалістаў, і дадае з захапленнем: — А я ўсё думала, чаму сын заказаў майку з нумарам 55. Дык гэта Мешчаракоў пад ім гуляе».

Пакуль у баскетбольным клубе Мешчаракова могуць займацца ўсе ахвотныя, заняткі для дзяцей бясплатныя:

— Мы ні ў якім разе не збіраемся зарабляць на дзецях. Калі я арганізоўваў лагер «Мінскія драконы», я ўбачыў, што ў дзяцей гараць вочы. І вырашыў даць ім тое, што ў свой час давалі нам — залу, форму. Дзве баскетбольныя школы для Мінска з насельніцтвам у 2 мільёны — гэта катастрафічна мала. Напрыклад, у Рызе з насельніцтвам у 800 тысяч 9 баскетбольных школ. Да таго ж я не хачу марынаваць дзяцей у беларускай спартыўнай прасторы. Я планую прывезці ў Мінск сваіх сяброў са зборнай Латвіі, Расіі, якія будуць рэгулярна праводзіць майстар-класы, да таго ж дзеці ездзяць на турніры ў Прыбалтыку, Польшчу, іншыя краіны Еўропы.

Хоць здаецца, што галоўнай мэтай Ягора падчас стварэння школы была ўсё ж такі папулярызацыя баскетбола. Гулец расказаў пра стаўленне ў нас да гэтага віду спорту.

— Калі казаць пра мужчынскую зборную, то літаральна да гэтага лета нічога не мянялася гадоў пяць-шэсць, нават больш. Зборы, заработныя платы, працоўныя кніжкі гульцоў — усё было, як і дзесяць гадоў таму. Цяпер у зборнай шмат зменаў, у прыватнасці новы трэнер, і хочацца верыць, што ўсё да лепшага. Міхаіл Аркадзьевіч Фейман быў адным з маіх першых трэнераў, я ў яго веру і спадзяюся, што ў яго ўсё атрымаецца ў зборнай.

— А калі мець на ўвазе ўвесь баскетбол?

— Наша жаночая зборная сур'ёзна заявіла пра сябе ў Еўропе і свеце. І я чакаў большага рэзанансу, але нічога не было зроблена. Дзяўчаты заваявалі «бронзу» на чэмпіянаце Еўропы, уся краіна глядзела і хварэла за іх, пасля гэтага ніякіх высноў зроблена не было. Што я маю на ўвазе: адчынілі б пару школ для дзяўчат, упэўнены, што на гэтай хвалі было шмат ахвотных займацца. Але ніякага рэзанансу сярод спартыўных чыноўнікаў гэта не выклікала. Прабіліся на Алімпіяду — малайцы, і ўсё, цішыня. І тым часам залу «Гарызонта», якая была адзінай базай для жаночай зборнай, страцілі. Вось такое стаўленне да баскетбола.

Усё ж такі хочацца верыць, што наша зборная (напрыклад, жаночая) гучна заявіць пра сябе і на чэмпіянаце свету, куды таксама прабілася. А ў школе Ягора Мешчаракова вырасце яму сапраўдная змена, якая не горш за жаночую каманду зможа нарабіць шуму ў Еўропе і свеце.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

9 МОДНЫХ ЖАНОЧЫХ РЭЧАЎ, якія НЕ падабаюцца мужчынам

Амаль усе найбольш папулярныя сярод дзяўчат рэчы падаюцца мужчынам несэксуальнымі, непрывабнымі і наогул дзіўнымі.
Вось як выглядае топ прадметаў гардэроба і аксесуараў, якія жанчыны памылкова лічаць сэксуальнымі.

1. Шаравары ва ўсходнім стылі (яны ж афгані)

Нічога дзіўнага, што гэтыя бясформенныя штаны трапілі ў мужчынскі антырэйтынг. Яны ж хаваюць жаночыя ногі. Як заўважыла адна з фэшн-крытыкаў, у такіх шараварах дзяўчына выглядае так, нібы ідзе па вуліцы ў яўна перапоўненым падгузніку. Каму такое відовішча спадабаецца? Да таго ж шаравары зрокава ўкарочваюць ногі, робяць клубы шырэйшымі і пераўтвараюць нават стройную дзяўчыну ў пародыю на Карлсана.

2. Камбінезоны

Дзяўчатам не варта забывацца, што такое адзенне не толькі складана надзець (гузікі, складкі і швы паўсюль!), але, што асабліва абурае мужчын, немагчыма хутка зняць. Па меркаванні мужчын, у лепшым выпадку жанчына ў камбінезоне выглядае як маленькая дзяўчынка ў дзіцячым касцюмчыку, а ў горшым — як цётка, якая збегла з 70-х гадоў.

3. «Угі»

Слова «угі» (Uggs) з'вілася дзякуючы аўстралійскай гандлёвай марцы Ugg, якая выпускае боты з авечай дубленай скуры. Прычым арыгінальныя боты з Аўстраліі па кішэні далёка не кожнаму, і таму рынак наваднілі бясконцыя копіі і падробкі, якія ўсё роўна называюць «угамі».

Зразумела, што мужчын раздражняе растыражаванасць — авечыя боцікі, якія на некаторых і насамрэч выглядаюць даволі міла, папросту прымільгаліся. «У іх няма формы — незразумела, дзе шчыкалатка, дзе пятка».

4. Павязкі на галаву

На галаве жанчыны, акрамя валасоў, наогул нічога не павінна быць, лічаць мужчыны. Ні заколак, ні гумак, ні ўпрыгажэнняў з пацерак, пер'яў і карункаў, ні нават геляў і лаку для валасоў. Прадстаўнікам мужчынскага полу, як паказала даследаванне, падабаецца гладзіць жанчын па галаве, і іх вельмі раздражняе, калі пад рукі пры гэтым трапляюцца якіясьці староннія прадметы — будзе гэта маленькае ўпрыгажэнне ці пасма валасоў, якая зляпілася ад вялікай колькасці лаку.

Павязкі на галаву, аказваецца, выклікаюць у мужчын асацыяцыі са шведскім тэнісістам Б'ёрнам Боргам, які не выходзіў на корт без махровай павязкі на галаве.

5. Сандалі-гладыятары

Што не так з гладыятарамі? Тое ж, што і з камбінезонамі — з імі трэба доўга вазіцца, а калі нарэшце знімеш іх з жаночай ножкі, то ўбачыш адбіткі ад раменьчыкаў. Той факт, што адбіткі на скуры застаюцца практычна ад любога адзення і абутку, прадстаўнікі моцнай паловы чалавецтва за аргумент не лічаць. Да таго ж, аказваецца, тыя ж раменьчыкі яшчэ і зрокава ўкарочваюць ногі дамы. Нават калі гэта гладыятары на абцасе ці танкетцы.

6. Легінсы

Моцны пол лічыць, што легінсы несэксуальныя таму, што вузенькія штонікі — гэта амаль непрыкрыты сэкс. «Няма ніякай загадкі, усё бачна і зразумела. Вось яе ногі, вось яе попа. Што тут цікавага», — сцвярджаюць мужчыны. Акрамя таго, легінсы не дагадзілі мужчынам яшчэ і тым, што яны вельмі камфортныя. «Як толькі жанчына прывыкае насіць такое простае і зручнае адзенне, шляху назад ужо няма», — адзначаюць прадстаўнікі моцнага полу. З другой прэтэнзіі выцякае і трэцяя: камфорт падабаецца ўсім, таму легінсы носяць і пышныя прыгажуні. А вось мужчыны лічаць гэта недапушчальным. «Іх ногі становяцца падобнымі на сардэлькі», — аргументуе мужчынскі пол. Але ж цікава: з якога гэта часу сардэлькі падаюцца мужчынам неапетытнымі?

7. Смокінгі

Рэч у тым, што нават сэксуальны жаночы смокінг — гэта нязручнае адзенне, якое закрывае рукі і зону дэкальтэ. Мужчыны, якія, як вядома, кахаюць вачамі, выкарыстоўваюць свой любімы аргумент — мы простыя істоты і не любім загадкавасці і таямнічасці, і таму нам не падабаюцца смокінгі.

8. Камбінезоны з адкрытай спінай

Ніякіх асацыяцый з дзяўчаткамі з пясочніцы паўкамбінезоны ў прадстаўнікоў моцнага полу не выклікаюць. Ім падаецца, што ў такім уборы жанчына больш падобная на будаўніка. Такое ўражанне ў мужчын складваецца ад таго, што жаночая фігура, па іх меркаванні, выглядае ў свабодным камбінезоне з адкрытай спінай як аловак у шклянцы. Іх не задавальняе тое, што яны не бачаць ніякай фігуры, бо яе хавае злашчасны камбінезон. І яшчэ мужчынам не падабаюцца тканіны, з якіх шыюць такія камбінезоны (яны даволі грубыя).

9. Вельмі вялікія сонечныя акуляры

Мужчынам вельмі вялікія сонечныя акуляры падаюцца падазронымі. Яны лічаць, што ў акулярах, якія закрываюць палову твару, жанчына выглядае так, нібы ў яе жыцці якіясьці праблемы. Магчыма, яна злоўжывае алкаголем, ці хаваецца ад кагосьці, а магчыма, у яе велізарны сіняк — хто ведае? Ну а галоўны казус, які звязаны з вялікімі акулярамі, — гэта немагчымасць пацалаваць жанчыну. А калі нельга пацалаваць, то якая ўжо тут сэксуальнасць? Што перашкаджае іх зняць перад пацалункам, абсалютна незразумела, але мужчыны лепш ведаюць.

Як бачна, мужчынам не падабаецца вельмі многае з тых рэчаў, што так палюбілі жанчыны. Але ж і не ўсе жанчыны набываюць абноўкі выключна дзеля таго, каб ачмураць натоўп незнаёмцаў. Многім хочацца падабацца перш за ўсё самім сабе.

НЕПЕРАМОЖНЫ ДАВЫД ГАРАДЗЕНСКІ — ГРАЗА КРЫЖАНОСЦАЎ

15 ліпеня спаўняецца 600 гадоў Грунвальдскай бітве. Да гэтага юбілею ў мінскім выдавецтве «Харвест» падрыхтавана ўнікальная кніга «Крыжаносцы. Грунвальдская бітва», у якую ўвайшлі практычна невядомыя матэрыялы двухсотгадовага перыяду супрацьстаяння Белай Русі агрэсіі крыжакоў. Па сутнасці, гэта хрэстаматыйная гісторыя «Націску на Усход», выкладзеная, перш за ўсё, самімі крыжаносцамі, іх хранікамі, летапісцамі, удзельнікамі падзей. Многія дакументы не перавыдаваліся стагоддзямі. Адзін з матэрыялаў, прысвечаных нашаму земляку, непераможнаму Давыду Гарадзенскаму, прапаноўваецца ўвазе чытачоў.

ПЕРШЫ крыжовы паход германцаў супраць славян рымскі папа Яўген III благаславіў яшчэ ў 1147 годзе. Ударнай сілай крыжакоў на ўсходзе Еўропы сталі германскія рыцарскія ордэны, запрошаныя польскімі феадаламі, якія хацелі чужымі рукамі расправіцца з язычнікамі-прусамі. Першы крыжовы паход у Прусію, арганізаваны ў 1222 годзе, адбыўся пры актыўным удзеле анямечаных польскіх князёў Генрыха Сілезскага і Конрада Мазавецкага, епіскапаў гнезненскага, вроцлаўскага, кракаўскага, познанскага і іншых феадалаў.

Крыжаносцы хутка адчулі сябе гаспадарамі на чужых землях. У XIII ст. яны атабарыліся на ніжняй Вісле, пачалі захопліваць адну вобласць за другой. Падпарадкоўваючы і выразаючы прусаў і палабскіх славян, тэўтоны пранікалі на балцкія і славянскія землі, адсякаючы нашым продкам выхад да Балтыйскага мора. З 1203 па 1413 год насельніцтва Белай Русі перанесла мноства ваенных паходаў.

Землі Белай Русі і Літвы шчодра паліты крывёй іх лепшых сыноў. Дарога да перамогі густа выслана целамі многіх тысяч бясстрашных і слаўных віцязяў. Акрамя сцягоў нямецкіх рыцараў, тут развіваліся харугвы рыцараў Англіі, Францыі, многіх іншых краін Еўропы. Чатыры разы (беспаспяхова) — у 1250, 1314, 1391 і 1394 гг. — крыжакі штурмавалі Навагрудак. Пяць разоў — у 1333, 1366, 1382 і 1386 гг. — бачыў іх горды і няскораны горад Полацк. Тройчы — 1384, 1392, 1394 гг. — яны спрабавалі ўзабрацца на высокія сцены Лідскага замка. Бачылі іх пад сваімі сценамі Крэва, Брэст, Камянец, Ваўкавыск, Мядзел, Дзісна, Браслаў, Свір і шматлікія вёскі, па якіх не раз праходзілі разбуральныя войны...

Аднак найбольшую славу непрыступнай цвярдыні, пра якую ведала ўсё еўрапейскае рыцарства, атрымаў старажытны Гродна. «Гарта», ці «замак Гартэн», як яго называлі прускія храніты. Пачынаючы з 1284 і па 1402 год, крыжаносцы ажыццявілі на гэтае арлінае гняздо Панямоння каля трыццаці паходаў. Паход «на Гартэн» лічыўся вышэйшай адзнакай і гонарам для прадстаўніка маладога еўрапейскага дваранства. З Германіі, Францыі, Швецыі, Галандыі, Даніі, Італіі, Іспаніі, Чэхіі і Англіі — атрад за атрадам ішлі крыжакі «на Гартэн». Хто іх толькі не ўзначальваў: магістр Тэўтонскага ордэна Конрад Тырнберг (1284 г.), камтуры Кёнігсберга і Брандэнбурга, магістры Лівонскага ордэна і англійскія графы Чэмберлены, Нортумберленды і Бэдфорды.

Больш за чвэрць стагоддзя абаронай Гродна кіраваў непераможны князь Давыд Гарадзенскі, які са сваёй дружынай хадзіў на дапамогу Навагрудку і Пскову, ажыццяўляў кінжальныя рэйды ў Прусію, пад Брандэнбург і Франкфурт-на-Одары. Яго называлі «гразой крыжаносцаў». Быў ён праўнукам Аляксандра Неўскага і сынам Даўмонта Пскоўскага... Пра князя Аляксандра ведаюць усе, ён залічаны праваслаўнай царквой да ліку святых (як і бацька Давыда). Імя ж нашага земляка, на жаль, вядомае нямногім. Спадзяюся, што гэтая памылка ў хуткім часе будзе выпраўленая, і ля сцен старажытнай Каложскай царквы (дзе, згодна з паданнем, яго пахавалі) каля памятнага каменя будзе пастаўлены помнік непераможнаму гарадзенскаму князю, а яго імя зойме годнае месца на старонках падручнікаў.

ДАВЫД з'явіўся на свет у Пскове. Даўмонт, яго бацька, князь нальшанскі, быў адным з самых паважаных людзей у Літве. Але ў 1263 годзе яго абразіў навагрудскі князь Міндоўг. Заставацца пасля гэтага на радзіме Даўмонт не мог. У 1266 годзе ён «ад'язджае» з усім сваім дваром і трыма сотнямі баяр у Пскоў. Тут ён прыняў праваслаўе, атрымаў імя Цімафей і стаў служылым князем. Узначаліў барацьбу пскавічоў супраць крыжакоў. У барацьбе з «бязбожнымі немцамі» і раскрыліся палкаводчыя здольнасці Даўмонта. Яшчэ больш умацаваў яго становішча шлюб з Марыяй, унучкай Аляксандра Неўскага. У іх сям'і нарадзіўся хлопчык, які выхоўваўся як воін.

Памятны знак Давыду Гарадзенскаму каля Каложскай царквы (Гродна).

Нямецкія рыцары бесперастанна нападалі на землі Вялікага Княства Літоўскага, рабавалі і спусташалі іх. У 1284 годзе яны нават узялі Гродна і разбурылі ўшчэнт. Вялікі князь літоўскі ў хуткім часе адбудаваў горад, і, бачачы, што намаганні крыжаносцаў бесперапынна накіраваны на гэты важны пагранічны пункт (склад ваенных запасаў ВКЛ) пабудаваў у ім новыя ўмацаванні, павялічыў гарнізон. Начальства над горадам і вобласцю даручыў сыну Даўмонта Пскоўскага, якога вялікі князь літоўскі ўзяў да сябе на службу і прызначыў кашталянам (камендантам) Гродна, а ў хуткім часе выдаў за яго замуж сваю прыгажуню-дачку Бірутэ.

Упершыню Давыд праявіў свае здольнасці ў 1305 годзе, калі шматлікае войска крыжаносцаў на чале з Конрадам Міхтэнхагенам, напала на Гродна. Спробы захапіць горад не ўдаліся, а праз два дні на дапамогу падышлі войскі Гедыміна. Крыжакі былі разбітыя. На наступны год спробу захапіць Гродна зрабіў іншы Эферхард фон Вірнэрбург з Кёнігсберга, які прывёў з сабой сотню рыцараў і 6 тысяч лёгкаўзброеных вершнікаў. Але яны змаглі захапіць толькі неўмацаваную гандлёва-рамесную частку горада — пасад. Замак жа ўстаяў. Гродзенцы адбілі ўсе штурмы. Не змаглі захапіць горад крыжаносцы і ў 1311 годзе.

У верасні 1314 года пад правадырствам магістра Генрыха фон Плоцке крыжакі ў чарговы раз асадзілі Навагрудак. Яны захапілі і спалілі горад. Жыхары і гарнізон, якія ўцалелі, схаваліся ў замку. Тады ворагі разбілі каля сцен лагер і заняліся рабаваннем. Абложаныя вырашылі адправіць ганца ў Гародню, да ваяводы Давыда Гарадзенскага, які не пацярпеў у бітвах з Ордэнам ніводнага паражэння.

НАВАГРУДСКІ замак узвышаўся на высокім узгорку. Дабрацца да яго сцен рыцарам у цяжкіх даспехах было няпроста, і яны пакінулі іх у абозе. Абложаныя засыпалі крыжаносцаў коп'мі, стрэламі з лукаў і арбалетаў, камянямі, спускалі па схілах гары вялізныя бярвёны. Навагрудцы прымусілі ворага адступіць.

У самы разгар штурму пад сценамі замка з'явіўся Давыд Гарадзенскі. Сіл у яго было мала — толькі дружына і невялікі атрад гродзенскага апалчэння. Давыд перабіў ахову і захапіў лагер рыцараў. У яго рукі трапіла вялізная здабыча — 1.500 баявых коней, уся воінская амуніцыя, правіянт, абоз.

Давыд не толькі адбіваў пастаянныя напады крыжакоў. Ён наносіў рыцарам удары ў адказ. Па адной з версій, традыцыйны сімвал Вялікага Княства Літоўскага, Пускага і Жамойцкага — Пагоня — канчаткова аформіўся менавіта дзякуючы гэтым паходам «па слядах» крыжаносцаў. Вясной 1319 года 800 вершнікаў прайшлі адну з найбагацейшых абласцей Прусіі. Захапіўшы вялікую ваенную здабычу і мноства палонных, Давыд Гарадзенскі вярнуўся дамоў.

БАРАЦЬБА з крыжаносцамі патрабавала аб'яднання ўсіх сіл. Разумеючы гэта, Давыд імкнуўся дапамагчы і суседзям. Калі ў 1322 годзе рыцары напалі на Пскоў, пскавічы «послаша гонца до князя Давыдка». З яго дапамогай напад крыжакоў быў адбіты. Але на наступны год дацкія рыцары зноў напалі на пскавічоў, захапілі Гдоў, забілі пскоўскіх паляўнічых, рыбакоў і купцоў, якія займаліся промыслам на берагах возера Пейпус і ракі Нарвы. Пскавічы зноў звярнуліся па дапамогу да Давыда. Гродзенскі стараста неадкладна сабраў паляўнічых і рушыў з імі да месца свайго нараджэння. Пскавічы сабраліся натоўпамі пад сцягі Давыда. Войска гарадзенскага князя разам са пскавічамі адбіла націск датчан. Па словах нямецкага храніста, «рускія з Пскова з дапамогай літоўцаў спустошылі зямлю караля Даніі і забілі каля 5 тысяч чалавек». Давыд узяў каля тысячы палонных, перадаў усё захопленае пскавічам і вярнуўся ў Гродна.

Рыцары вырашылі адпомсціць за гэта разбурэннем Пскова. У маі таго ж года яны аблажылі Пскоў, але праз тры дні знялі аблогу і сышлі. Праз два месяцы іх войска зноў аказалася пад сценамі Пскова.

Рыцары пакінулі за сваёй спінай Ізборск. Пскоўскі князь Астафій (Яўстафій), сабраўшы ізбаран, напаў на немцаў з тылу.

Прыбыццё ізборскага намесніка, князя Яўстафія, з свежым войскам, якое ўдарыла ў тыл крыжаносцам, спыніла на час поспехі рыцараў. Але пасля адбіцця Яўстафія яны «стеснили город более прежняго». Пскавічане зноў звярнуліся да Давіда.

Праз некалькі дзён сын Даўмонта з'явіўся з войскам пад сценамі горада, разграміў мечаносцаў, адабраў у іх здабычу, сцягі і ваенныя снарады і прымусіў заключыць з пскавічанамі васьмігадовае прымірэнне. Рыцары былі разгромленыя. Аблога Пскова працягвалася 18 дзён.

Крыжаносцы бачылі ў Давыдзе Гарадзенскім свайго найбольш небяспечнага ворага, і пакольні не мелі сілаў знішчыць яго ў баі, вырашылі зрабіць інакш. У сакавіку 1324 года тры нямецкія рыцары і шэсцьсот воінаў, тайна падкраўшыся да памесця Давыда, спалілі яго. Яны забілі больш за тры дзясяткі жыхароў, у тым ліку сям'ю князя. У адказ на гэта князь Давыд нанёс паражэнне рыцарам у Мазовіі.

У 1326 годзе гродзенскі стараста з невялікай колькасцю воінаў ажыццявіў паход на Брандэнбург. Летапісец піша, што яны рабілі ў нямецкай зямлі тое ж, што крыжакі рабілі ў нас. Злучанае войска дайшло да Франкфурта-на-Майне. Саюзнікі, хутчэй за ўсё, узялі б і Брандэнбург, калі б Давыд не быў забіты ў сябе ў шатры кінжалам у спіну. Па другой версіі, паляк, які ехаў ззаду, забіў яго кап'ём у спіну. Яго забойца — польскі рыцар Анджэй Горст (Гост). Да гэтай пары дакладна не вядома, што падштурхнула яго на гэта. Хутчэй за ўсё, ён быў падкуплены крыжаносцамі. У польскай гісторыяграфіі гэта падзея ацэньваецца станоўча, маўляў, яна прадухіліла спусташэнне мазавецкіх зямель на адваротным шляху атрада.

Пасля расправы над забойцам князя дружыннікі на шчытах прынеслі цела Давыда ў Гродна, дзе, як гаворыць паданне, яго пахавалі побач з Барысаглебскай царквой. Над магілай быў насыпаны курган, які да нашых дзён не захаваўся.

Князь Давыд Гарадзенскі загінуў у самым росквіце, непераможным. За ўсё сваё жыццё ён не прайграў ніводнай бітвы. Яго лёс у гэтым падобны на лёс яго прадзеда Аляксандра Неўскага. Той, як вядома, не прайграў ніводнай бітвы і быў каварна атручаны. Магчыма, калі б не было гэтага здрадніцкага ўдару, нашы продкі пакончылі б з крыжаносцамі значна раней за Грунвальдскую бітву.

Мікалай МАЛІШЭЎСКІ. Фота аўтара.

Крымінал, здарэнне

Падпаліў уласны аўтамабіль

Каб атрымаць грошы па страхоўцы, 30-гадовы ўраджэнец Клічава «запусціў пеўня» ў сваю «Рэно Лагуну»

Спаліць машыну, паводле звестак прэс-афіцэра Партызанскага РУУС Андрэя Сасонкі, небарака вырашыў з-за цяжкасцяў з фінансамі: зарплату яму затрымлівалі, а падпрацоўкі не прыносілі істотнага даходу. Каб выправіць становішча, яму і галаву пайсці на аферу — спаліць уласны аўтамабіль «Рэно Лагуна», які быў застрахаваны па «Аўтакаска» на 6 тысяч еўра. Ноччу ён абліў газай багажнік і салон машыны і «запусціў пеўня». Калі справа была зробленая, «пацярпелы» выклікаў міліцыю, супрацоўнікам якой паскардзіўся на невядомых шкоднікаў. А потым папрасіў даведку для прадстаўлення ў страхавую кампанію. Падаўшы заяву на кампенсацыю нанесенага ўрону страхаўшчыкам, прайдзісвет чакаў выплаты. Толькі дарэмна спадзяваўся, што зрабіў усё бездакорна — падман у ходзе следства быў выкрыты, а ў адносінах да зламысніка заведзена крымінальная справа па факце махлярства. Такім чынам, замест вялікіх грошай хітрун цяпер можа атрымаць толькі да сямі гадоў пазбаўлення волі...

Ігар ГРЫШЫН.

У аўтааварыі загінула 18-гадовая дзяўчына

Фота Магілёўскага УМНС.

4 чэрвеня ўвечары ў Бабруйскім раёне паблізу пасёлка Глуша адбылася аўтааварыя, у якой загінула 18-гадовая дзяўчына і тры чалавекі атрымалі траўмы.

Паводле паведамленняў Магілёўскай ДАІ, аўтамабіль «БМВ» пайшоў на абгон і на паласе сустрэчнага руху сутыкнуўся з «ФІАТам». У выніку 27-гадовага вадзіцеля «БМВ» давялося выцягваць з аўтамабіля супрацоўнікам МНС з дапамогай спецыяльнага абсталявання. Малады мужчына і яго жонка шпіталізаваныя. Нязначныя траўмы атрымаў 27-гадовы вадзіцель «ФІАТа», а вось яго маладая пасажырка загінула на месцы.

Ілона ІВАНОВА.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 19 (350)

Дачныя падказкі

● У час гарачых дзён пры слабай вентыляцыі тэмпература паветра ў цяпліцы даходзіць да небяспечнага ўзроўню і расліны пачынаюць скідваць кветкі і завязі. Шкодныя з'яўляюцца і прамыя сонечныя промні, якія таксама выклікаюць ападзенне завязяў. Многае залежыць ад канструкцыі цяпліц. Трэба памятаць, што меншыя перапады тэмпературы ў цяпліц, устаноўленых у напрамку ўсход-захад. Лепшую вентыляцыю даюць адчыненыя дзверы і форткі, зробленыя ў даху. Адчыняць іх трэба зранку, каб зменшыць вільготнасць, якая накапілася за ноч. Калі тэмпература паветра вышэй за 25 градусаў, то няхай дзверы і форткі будуць адчыненымі ўвесь дзень, а пры цёплых начах — і ноч таксама. Калі вонкавыя сценкі цяпліцы папырскаць мелам (1,5—2 кг мелу на 10 л вады) з дабаўленнем 400 г малака, то гэта можа знізіць тэмпературу паветра ў цяпліцы.

● Пасля высадкі расады таматаў прымяняюць арганіку, напрыклад, кампост. Затым двойчы падкормліваюць нітрафоскай — 1 ст. лыжка на вядро вады. Калі плады пачнуць налівацца, ва ўгнаеннях прытрымліваюцца суадносінаў: 1 частка азоту, 4 часткі фосфару і 8 частак калію. Для гэтага ў ліпені на кожнае вядро раствору нітрафоскі дадаюць 1 чайную лыжку калімагнезію, праводзячы 3-4 такія падкормкі.

● Каб паскорыць плоданашэнне таматаў, трэба выдаляць старыя лісты, але не раней, чым праз 3-4 тыдні пасля пасадкі, калі пачнуць наліварца плады на першых кісцях. Абрываць варта не больш як 2-3 лісты з памідорнага куста ў тыдзень.

Як прымяняць птушыны памёт

Угнаенне, можна сказаць, адно з найбольш даступных і вельмі эфектыўных. Але трэба памятаць, што птушыны памёт — угнаенне вельмі канцэнтраванае, і завышаць дозы яго прымянення нельга. Пры перакопванні глебы на 1 кв. м уносяць 500 г сухога памёту. Пры пасадцы раслін у ямку ўносяць не больш чым 8—10 г пад адну расліну. Больш эфектыўнымі лічацца вадкія падкормкі: свежы птушыны памёт разбаўляюць вадой у суадносінах 1 кг на 10 л вады, сухі — 1 кг на 20 л вады. Як толькі памёт намокне, яго добра перамешваюць і ўносяць пад расліну адразу, не пакідаючы брадзіць. Раствор расходуюць па 2 л на 1 кв. м. Пасля таго як растворам палілі глебу каля расліны, трэба падсыпаць пад яе слой сухой глебы ў 1 см і паліць чыстай вадой.

Шкоднік морквы нумар адзін

Сапраўды, такі шкоднік морквы як маркоўная муха, прымушае гаварыць пра яе як мага больш, толькі каб абараніцца ад яе. Таму, калі вы не змаглі скарыстацца адным метадам, пра які мы гаварылі раней, паспрабуйце выкарыстаць другі, пра які нагадваем зараз.

Можна прыгатаваць раствор для апырскавання супраць маркоўнай мухі з сухіх раслін тамату: 1 кг сухой масы залiць 10 л вады, настойваць 4-5 гадзін, потым кіпяціць 2-3 гадзіны на слабым агні; разбавіць вадой у 2 разы, дадаць 30-40 г мыла на 10 л раствору. Апрацоўкі асабліва карысныя пры прараждванні морквы. Адпалохвае мух рэзкі пах, які захоўваецца пасля апрацоўкі раслінамі прэпаратамі на працягу 3-4 дзён.

Прараждванне пасеваў морквы праводзяць не пазней з'яўлення 2-3 сапраўдных лістоў, і тут патрэбна абавязковая ўборка заражаных раслін з градкі. Дапамагае і апудрыванне тытунёвым пылам, сухой гарчыцай (1 ст. лыжка на 1 кв. м), а таксама апырскванне настоямі часнаку: 200—300 г неачышчаных галовак растаўчы альбо дробна парэзаць і заліць 2 л гарачай вады, настойваць суткі. Раствор працадзіць, перад апрацоўкай дадаць вады да 10 л і развесці 30 г мыла; або 200—300 г часнаку прапусціць праз мясарубку, заліць 10 л вады, працадзіць і адразу ж выкарыстоўваць.

Няпрошаныя госці

Вусені капуснай бялянкі, соўкі і молі любяць любую капусту: белую ці чырвоную, квацістую ці брокалі. Але затое не любяць настою лістоў лопуху, які зусім нескладана прыгатаваць.

Для гэтага лісты лопуху трэба дробна парэзаць, запоўніць імі вядро на адну трэць і заліць даверху вадой. Праз тры дні настой працадзіць і апырскваць ім капусныя градкі адзін раз у тыдзень на працягу месяца. Рабіць гэта трэба ў час лёту матылькоў і пры першым з'яўленні вусеняў. Калі вы падловіце менавіта гэты час, то атрымаеце рэальны шанц пазбавіцца ад гэтых шкоднікаў да канца сезона.

Слімакі, якія натоўпам гуляюць па нашых агародах, любяць адпачываць у лопуху, але і гэта можна выкарыстаць на сваю карысць. Накрыйце градкі вялізнымі лістамі гэтай расліны, а калі слімакі з задавальненнем запаўзуць на іх, збярыце і знішчыце шкоднікаў.

Мурашы пакінуць тэрыторыю вашага агарода, калі вы раскладзяце па дарожках тое ж памідорнае бацвінне, пах якога ім зусім не падабаецца.

Як вызначыць дозу ўгнаенняў?

У такім выпадку можна скарыстацца звычайным запалкавым карабком ці вядром.

У **запалкавым карабку** ўмяшчаецца:

15 г мачавіны,
17 — амічнай салетры і сульфату амонію,
22 — натрыевай салетры,
18 — кальцыевай салетры і хлорыстага калію,
24 — парашкападобнага суперфасфату,
34 — фосфарнай мукі,
10 — драўніннага попелу,
12 — гашанай вапны.

У **вядры ёмістасцю 10 л** змяшчаецца:

10 кг старой парніковай або кампоснай зямлі,
5 — сухога торфу, столькі ж драўніннага попелу, птушынага памёту,
12 — дзярновай зямлі.

Агурочная трава

Батанічная назва гэтай расліны — барага, яе называюць яшчэ агурочнік, бурачнік лекавы. А яшчэ агурочная трава — шырока вядомы, праслаўлены меданос, які пчаляры высяваюць знарок побач з пчальнікамі. Нектар агурочніка так моцна прываблівае пчол, што яны не пакідаюць яго без увагі нават у час цвіцення ліпы.

Зяленіва агурочнай травы пахне свежым агурком, адкуль і пайшла назва. Дарэчы, смак лістоў даволі пасрэдны і расліна не асабліва папулярная ў агароднікаў, а дарэмна. Гэта расліна вельмі карысная і зусім непатрабавальная ў сэнсе вырошчвання. У ёй ёсць вітаміны і многа слізістых рэчываў, якія стымулююць засваенне ежы, асабліва сырой. Таму маладыя лісты карысна дабаўляць у свежыя салаты, халаднікі, супы, соусы, а таксама выкарыстоўваць для араматызацыі маянэзу, тварагу, сыру, фаршу.

У склад агурочнай травы ўваходзяць мінеральныя солі, калій, кальцый, мікраэлементы, многа крэмніевай і аскарбінавай кіслотаў, смолы, дубільныя і іншыя карысныя для здароўя людзей рэчывы. З яе дапамогай рэгулююць сардэчную дзейнасць і абмен рэчываў, яна выкарыстоўваецца як мачагонны сродак пры ацёках сардэчнага і ныркавага паходжання.

Адвары з маладых лістоў і кветак ачышчаюць кроў ад шлакаў, лечаць неўрозы, стомленасць, яны валодаюць заспакаяльным, патагонным, супрацьзапаленчым дзеяннем. Пры рэўматызме, запаленчых працэсах, а таксама каменях у нырках, печані гатуюць настой з 1 ст. лыжкі сухіх лістоў агурочнай травы на 250 мл кіпеню, дадаюць 2 чайныя лыжкі цукру і настойваюць 5 гадзін у закрытым посудзе, затым працэджваюць і выпіваюць усю дозу.

Нягледзячы на сваё паходжанне (а расце агурочная трава ў натуральных умовах у паўднёвых раёнах Расіі) яна ўстойлівая да холаду і непатрабавальная, культывуецца ў краінах з больш суровым кліматам, у тым ліку і ў нас у Беларусі. Прычым яе дастаткова пасеяць адзін раз, а далей яна будзе высявацца самастойна. Але трэба ведаць, што самасевам можа размнажацца і іншая расліна, падобная на барагу, якая ў нас атрымала распаўсюджанне — наперстаўка (наперстянка). Маладыя разеткі гэтай двухгадовай расліны на першы погляд вельмі падобныя на агурочную траву, але ў адрозненне ад апошняй, ядавітыя (асабліва лісты), таму што змяшчаюць сардэчны гліказід, які можа выклікаць рэзкае пагаршэнне крывянога ціску і нават спыненне сэрца. Таму перш чым выкарыстаць агурочную траву ў ежу або для лячэння, панюхайце лісты, якія павінны пахнуць агурком. Каб не ўзнікла блытаніны, памятайце, што барага — аднагадовая трава, вышыня 30—50 см. Ніжнія лісты маршчыністыя, прадаўгаватыя. Цвіце ў чэрвені-ліпені паніклымі блакітнымі або белымі кветкамі, падобнымі на зорачку. У культуры барагу вырошчваюць як дэкаратыўную, меданосную і лекавую расліну. Яна зусім непатрабавальная, вызначаецца ценевыносівасцю, хоць і любіць добра асветленыя і ўгноеныя ўчасткі з лёгкай глебай. Для ежы лісты збіраюць толькі ў маладым узросце, а для лячэння траву і кветкі нарыхтоўваюць у перыяд цвіцення.

ТРУС-ВОЛАТ І ДЗВЕ СЯМ'І ПЧОЛ

Супраць 84-гадовага пенсіянера заведзена крымінальная справа. Жыхара вёскі Ліпава Калінкавіцкага раёна пацягнула сярод ночы да суседкі ў сад. Адтуль ён выкраў 17 рамак разам з дзвюма пчалінымі сем'ямі. Міліцыя хутка знайшла сталага спусташальніка чужых вулляў — мядку хлебануць удосталь ён не паспеў. Затрымалі праваахоўнікі і 52-гадовага выкрадальніка труса пароды «Волат». Звярка з прыватнага домаўладання ў Нароўлі сцягнуў раней судзімы мясцовы жыхар. Трус зноў грызе моркву ў роднай клетцы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

БОГ ПАДСЦІЛАЕ САЛОМКУ

Дзяўчынка, якой 6 гадоў, выжыла пасля падзення з 4 паверха. У Магілёве, на праспекце Пушкіна, малая па неасцярожнасці выпала з балкона, аднак упала на зямлю, на мяккі грунт. Медыкі каментуюць, што цяпер жыццю дзяўчынкі нічога не пагражае, аднак ёй трэба залячыць чэрапна-мазгавую траўму і выцятыя месцы. Калі б яна ўпала на асфальт, то наступствы падзення былі б больш цяжкія.

Алена КАЗЛОВА.

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 09 июля 2010 г. в 11.00 состоится ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Весоприбор», в составе:

Номер лота	Наименование оборудования	Модель	Инв. № / Зав. №	Начальная цена продажи, рублей без НДС	Размер задатка, руб.	Характеристика оборудования
Лот № 1	Автопогрузчик	40814	1353 / 325	6 519 882	651 990	1991 г.в., состояние удовл.
Лот № 2	Вертикально-сверлильный станок	2 Н 125	448 / 1210	2 423 854	242 390	1973 г.в., состояние удовл.
Лот № 3	Вертикальный консольно-фрезерный станок	6 Р 11	726 / 120	6 372 449	637 240	1979 г.в., состояние удовл.
Лот № 4	Вертикальный консольно-фрезерный станок	6 Р 11	729 / 122	6 018 424	601 840	1979 г.в., состояние удовл.
Лот № 5	Вертикальный консольно-фрезерный станок	6 Р 12	762 / 127	4 558 491	455 850	1979 г.в., состояние удовл.
Лот № 6	Вертикальный консольно-фрезерный станок	6 Р 12 Б	763 / 128	6 968 628	696 860	1979 г.в., состояние удовл.
Лот № 7	Вертикально-сверлильный станок	2 Н 125	785 / 133	2 566 433	256 640	1979 г.в., состояние удовл.
Лот № 8	Вертикально-сверлильный станок	2 Н 125	520 / 65	2 423 854	242 390	1974 г.в., состояние удовл.
Лот № 9	Пресс однокривошипный ус. 40 т	КД 212 Е	733 / 420	5 126 835	512 680	1980 г.в., состояние удовл.
Лот № 10	Внутришлифовальный станок	3 К – 227 А	42 а / 1125	14 920 220	149 200	1975 г.в., состояние удовл.
Лот № 11	Горизонтальный консольно-фрезерный станок	6 Н 81 Г	765 / 129	4 018 745	401 880	1979 г.в., состояние удовл.
Лот № 12	Горизонтальный консольно-фрезерный станок	6 Р 81 Г	976 / 146	3 886 513	388 650	1981 г.в., состояние удовл.
Лот № 13	Ножницы пазовые	-	1205 / 186	1 614 045	161 400	1975 г.в., состояние удовл.
Лот № 14	Плоскошлифовальный станок	3 Л 722 А	1117 / 103	17 188 964	1 718 900	1990 г.в., состояние удовл.
Лот № 15	Пресс гидравлический одностоечный	П 6326	698 / 1132	5 640 820	564 080	1978 г.в., состояние удовл.
Лот № 16	Круглошлифовальный станок	3 В 110	478 / 1123	7 591 131	759 110	1973 г.в, состояние удовл.
Лот № 17	Станок вертикально-расточной	2 У 430	31 а / 1119	5 140 900	514 090	1966 г.в., состояние удовл.
Лот № 18	Станок токарно-винторезный	1 К 62	895 / 1262	4 316 513	431 650	1980 г.в., состояние удовл.
Лот № 19	Термопласт автомат	Д 3132 - 25	1192 / 423	8 973 883	897 390	1985 г.в., состояние удовл.
Лот № 20	Термопласт автомат	Д А 3130 - 125	679 / 1129	6 849 888	684 990	1980 г.в., состояние удовл.
Лот № 21	Термопласт автомат	Д 3330 - 125	1896 / 241	5 368 715	536 870	1993 г.в., состояние удовл.
Лот № 22	Токарно-винторезный станок	1 М 61 П	936 / 144	3 165 373	316 540	1981 г.в., состояние удовл.
Лот № 23	Токарно-револьверный станок	1 К 341	710 / 119	4 268 086	426 810	1979 г.в., состояние удовл.
Лот № 24	Точильно-шлифовальный станок	3 К 633	1834 / 111	2 383 727	238 370	1992 г.в., состояние удовл.
Лот № 25	Установка высокочастотная закалочная	ВЧГ 6-60/0,44	1281 / 409	7 903 919	790 390	1987 г.в., состояние удовл.
Лот № 26	Универсальный заточной станок	3 В 641	134 / 89	4 190 557	419 060	1977 г.в., состояние удовл.
Лот № 27	Пресс однокривошипный ус. 6,3 т	КД 2118 Б	694 / 1131	2 634 613	263 460	1980 г.в., состояние удовл.

Местонахождение лотов	г. Бобруйск, ул. Дзержинского, 14/1
Условия продажи	аукцион без условий
Организатор торгов	Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» (р/с 3012035310012 в Филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской обл., код 331, УНН 102353509)
Место проведения торгов и подачи документов	г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация» в рабочие дни с 8.30 до 17.30
Срок заключения договора купли-продажи	в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Условия оплаты	по договоренности Победителя торгов с Собственником имущества при заключении договора купли-продажи
Номер р/с для перечисления задатка	Получатель платежа ОАО «Весоприбор» – р/с 3012000002968 в филиале 703 ОАО СБ «Беларусбанк» г. Бобруйск, код 760, УНП 700090810
Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка	по 08 июля 2010 г. включительно

Для участия в аукционе в адрес Организатора торгов необходимо предоставить: заявление на участие; заверенную банком копию платежного поручения о внесении размера задатка, паспорт; **для резидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – доверенность представителю юр. лица (в случае необходимости таковой), копии и оригиналы учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации; представителям физ. лиц – нотариально заверенную доверенность; **для нерезидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена не ранее чем за 6 мес. до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; **юр. лицам и физ. лицам** – документ о состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (рус.) язык; **представителям юр. и физ. лиц** – легализованную в установленном порядке доверенность.

Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Задаток, внесенный Победителем, будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного имущества, остальным участникам будет возмещен в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. В случае, если заявка на участие в аукционе подана только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. **Организатор торгов или Продавец вправе снять объект с торгов до объявления его проданным.**

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляет Победитель (Претендент на покупку) не позднее 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов.

Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.

Бывай, школа!

У ВЫПУСКНЫМ КЛАСЕ САША ВАРЛАМАЎ МАРЫЎ СТАЦЬ АРТЫСТАМ БАЛЕТА, А ВАЛЕРЫЙ КАШЧЭЕЎ — МАРСКІМ АФІЦЭРАМ

11 ГОД «строгага рэжыму» ці сапраўдная альма матэр? Чужыя людзі, з якімі на пэўны час звёў лёс, ці найлепшыя сябры на ўсё жыццё? Кардонная папка з фотаздымкамі, што пакрываецца пылам, ці крыніца светлых успамінаў пра цудоўныя школьныя гады? Узаемаадносіны са школай ва ўсіх складваюцца па-рознаму, і ўсё ж у час развітання з ёй мала каму не робіцца сумна...
Сёлета ў Беларусі выпускныя вечары адбудуцца 11 чэрвеня, і больш за 88 тысяч юнакоў і дзяўчат атрымаюць разам з атэстатамі пуцёўкі ў дарослае жыццё. Напярэдадні гэтай даты журналісты «Звязды» распыталі некалькіх папулярных суайчыннікаў: у каго якія ўспаміны звязаныя са школьным выпускным?

Саша ВАРЛАМАЎ, кіраўнік «Цэнтра моладзевай моды БДУ», год выпуску 1973

— Са школай у мяне звязаныя самыя лепшыя ўспаміны: менавіта будучы школьнікам, я палюбіў тэатр. Я вучыўся ў Беларускім дзяржаўным харэаграфічным вучылішчы, якое было тады якраз ля Вялікага тэатра оперы і балета. І, вядома, прыходзіць у Оперны тэатр кожны дзень і дыхаць ягоным паветрам — нават да сёння памятаю той пах, які меў тэатр — гэта вельмі цікава. З раніцы да вечара бавіць там час было для мяне шчасцем».

Дарэчы, у школе Варламаў марыў стаць... артыстам балету. «Я ўвогуле не думаў, што буду нейкім чынам звязаны з модай. У 25 гадоў поштай нечакана прыйшла паштоўка — мяне запрашалі ў Дом мод № 2 для таго, каб стаць манекеншчыкам. Вось так я трапіў у моду».

Як гэта было. Наконт свайго выпускнога вечара дызайнер асабліва не распаўсюджваецца:

— Я жыву закрытым жыццём. Да людзей, з якімі я вучыўся ў школе, я адношуся проста як да людзей, з якімі вучыўся ў школе. Мае сябры — гэта не мае аднакласнікі. Таму я і не хадзіў на выпускныя вечары — мне было там нецікава.

— Можаце ўзгадаць школьную моду тых часоў?

— Апраналіся проста: у тое, што было. Людзі жылі сціпла і небагата. У кагосьці былі джынсы, у кагосьці іх не было. Адны адзявалі касцюм з гальштукам, другія не адзявалі. Вось і ўсё.

Што потым. Пасля заканчэння ўніверсітэта культуры і аспірантуры ГИТИС (Масква) працаваў мадэллю і харэографам, пісаў навуковыя артыкулы для энцыклапедыі «Этнаграфія Беларусі», стварыў музей прыкладнога мастацтва. Паступова прыйшоў да таго, чым займаецца і цяпер — мода і стыль. У 1999 годзе пры БДУ быў створаны Цэнтр сучаснага стылю і моды, кіраўніком якога Варламаў з'яўляецца і па сёння.

Сяргей НАГОРНЫ, кіраўнік мадэльнага агенцтва «Студыя моды Сяргея Нагорнага», год выпуску 1991, сталічная сш № 146 (цяпер гімназія)

Сяргей узгадвае, што вучнем быў старанным і дысцыплінаваным, але вучыцца ў школе яму было нецікава: «Мне падабаліся гуманітарныя навукі, але ў школьнай праграме акрамя літаратуры нічога карыснага я больш не знаходзіў».

Як гэта было. «Спачатку адзначалі за сталом, трохі танцавалі. Пад вечар пайшлі ў кавярню, вось ужо там павесяліліся ад душы — дадому вярнуліся толькі пад раніцу. Добра запомніліся радасныя ўсмешкі, прыгажуні-аднакласніцы (ужо без косак, у вячэрніх сукенках), хлопцы ў касцюмах. Для нас выпускны — гэта было развітанне з месцам, якое стала родным, да якога мы за гады вучобы паспелі прывязацца. Было адчуванне страты чагосьці важнага...

Запомніліся аднакласнікі, якія перабралі з алкаголем. А ім найбольш, відаць, запомнілася прыбіральня і хворая галава, якая трашчала пад раніцу» *(смяецца)*.

Што потым. «Па-сапраўднаму смак ведаў я адчуў толькі ў ВНУ — Інстытуце сучасных ведаў, куды паступіў на факультэт прадзюсарства ў сферы мастацтва», — адзначае Сяргей. У 1997 годзе пасля фестывалю альтэрнатыўнай моды «Персаніфікацыя» з'явіўся новы брэнд — студыя моды Сяргея Нагорнага. Цяпер яго добра ведаюць не толькі ў Беларусі, але і ў Італіі, Францыі, Вялікабрытаніі, Японіі, ЗША.

Тэлевядучы Валерый КАШЧЭЕЎ («Наша раніца», АНТ). Год выпуску — 1973, мінская школа № 116

Сцвярджае, што ў школе быў вельмі паслухмяным, хоць і сядзеў за апошняй партай на «камчатцы», якую звычайна аблюбоўваюць хуліганы:

— Я быў такі правільны, што ні кроку ўлева-управа, не рабіў па-добраму хуліганскіх учынкаў, таму і ўзгадаць асабліва няма чаго. Ну хіба тое, што школа ў нас была з матэматычным ухілам, хоць, па шчырасці, я так і не зразумеў, дзе той ухіл. У той год было 5 выпускных класаў, прычым не маленькіх, у кожным чалавек па дваццаць — у нас, напрыклад, быў 10-ты «Д». Ужо здадзеныя былі апошнія экзамены, і многія рыхтаваліся да паступлення. Мяне цягнула ў Пісцер у ваенна-марское вучылішча — уяўляеце, жыццё магло б скласціся зусім па-іншаму, быў бы цяпер афіцэрам... (Смяецца).

Як гэта было. Урачыстая частка выпускнога вечара, як, бадай, ва ўсіх, адбывалася ў актавай зале школы, дзе настаўнікі давалі наказы вучням, а тыя паказвалі невялікі «капуснік». Дзякуючы апошняму ў характарыстыцы Валерыя класны кіраўнік напісала акрамя іншых станоўчых якасцяў — «Добра чытае вершы».

— Памятаеце тагачасную выпускную моду?

— Увогуле тады ў модзе былі ваенныя партупеі пад джынсы, і за гэтыя джынсы, а таксама за штаны клёш, упрыгожаныя ў каго махрамі, у каго нашытымі засцежкамі-«маланкамі», нас ганялі неміласэрна. Таксама строга сачылі за прычоскамі, каб мы не адпускалі доўгія валасы, але ў каго вусы ўжо прабіваліся, дазвалялася «пафарсіць». Дзяўчатам жа даставалася за спадніцы міні — выстройвалі ў шарэнгу і правяралі, у каго якой даўжыні спадніца... Што да самога выпускнога вечара, то мне здаецца, тады да выбару касцюмаў ставіліся прасцей. Не было святочных стужак «Выпускнік», як цяпер, але ўсе дзяўчаты нарабілі сабе прычосак, падабралі ўборы, былі такія прыбраныя, прыгожыя. У мяне таксама, здаецца, быў нейкі новенькі касцюм клятчасты, даволі яркая кашуля.

Патанцавалі — пад Антонава, які быў тады вельмі папулярны, ВІА «Поющие гитары», «Там, дзе клён шуміць...», паспявалі крыху, — узгадвае тэлевядучы, — а потым бацькі арганізавалі нам рэстаран «Заслаўе», тады вельмі модны.

— Рэстараны і алкаголь тады не былі пад забаронай?

— Не. І мы вельмі добра пагулялі. Хоць асабіста я да арміі ўвогуле ў рот алкаголю не браў, дый дагэтуль піва не люблю, а моцныя напоі ўжываю рэдка. А некаторыя нашы хлопцы крыху падвыпілі, натуральна, але без ніякіх эксцэсаў. Дадому вярталіся пешшу, ужо раніцай...

Што потым. Валерый паехаў у Ленінград у ваеннае вучылішча, але не здаў экзамены, вярнуўся дамоў, і яго тут жа забралі ў армію. «Пасля войска скончыў політэхнічны інстытут па спецыяльнасці «архітэктура», потым — тэатральна-мастацкі інстытут, а ўжо з тэатра трапіў на тэлебачанне. «Дарэчы, дзякуючы тэлебачанню абсалютна нечакана, праз 30 з лішкам гадоў пасля школы, мяне адшукаў былы аднакласнік Бора Пакер — яшчэ з мінулай школы, на камвольным камбінаце. Ён патэлефанаваў на «гарачую лінію», і мы сустрэліся, — узгадвае Валерый Кашчэеў. — Паспрачаліся, што я яго пазнаю — і я прайграў, бо сябар быў высокі, курчавы і худы, а стала ўсё наадварот. Цяпер мы з ім тэлефануем адзін аднаму, падтрымліваем стасункі. А вось выпускны клас у нас быў даволі рознашэрсны, асаблівай дружбы я не памятаю — і хоць праз 10 год пасля выпуску мы сустракаліся, але потым неяк не было асабліва памкнення яшчэ раз наведаць школу. Можа, неўзабаве ўсё ж збяромся — гэта ж хутка 40 год міне пасля заканчэння школы!».

Георгій КАЛДУН, спявак, тэлевядучы («Адзін супраць усіх»). Год выпуску — 1993, сш № 16 г. Мінска

Восем папярэдніх гадоў навучання Георгій правёў у іншай школе, дзе працаваў настаўнікам геаграфіі яго бацька. Перайшоў, прызнаецца, з-за праблем з дысцыплінай і сакраментальнага папярэджання дырэктаркі — маўляў, нармальна ты тут не давучышся. Тым не менш, у новай школе — з фізіка-матэматычным ухілам — быў цвёрдым чацвёрачнікам і абзавёўся сябрамі.

Як гэта было. «Памятаю, што была нейкая сталоўка — але не школьная. Мы сядзелі асобна, бацькі і настаўнікі — асобна. Праўда, маіх нікога не было, бо бацькі-настаўнікі прысутнічалі на «сваіх» выпускных — у класах, якія вялі».

На выпускны тата даў Георгію свой белы шаўковы гальштук. «Аднак пасля гэтага рэч была ўжо непрыдатнай для карыстання, за што мне было вельмі соромна, — узгадвае цяпер спявак. — Касцюм, па-мойму, мы адмыслова шылі — заказвалі ў атэлье. Ці было гэта прыгожа? Па шчырасці, не думаю».

Алкаголь для 11-класнікаў быў пад забаронай, таму на сталах прысутнічала толькі сімвалічнае шампанскае. Але ж тое-сёе налівалі з-пад стала... «І вось з таго вечара я на ўсё жыццё запомніў: брэндзі з шампанскім змешваць нельга, будзе спачатку мо і добра, а потым ну вельмі дрэнна; а асаблівае глупства — пасля ўжывання алкаголю курыць. Я неўзабаве пасля выпускнога курыць і кінуў, а алкаголь і дагэтуль ужываю ў мінімальных дозах. Але дадому, заўважу, я дабраўся нармальна, у адрозненне ад некалькіх нашых хлопцаў, каго давялося суправаджаць да кватэры. Разышліся мы, пасля ўсёй праграмы і дыскатэкі, прыкладна а чацвёртай раніцы. Світанак сустракаць не пайшлі — вырашылі чамусьці, што гэта нерамантычна... Словам, мне здаецца, вечар прайшоў па ўсярэдненай праграме — як ва ўсіх».

Што потым. Скончыўшы, як і бацькі, геафак БДУ, Георгій Калдун таксама некаторы час працаваў настаўнікам, потым пераспрабаваў шэраг іншых прафесій. Але творчая натура ўзяла сваё: канцэрты, запіс новых песень, удзел у адборы на «Еўрабачанне», 1-я прэмія конкурсу маладых выканаўцаў на «Славянскім базары-2007», дэбютны альбом, праца на радыё і тэлебачанні... Пры шчыльным працоўным графіку ўсё ж знаходзіцца час і на стасункі з былымі аднакласнікамі. «Мы сустракаліся праз 15 год пасля выпуску, і я ў каторы раз узгадаў Вішнеўскага: «Не зря боюсь я встреч выпускников», — смяецца Георгій. — Зрэшты, мой лепшы сябар Дзіма — якраз з гэтай школы, мы сядзелі з ім за адной партай».

Вячаслаў БАНДАРЭНКА, пісьменнік, кінасцэнарыст, радыёвядучы. Год выпуску — 1991, Польшча, г. Легніца, сярэдняя школа № 30 Паўночнай групы войскаў

— Наш выпускны быў самым апошнім, які адбываўся пад пад'ём сцяга СССР і гімн Савецкага Саюза. Плюс да ўсяго ён быў яшчэ і самым раннім з усіх выпускных у Савецкім Саюзе — нас «выпусцілі» ў сярэдзіне мая, — узгадвае Вячаслаў. — Прычына зразумелая: школа знаходзілася па-за межамі краіны, а абстаноўка тады ў Польшчы была даволі напружаная. Так што ўсё было сціпла: урачыстая лінейка на школьным двары, апошні вальс, пасяджэнне ў Доме афіцэраў...

Як гэта было. «Напэўна, самым запамінальным момантам была ўдалая прыдумка нашай класнай кіраўніцы: бацькоў завялі ў клас і рассадзілі адзін з адным за партамі гэтак жа, як сядзелі мы, іх дзеці. А мы таўкліся ў дзвярах і глядзелі. Атрымалася вельмі кранальна, ва ўсіх вочы былі на мокрым месцы — і ў нас, і ў бацькоў, і ў настаўнікаў. Бадай, менавіта ў той момант я і адчуў, што школа засталася ў мінулым.

Паколькі справа адбывалася за мяжой, натуральна, ні пра якія рэстараны гаворка нават не ішла — проста бяседа ў школьнай сталоўцы. Алкаголь быў, але наш клас, 11 «А», у адрозненне ад іншых, ім не захапляўся».

— Няўжо хоць нейкага «подыху імперыялізму» не адчулі — заходняя музыка, імпартныя касцюмчыкі на заказ?

— Як на маю памяць, неяк не было прынята тады ў хлопцаў хвалявацца наконт убораў, усе былі ў звычайных купленых касцюмчыках мясцовай, у сэнсе польскай, вытворчасці. А музыка ў нас сапраўды гучала заходняя, еўрадыска ўсякае: Bad Boys Blue, Сандра, з «маруднякоў» круцілі балады Scorpions, Kiss, Cinderella, Motley Crue.

Што потым. Летам 1991 года Вячаслаў паступіў на філфак Белдзяржуніверсітэта. Пазней стаў адным з галасоў першага беларускага FM-радыё — радыё «Бі-Эй», потым працаваў на «Альфа Радыё», цяпер на «Радыё АНТ». Аўтар многіх песень «J:Морс», біяграфіі Вяземскага, музычных энцыклапедый, раманаў «Ліквідацыя» і «Кадэцтва».

«Са сваймі аднакласнікамі я амаль не бачуся — дзяцей вайскоўцаў жыццё раскідала каго куды, так што цяпер яны жывуць па ўсім свеце, ад Уладзівастока да Барселоны. Напрыклад, дзяўчына, у якую я быў некалі закаханы, жыве ў Турыне, — з усмешкай распавядае Вячаслаў. — А вось з масквічамі кантакт падтрымліваю рэгулярна: кожны раз, калі бываю ў Маскве, з задавальненнем сустракаюся са сваім школьным сябрам, з якім мы сядзелі за адной партай».

Марыя ЕСЬМАН, першая Віцэ-міс Інтэркантыненталь-2009, год выпуску 2007:

Як гэта было. «У нашым класе вучылася чалавек трыццаць. Да выпускнога, як сёння памятаю, мы пачалі рыхтавацца дастаткова позна, дзесьці за месяц. На апошні званок прыйшлі традыцыйна: спаднічкі, сарочкі, туфлікі. А ўжо на выпускны — у сукенках. У мяне сукенка была белая (вельмі люблю гэты колер), прычым выбірала яе таксама дзесьці за месяц. Як і большасць выпускніцаў, пад раніцу пайшлі сустракаць світанне. Пайшлі на раку — пакрычалі *(смяецца)*, павіншавалі адзін аднаго з выпускам. Стомленыя былі, але шчаслівыя. Самае смешнае было пасля, калі мы ішлі ў цэнтр горада фатаграфавацца. Па горадзе ішлі ў туфлях — усё як трэба. Але пакуль прыйшлі да патрэбнага месца, большасць дзяўчат паспела пераабуцца ў тапачкі, шлёпкі і сланцы. Фатограф, калі ўбачыў дзяўчат у вячэрніх сукенках і ў шлёпках, вельмі здзівіўся...»

Што потым. Паступаючы на юрфак БДУ, дзяўчына разлічвала найперш на тое, што стане дыпламаваным правазнаўцам, а заняткі ў мадэльным агенцтве разглядала хутчэй як хобі. І тым не менш менавіта яна здолела прайсці жорсткі кастынг і на конкурсе «Міс Інтэркантыненталь-2009», дзе прадстаўляла Беларусь, заваяваць адразу тры тытулы — першай Віцэ-міс і «Міс Еўропа», а таксама «Міс Кангеніяльнасць» як самая дружалюбная ўдзельніца.

Распытвалі Вікторыя ЦЕЛЯШУК і Ілья ЛАПАТО. Фота з асабістых архіваў і адкрытых крыніц.

Вікторыя АЛЕШКА, спявачка. Год выпуску — 1998, сш № 41 г. Мінска.

У інтэрв'ю спявачка часта ўзгадвала: маўляў, школу за мяне скончыў Раінчык... «Гэта сапраўды часткова так, бо да Васіля Пятровіча я трапіла ў дзявятым класе. І ў нас так актыўна закруцілася работа, што ў школе я з'яўлялася вельмі рэдка. Таму давялося выкарыстаць знакамітае імя, каб урэгуляваць гэтае пытанне, — з усмешкай узгадвае Вікторыя. — Цудоўны Уладзімір Канстанцінавіч Шчэрба, які быў у маёй школе дырэктарам, а цяпер вялікі кіраўнік у галіне адукацыі краіны, пайшоў нам насустрач. Мне пашанцавала, лічу, што мяне падтрымлівалі — не ставілі бязбожна нізкіх ацэнак, увогуле не адлічылі...».

Як гэта было. На ўласным выпускным вечары спявачка... не пабывала:

— З-за таго, што я рэдка наведвала школу, аднакласнікі ставіліся даволі прадузята: ну, зразумела, гэта ж у нас «зорка»! Тое, што я пры гэтым безадмоўна спявала на ўсіх школьных святах, мала каго хвалявала. У выніку я падумала: калі не сябрую з класам, навошта ўвогуле ісці на гэты выпускны? І з адзінай сяброўкай, таксама Вікай, мы роўненька атрымалі атэстаты і пайшлі адзначаць удзвюх. Таму, што адбывалася ў школе пасля ўрачыстай часткі, як мае аднакласнікі гулялі, я нават не ўяўляю сабе. Хутчэй за ўсё, у афіцыйнай праграме я таксама выступала, але дакладна не памятаю, не засталося яркіх уражанняў.

— Але на прыгожы ўбор, хоць і толькі на афіцыйнай частцы, вы не забыліся?

— З касцюмам не было праблем увогуле — я не «замарочвалася» на гэтую тэму, надзела адзін з канцэртных убораў, балазе выбіраць было з чаго. Натуральна, выглядала ярчэй за ўсіх, бо касцюм быў ярка-рыжы, таму мой убор засланіў усе гэтыя сукенкі, якія абралі іншыя дзяўчаты. Тым больш што літаральна напярэдадні я ўзяла Гран-пры фестывалю ў Маладзечне, пра мяне пісалі многія газеты, так што можна ўявіць, якая аскома ад майго імя была на зубах у аднакласнікаў, а хутчэй, аднакласніц. (Смяецца).

Што потым. У ВНУ пасля школы спявачка пайшла далёка не адразу — яшчэ чатыры гады аддавала перавагу канцэртам і «станаўленню сябе на сцэне», перш чым даспела да вышэйшай адукацыі, і мастацкі кіраўнік падштурхнуў — што ж ты, ідзі вучыся. Вікторыя Алешка скончыла Інстытут культуры. З былымі аднакласнікамі пасля школы артыстка ніводнага разу не бачылася, акрамя той самай адзінай сяброўкі, — і не шкадуе. Затое штогод бярэ ўдзел у зборным канцэрце для выпускнікоў, які ладзіцца для найлепшых вучняў на Магілёўшчыне.

Сёння

Месяц
Маладзік 12 чэрвеня.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.39	21.39	17.00
Віцебск —	4.20	21.37	17.17
Магілёў —	4.29	21.30	17.01
Гомель —	4.35	21.17	16.42
Гродна —	4.55	21.53	16.58
Брэст —	5.05	21.44	16.39

Імяніны
Пр. *Васіля, Ігната, Іраклія, Мікіты.*
К. *Дзіяны, Малгажаты, Маргарыты, Ануфрыя, Багуміла, Генрыха, Эдгара.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзве даты

10 чэрвеня

1850 год — 160 гадоў ананімнай сатырыка-гумарыстычнай паэмы «Тарас на Парнасе», помніка беларускай літаратуры XIX ст. Напісана, верагодна, К. Вераніцыным, упершыню апублікавана ў 1889 годзе ў газеце «Мінскі лісток». У цэнтры твора — прыгоды лесніка Тараса, які выпадкова трапіў на Парнас (месца знаходжання антычных багоў і паэтаў). Аўтар яскрава апісвае побыт беларускіх сялян, з вялікай сімпатыяй паказвае адзін з першых рэалістычных вобразаў чалавека з народа ў беларускай літаратуры — вобраз Тараса. У паэме адлюстравана тэма барацьбы ідэйных напрамкаў у рускай літаратуры сярэдзіны XIX ст., сатырычныя выпады супраць славянафільскай ідэалізацыі патрыярхальнага побыту. Па сваёй дэмакратычнай сутнасці твор накіраваны супраць эстэтыкі афіцыйнай народнасці і псеўданароднасці. «Тарас на Парнасе» — якасна новая з'ява ў беларускай літаратуры, якая згуляла вядучую ролю ў станаўленні беларускай літаратурнай мовы і развіцці беларускай літаратуры.

1943 год — венгр Л. Біро, працуючы на англійскія ваенна-паветраныя сілы, вынайшаў шарыкавую ручку — гэта быў вельмі каштоўны прадмет для лётчыкаў і штурманаў, бо на вышыні звычайнае чарніла замярзала, не даючы магчымасці рабіць запісы.



Цытата дня:

«Мы не можам вырваць з нашага жыцця ніводнай старонкі, але можам кінуць у агонь усю кнігу».

Жорж Санд (1804—1876), французская пісьменніца.

СІМВОЛІКА ЦОТНАСЦІ Ў ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ І ПОБЫЦЕ

Познім варыянтам-адгалоскам сімволікі цотнасці на вяселлі стала ўпрыгожанне першай машыны вясельнага картэжа двума «пярсцёнкамі», якія ўтвараюць васьмёрку — знакавую выяву бясконцасці, узаемаспалучанасці, паяднання двух родаў.

● Некалі нашы бабулі варажылі пра свой лёс: быць ім замужам ці не быць. У марозную калядную ноч (гэта магло быць познім вечарам 24 снежня, 6, 13 або 19 студзеня) выбягалі яны ў двор, хапалі аберуч дровы ці, вырока раскінуўшы рукі, абхоплівалі штыкетнік і лічылі колькасць штыкецін. Парная колькасць паленцаў прадказвала хуткі шлюб, замужняе жыццё ў пары; няпарная — была знакам таго, што яшчэ год давядзецца «хадзіць у дзеўках», заставацца адной.

● Беларускія дзяўчаты карысталіся і такім простым, але даволі інфарматыўным спосабам прадказання сваёй будучыні. Яны бралі 41 (зноў-такі колькасць выбраная зусім не адвольна: 40 — вельмі вялікая мяжа ў жыцці чалавека, а выхад за яе поле і складаў патрэбны лік) зерне бобу і адвольна раскладвалі на тры кучкі. Затым падлічвалі колькасць зярнят у кожнай кучцы паасобку. Цотная колькасць зярнят у першай з іх была знакам паляпшэння дабрабыту, няцотная — няўсцешна наракала: будзеш хварэць і цярпець шматлікія непрыемнасці ад сваіх родных. Далей падлічвалі колькасць зярнят у другой горцы. Цотная колькасць бабін усцешвала душу прадказаннем, што ў рабоце чакае поспех, няцотная была сведчаннем няўдачы, магчымай змены месца працы. Нарэшце, трэцяя сімвалізавала паспадаранне і сямейны стан. **Цот — прадвесце спакою і добрага здароўя, няцот — знак магчымых сямейных спрэчак, лаянак і скасавання шлюбу.**

● У вашай сям'і святочная падзея, вы сервіруеце стол. Дзеля таго, каб у сям'і заўсёды былі згода, пашана, лад, каб у вашай хаце заўжды радаваліся гасцям і вы маглі спадзявацца на дапамогу суседзяў, каб бяседа ніколі не закончылася сваркай або бойкай, першым на сярэдзіну стала клалі бохан хлеба. Уважліва прасачыце за сваімі паводзінамі, калі вы пачынаеце сервіраваць святочны стол. На ўзроўні падсвядомасці, не задумваючыся, мы адразу ж разразаем бохан хлеба напалам (што можа сімвалізаваць два бакі ўдзельнікаў застолля: гаспадароў і гасцей); на кожны сподачак кладзём па два кавалачкі хлеба (што, у сваю чаргу, з'яўляецца сімвалам сямейных пар, якія збяруцца за сталом). Напрыканцы святочнай дзеі гаспадыня частуе гасцей салодкімі прысмакамі і абавязкова падкрэслівае: «Цукеркі бярыце да пары».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА ЧЭРВЕНЬ

10 чэрвеня. Добры дзень для лячэбных працэдур для валасоў, асабліва аслабленых рэгулярным хімічным уздзеяннем.

11 чэрвеня. Нейтральны дзень для стрыжкі і крайне няўдалы для фарбавання.

12 чэрвеня. Стрыгчы валасы ў гэты дзень не рэкамендуецца: яны могуць стаць ломкімі і непаслухмянымі.

13 чэрвеня. У гэты дзень цырульні лепш абыходзіць. Стрыжка можа значна пагоршыць стан здароўя і надоўга сапсаваць настрой.

14 чэрвеня. Спрыяльны дзень для ўмацавання каранёў валасоў і масажу скуры галавы.

15 чэрвеня. У гэты дзень не трэба радыкальна мяняць прычоску ці колер валасоў.

16 чэрвеня. Валасы, пастрыжаныя ў гэты дзень, стануць моцнымі і паслухмянымі. Укладка будзе займаць мінімум часу на працягу некалькіх тыдняў.

17 чэрвеня. Добры дзень для змены прычоскі і іншых дэталяў іміджу.

18 чэрвеня. У гэты дзень будуць карысныя працэдуры, накіраваныя на ўмацаванне каранёў і стымуляванне росту валасоў.

19 чэрвеня. Стрыжка ў гэты дзень дапаможа вам папоўніць духоўныя і фізічныя сілы.

20 чэрвеня. У гэты дзень можна і трэба стрыгчы і фарбаваць валасы. Новы вобраз прынясе вам удачу і дабрабыт.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

21 чэрвеня. Эфектыўнымі будуць працэдуры, накіраваныя на паляпшэнне структуры валасоў.

22 чэрвеня. Добры дзень для завіўкі ці выпрастання валасоў з выкарыстаннем хімічных прэпаратаў.

23 чэрвеня. У гэты дзень не трэба радыкальна мяняць прычоску ці колер валасоў.

24 чэрвеня. Стрыжка, зробленая ў гэты дзень, будзе спрыяць вашаму кар'ернаму росту.

25 чэрвеня. Стрыжка і фарбаванне валасоў у гэты дзень гарантуе вам выдатны вынік.

26 чэрвеня. Нейтральны дзень для стрыжкі. Для фарбавання рэкамендуецца выкарыстоўваць натуральныя фарбавальнікі.

27 чэрвеня. Спрыяльны дзень для складанай шматколернай афарбоўкі, асабліва ў медныя тоны. Яркасць колеру захаваецца надоўга.

28 чэрвеня. Пастрыжаныя ў гэты дзень валасы хутка страцяць форму.

29 чэрвеня. Добры дзень для асвятлення валасоў на некалькі тонаў.

30 чэрвеня. Любое хімічнае ўздзеянне на валасы супрацьпаказана.

Падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.

Віншуем **Зою Іванаўну ВЯРЦІНСКУЮ** з **днём нараджэння**. Жадаем не бачыць бед, не ведаць гора і няшчасця, каб хапіла на 100 год здароўя, радасці і шчасця. Удачы ў будні, удачы ў святы, хай добрыя весткі прыходзяць у тваю хату!

КУПРЭВІЧЫ.

Навучэнца чыгуначнага каледжа **ПУЦІЦКАГА Дзяніса** з **18-годдзем** віншуюць **дзядуля з бабуляй**. Няхай здзяйсняюцца ўсе твае мары.

Усміхнемся!

Зборная Ліхтэнштэйна па футболе разам са сваімі балельшчыкамі на 2-х аўтобусах з'ехала на чэмпіянат свету. У краіне застаўся вартаўнік...

☺

— Сёма, дзе лепш глядзець кіно — дома ці ў кінатэатры?

— Вядома, у кінатэатры! Там і цалавацца можна!

— Дык і дома можна цалавацца.

— Не, дома нельга, дома жонка!..

☺

Калгасныя коні зусім ад рук адбіліся. Уяўляеце, у начное не ходзяць, у плуг запрэгчы немагчыма, ваду вазіць адмаўляюцца. Цыгане з табара знікаць сталі...

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 2790. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12